КУЛЬТУРА

WWW.KIMPRESS.BY

ВЫДАЕЦЦА З КАСТРЫЧНІКА 1991 г. / № 33 (1211) 15 жніўня 2015 г.

Год моладзі: плён ініцыятыў рэгіёнаў С. 2 — 3

Як Шчучын рыхтуецца да Дня пісьменства? С. 6

На маю думку: меркаванні экспертаў С. 5

Як пакаштаваць снэкі "бітлоў" падчас... заняткаў? С. 13

"Дыярыушы": пра першы выпуск Акадэміі С. 15

ЛЕПШАЕ З БЕЛАРУСКАГА МАСТАЦТВА ЗА ГАДЫ НЕЗАЛЕЖНАСЦІ

ЧАС СВЕЖАГА ПАВЕТРА

На гэтым кадры ў інтэр'еры выставачнага памяшкання Цэнтра сучасных мастацтваў — карціна народнага мастака СССР, народнага мастака Беларусі Міхаіла Савіцкага "Без вестак зніклыя". Напісаная ў 1990-м, яна як сімвал змены часоў нібы папярэднічае, адкрывае шлях для мастацтва найноўшай эпохі — часу свежага паветра, часу Незалежнасці Беларусі. На гэты тэзіс спрацоўваюць паасобку і агулам работы выстаўкі "Беларусь за гады Незалежнасці. Лепшае", якая, перад экспанаваннем у ЦСМ, дэманстравалася з нагоды Дня Незалежнасці нашай краіны ў Палацы Рэспублікі. У гэтым нумары прапануем пазнаёміцца з экспазіцыяй у рубрыцы "Фотасюжэт нумара", а таксама даведацца пра тое, калі ў Беларусі з'явіцца Нацыянальны цэнтр сучасных мастацтваў.

Фота Таццяны МАТУСЕВІЧ

С. 2 — 3

УВАГА! / ПРАЦЯГВАЕЦЦА ПАДПІСКА НА ГАЗЕТУ "КУЛЬТУРА" ПРАЗ ІНДЫВІДУАЛЬНЫ (63875) І ВЕДАМАСНЫ (638752) ІНДЭКСЫ. / З дапамогай банкаўскай карткі газету можна выпісаць праз інтэрнэт-сэрвіс на сайце "Белпошты" (пункт "Афармленне падпіскі на друкаваныя сродкі масавай інфармацыі").

Онлайн канферэнцыя "К": замацаванне кадраў

"Кроў" кепска прыжываецца. Справа ў кватэры?

Культура, асабліва сельская, няўхільна старэе. Перадпенсійны век — ці не норма для вясковых кадраў. Знясілены "культурны" арганізм патрабуе неадкладнага ўлівання свежай крыві. "Донараў" (ССНУ і ВНУ) хапае, а вось "кроў" прыжываецца кепска. Ва ўстановах культуры райцэнтраў кадравая сітуацыя большменш стабільная, а вось на вёсцы — вакансіі, вакансіі, вакансіі…

Дык што рабіць? Як паказвае журналісцкая практыка, маладыя спецыялісты ад культуры, якія не вытрымалі выпрабавання сялом, наракаюць збольшага на мізэрныя заробкі. Спецыялісты з пэўным стажам хочуць працаваць, але ім для самапавагі не стае сталага жытла: не ў інтэрнаце, а ў райцэнтраўскім шматпавярховіку ці ў аграгарадоцкім катэджы. Ні першыя, ні другія патрэбы свае задаволіць не могуць.

Матэрыялы онлайн-канферэнцыі падрыхтаваў Яўген РАГІН

Вакансіі, вакансіі, вакансіі: прынада для спецыялістаў

Таму асвойваюць, так бы мовіць, сумежныя спецыяльнасці. Прычыны кадравага калапсу вядомыя кожнаму: астаткавы прынцып фінансавання галіны. Але патрабаванні да яе эфектыўнасці ніхто не адмяняў. Словам, пытанне "Што рабіць?" па-ранейшаму актуальнае.

Для таго, каб прасачыць, як яно вырашаецца на месцах, да удзелу ў онлайн-канферэнцыі былі запрошаны намеснік старшыні Веткаўскага райвыканкама Сяргей КОНЧЫЦ, начальнікі аддзелаў ідэалагічнай работы, культуры і па справах моладзі: Ашмянскага раёна — Галіна БАЛІНСКАЯ, Навагрудскага — Марына ШАБАНОВІЧ, Дзяржынскага — Наталля СІНЮКОВІЧ, Бярозаўскага — Таццяна КАВАЛЁК, Дубровенскага — Людміла ДУДАРАВА, намеснік начальніка аддзела ідэалагічнай работы, культуры і па справах моладзі Шклоўскага райвыканкама Галіна ВАЛОЗІНА, вядучы метадыст аддзела методыкі Дзяржынскага раённага цэнтра культуры і народнай творчасці Кацярына ГРАНІК.

Яўген Рагін:

— Пачынаем з Ашмянскага раёна. Галіна Іванаўна, што б вы адказалі, каб да вас звярнуліся прыкладна такім чынам: "Я акампаніятар. Адукацыя — сярэднеспецыяльная. Ёсць стаж працы ў РДК. Сямейны. Хачу праехаць да вас на працу. Але ці магу я спадзявацца на добраўпарадкаваную дзяржаўную кватэру?"

Галіна Балінская:

— Адказ будзе адназначны: "Пры ўсім жаданні ніякага спадзеву на дзяржаўную бясплатную кватэру я даць вам, даражэнькі, не магу!"… У 1980-м я прыехала ў Ашмяны, пачала працаваць метадыстам, атрымала двухпакаёвую кватэру, у якой жыву і па сёння. Услед за мной на першае месца працы прыбылі яшчэ два маладыя спецыялісты, якія неўзабаве таксама сталі ўладальнікамі дзяржаўных кватэр. Гэта, бадай, апошнія выпадкі, калі хтосьці з работнікаў культуры Ашмяншчыны займеў бясплатнае дзяржаўнае жытло.

Яўген Рагін:

— У фінансавым плане бесклапотнае было жыццё!

Галіна Балінская:

— Усе мы яго з настальгіяй згадваем… Але цягам пяці апошніх гадоў нашы маладыя спецыялісты змаглі на льготных ўмовах атрымаць сабе годнае арэнднае жыллё.

Яўген Рагін:

— Ну гэта ў горадзе. А на вёсцы?

Галіна Балінская:

— Там сітуацыя больш складаная. Прыярытэт на атрыманне жылля маюць, апрача сельгасработнікаў, урачы ды настаўнікі. Але ў нас у раёне кватэрнае пытанне востра не стаіць: хто хацеў, той займеў.

Яўген Рагін:

— Але вакансіі ёсць?

Галіна Балінская:

— Ёсць.

Яўген Рагін:

— Дык мо не толькі ў кватэрах справа, але і ў недастатковай заработнай плаце?

Заканчэнне артыкула чытайце **на старонках 10 — 11.**

Дні культуры Лаоса ў Беларусі пройдуць **з 30 жніўня па 3 верасня** ў Мінску і Маладзечне.

Інфаграфіка. Выбары-2015



Акцэнт тыдня

Прыйсці да беларускага

Цягам чатырох субот доўжыўся цыкл канцэртаў "Класіка ля Ратушы". Праект сабраў сотню ўдзельнікаў-музыкантаў і 40 тысяч прысутных. Канцэрты ішлі ўсяго па дзве гадзіны, але плошча пачынала віраваць задоўга да іх пачатку. А галоўнае, ярка заявіла пра сябе нацыянальная тэма. Толькі што далей (пасля жніўеньскага цыклу канцэртаў "на біс") — чакаць наступных вулічных праектаў?

Надзея БУНЦЭВІЧ

Музыка ля сталічнай Ратушы гучала не ўпершыню. Тры гады запар тут праходзілі бясплатныя джазавыя вечары (па тры на ўсё лета). Мінулы філарманічны сезон адкрываўся онлайн-трансляцыяй на відэаэкран. Не абыходзіліся без музыкантаў і штогадовыя вясновыя фестывалі вулічных тэатраў. Адным словам, зрухі ёсць — у развіцці вулічных мастацтваў, дэмакратызацыі акадэмічнай музыкі, "абжыванні" плошчы гандлярамі сувеніраў. Нарэшце, у вулічных прэзентацыях менавіта нацыянальнага мастацтва.

Тая ж "Класіка ля Ратушы" была пабудавана на паступовым падыходзе да "свайго, беларускага" — праз еўрапейскае і сусветнае. У першую суботу гучала музыка Моцартаў, Штраусаў (у абодвух выпадках, бацькі і сына) і іншых венскіх класікаў (зварот да Вены сыходзіў ад кампаніі-партнёра, асноўныя акцыянеры якой маюць аўстрыйскую "прапіску"). У другую суботу ўсе слухалі і, пры жаданні, танчылі аргенцінскае танга. У трэцюю — станавіліся сведкамі спалучэння барока з… саксафонамі. Нарэшце, у чацвёртую — спрычыньваліся да 250-годдзя з дня нараджэння Міхала Клеафаса Агінскага.

Тое, што беларускі вечар стаў фінальным, ды яшчэ абяцаў (і спраўдзіў чаканні) тэатралізавана-касцюміраваную танцавальную праграму, прыцягнула да яго большую, чым калі, колькасць наведвальнікаў, якія прагнулі "культурнай забаўляльнасці". Людзі ж прыходзілі не ў філарманічную залу, якая патрабуе строгай цішыні, а на плошчу, дзе можна стаяць, хадзіць, сядзець на траўцы, размаўляць, фатаграфавацца. Разам з тым, прысутнічала і асветніцкая лінія. Вядучым усіх вечароў выступіў кіраўнік Музычнага Дома "Класіка" Аляксандр Чахоўскі. Ён не проста аб'яўляў нумары ці весяліў публіку, падобнага колішнім канферансье на паркавых пляцоўках, а вёў нязмушаны аповед пра самае цікавае. Без гламуру, таннага заігрывання з публікай, без залішніх захапленняў і ўзнёсласці, што вылучаюць лектараў мінулых дзесяцігоддзяў. А галоўнае, з добрым веданнем беларускай мовы, папросту неабходнай у апошні вечар.

Праект прыцягнуў і вольных музыкантаў. Адрэагавалі і мастакі. Як заўжды, працавалі не ўсе змешчаныя на плошчы сувенірныя кіёскі, але далучылася "выязная крама" ГУМа, багата было індывідуальных гандляроў. На прэс-канферэнцыі, што папярэднічала праекту, выказвалася прапанова распрацоўваць адпаведныя сувеніры. Але і без таго на плошчы можна было знайсці не толькі магніты на бяросце, няроўнасці якой ператвараліся ў беларускія краявіды, але і, да прыкладу, адметныя "музычныя" кубкі — з размешчаным на іх нотным запісам "Развітання з Радзімай".

І ўсё б добра, ды толькі… У фінальны вечар было вельмі халодна. Па каву, зусім не танную, стаяла чарга больш як на 20 чалавек. З іншага "пажывіцца" не было чым. Бо рэстаранныя кошты на пару кубкаў кавы складалі без малога пад паўтары сотні рублёў. А між тым, "на ўра!" пайшлі б нават чыпсы з сухарыкамі ды арэшкамі.

Надта малой уяўляецца і цяперашняя "дазіроўка" — па дзве гадзіны далёка не на кожны летні тыдзень. Для больш шырокага прыцягнення турыстаў на гэтай пляцоўцы ў летні сезон штосьці павінна адбывацца ў рэжыме нон-стоп. Ці хаця б — штовыхадныя ў пэўны час. Пажадана — з нацыянальнай тэматыкай (памятаеце, спрабавалі рабіць такую тэатралізацыю?). І з прыцягненнем беларускай кулінарыі. К

Газета КУЛЬТУРА
ШТОТЫДНЁВАЯ ГРАМАДСКА-ПАЛІТЫЧНАЯ, ДЛЯ ДАСУГУ (КУЛЬТУРА, МАСТАЦТВА)
Выдаецца з кастрычніка 1991 года.
Заснавальнік — Міністэрства культуры Рэспублікі Беларусь.
Рэгістрацыйнае пасведчанне № 637, выдадзена Міністэрствам інфармацыі Рэспублікі Беларусь.

Галоўны рэдактар — Сяргей Сяргеевіч ТРАФІЛАЎ. **Адказны сакратар:** Вольга НАВІЦКАЯ; **рэдактары аддзелаў:** Канстанцін АНТАНОВІЧ, Надзея БУНЦЭВІЧ, Барыс КРЭПАК, Настасся ПАНКРАТАВА, Яўген РАГІН, Ілья СВІРЫН; **аглядальнікі рэдакцыі:** Дар'я АМЯЛЬКОВІЧ, Аліна САЎЧАНКА, Юрый ЧАРНЯКЕВІЧ; **спецыяльныя карэспандэнты:** Пётр ВАСІЛЕЎСКІ, Алег КЛІМАЎ, Алена ЛЯШКЕВІЧ; **мастацкі рэдактар** — Наталля ОВАД.

Сайт: **www.kimpress.by.** E-mail: **kultura@tut.by.** Адрас рэдакцыі: 220013, Мінск, пр. Незалежнасці, 77. Пакоі 16-28, 94-98, чацвёрты паверх. Тэлефоны: (017) 286 07 97, (017) 334 57 23. Тэлефон-факс: (017) 334 57 41. Рэкламны аддзел: тэл. (017) 286 07 97, 334 57 41. Выдавец — Рэдакцыйна-выдавецкая ўстанова "КУЛЬТУРА І МАСТАЦТВА". 220013, Мінск, пр. Незалежнасці, 77. Пакоі 16-28, 94-98, чацвёрты паверх. Бухгалтэрыя: (017) 334 57 35.
Аўтары допісаў паведамляюць прозвішча, поўнасцю імя і імя па бацьку, пашпартныя звесткі (нумар пашпарта, дату выдачы, кім і калі выдадзены пашпарт, асабісты нумар), асноўнае месца працы, зваротны адрас. Аўтарскія рукапісы не рэцэнзуюцца і не вяртаюцца. Меркаванні аўтара могуць не адпавядаць пункту гледжання рэдакцыі. Аўтары нясуць адказнасць за дакладнасць матэрыялаў. *Матэрыял на правах рэкламы.
"Культура", 2015. Наклад 5 448. Індэксы 63875, 638752. Рознічны кошт — па дамоўленасці. Падпісана ў друк 14.08.2015 у 16.30. Замова 3168. Рэспубліканскае ўнітарнае прадпрыемства "Выдавецтва "Беларускі Дом друку".
ЛП № 02330/106 ад 30.04.2004. пр. Незалежнасці, 79, 220013, Мінск.

Не на словах,

"Амаль усё вялікае створана маладымі". Як на мой крытычны погляд, гэта досыць спрэчнае выказванне колішняга прэм'ер-міністра Вялікабрытаніі і пісьменніка Бэнджаміна Дызраэлі. Спрэчнае тым больш, калі ўлічыць, што, прыкладам, Гётэ дапісаў свайго "Фаўста" тады, калі яму было каля 80 гадоў, а Талстой тварыў увогуле да смерці. Але ж ніхто, у тым ліку і я, не будзе адмаўляць, што менавіта ў маладым узросце кожнаму хочацца шмат ведаць, шмат чытаць, тварыць, шукаць, памыляцца, блукаць па новых дарогах ды краінах і, канечне, кахаць…

Юрый ЧАРНЯКЕВІЧ

Нядаўняя камандзіроўка ў Браслаў яшчэ раз пераканала мяне ў тым, што самыя разнастайныя мерапрыемствы і праекты, што ладзяцца сёлета ў Год моладзі, не на словах, а на справах спрыяюць і заахвочваюць да развіцця ды самаўдасканалення маладых людзей, а таксама павялічваюць увагу да іхніх крэатыўных пошукаў і ідэй. Напрыклад, у многіх рэгіёнах краіны пачалі ладзіць ці аднаўляць правядзенне разнастайных маладзёжных фестываляў, маладыя спецыялісты ці нават дырэктары ў сваіх музеях, бібліятэках, Дамах культуры прапануюць да рэалізацыі арыгінальныя праекты, а многія прадпрымальнікі, якія раней лічылі за галоўнае, бадай што, адно толькі заробак грошай, сёння ўкладаюць фінансавыя сродкі ў цікавыя маладзёжныя праекты… Але ж ці хапае ўсяго гэтага для таго, каб тыя ж выпускнікі каледжаў ці ўніверсітэтаў сферы культуры з ахвотай прыязджалі на працу ў самыя розныя куткі краіны?

Фэст за фэстам

Спачатку пра фестывалі. Спашлюся на ўсё той жа крэатыўны досвед супрацоўнікаў сферы культуры Браслаўскага раёна Віцебскай вобласці. Сёлета ў якасці арганізатараў, гасцей ці выканаўцаў яны зладзілі ды паўдзельнічалі ў фальклорным фестывалі "Браслаўскія зарніцы" — на якім, побач з бабулямі і дзядулямі, танцавалі і спявалі хлопцы і дзяўчаты, — у рок-фестывалях "Жывое неба Браслава" і "Viva Браслаў!", а таксама рыцарскім фэсце "Меч Брачыслава". А нядаўна, 9 жніўня, супрацоўнікі мясцовага музея традыцыйнай культуры "раскручвалі" ў сваім музейным дворыку яшчэ адзін, знаёмы мінчанам ужо не першы год, праект "Фотасушка-2015", на які завітала багата цікаўнай моладзі…

Па словах начальніка аддзела ідэалагічнай работы, культуры і па справах моладзі Браслаўскага райвыканкама Антаніны Абалевіч, правядзенне самых разнастайных маладзёжных мерапрыемстваў у Браславе — мэтанакіраваная палітыка. І, па яе словах, сёння можна з вялікай доляй упэўненасці сказаць, што падобны кірунак цалкам сябе апраўдвае. У якасці доказу суразмоўца прывяла досыць красамоўны факт: працэнт замацавання маладых спецыялістаў у раёне па некаторых відах дзейнасці даходзіць да 80: гэта адукацыя, гандаль, ахова здароўя, і, крыху меней, культура. Таксама паўсядзённай практыкай сталася выдаткоўванне жылля некаторым сем'ям, якія прыязджаюць на працу ў раён. Да таго ж, сёння важкі "сацыяльны" пакет для маладых спецыялістаў прадугледжаны ў многіх установах і арганізацыях Браслаўшчыны як дзяржаўнай, так і прыватнай формы ўласнасці — гэта і "пад'ёмныя", і прэміі, і надбаўкі, прадугледжаныя згодна з айчынным працоўным заканадаўствам…

Пералічанае вышэй спрыяе таму, каб моладзь пачувала сябе ў Браславе досыць вольна і камфортна. Праўда, не трэба забываць і пра ўнікальную мясцовую прыроду, да якой цягне не толькі многіх мясцовых жыхароў, а і спешчанага гарадскімі выгодамі мінскага, маскоўскага ці варшаўскага госця. Але справа, натуральна, не толькі ў ёй…

Маладзёжны марафон

Але наколькі фестывальны складнік прываблівае да сябе маладых людзей? Бо, не сакрэт, самымі разнастайнымі маладзёжнымі праектамі могуць пахваліцца і іншыя раёны Беларусі. Да слова, 25 ліпеня ў Буда-Кашалёве, што ў Гомельскай вобласці, прайшоў XIII Абласны фестываль творчай моладзі "Пад белымі крыламі", які сабраў больш за 200 удзельнікаў з 14 раёнаў рэгіёна і з Асіповіцкага раёна Магілёўшчыны. А, напрыклад, калі я тэлефанаваў

За два месяцы да новага ЦСМ

Хутка Музей сучаснага выяўленчага мастацтва і Цэнтр сучасных мастацтваў увойдуць у склад Нацыянальнага цэнтра сучасных мастацтваў. / Фота Таццяны МАТУСЕВІЧ

Праз два месяцы ў нашай краіне мусіць запрацаваць Нацыянальны цэнтр сучасных мастацтваў Рэспублікі Беларусь. Адпаведную пастанову аб стварэнні дзяржаўнай установы змяшанага тыпу 10 жніўня прыняў Савет Міністраў Рэспублікі Беларусь.

Настасся ПАНКРАТАВА

Новая ўстанова, якая возьме на сябе функцыі папулярызацыі і падтрымкі айчыннага contemporary art, узнікне дзякуючы зліццю Творчых майстэрань "Цэнтр сучасных мастацтваў" і Музея сучаснага выяўленчага мастацтва. Яна будзе падпарадкоўвацца Міністэрству культуры краіны. Праца па падрыхтоўцы да стварэння новай культурнай адзінкі вялася загадзя. А яе заснаванне было анансавана яшчэ на пачатку 2015-га, як нагадала першы намеснік начальніка галоўнага ўпраўлення ідэалагічнай работы, культуры і па справах моладзі Мінгарвыканкама Віталіна Рудзікава. З гэтай мэтай Музей сучаснага выяўленчага мастацтва на пачатку бягучага года перавялі ў рэспубліканскае падпарадкаванне.

— Мы мелі дзве структуры, якія займаліся вельмі актыўнай дзейнасцю, але часта паралельна распрацоўвалі адны і тыя ж пытанні. Было вельмі лагічна аб'яднаць іх і зрабіць адну вялікую "баявую" адзінку, — зазначыла карэспандэнту "К" дырэктар Музея сучаснага выяўленчага мастацтва і кіраўнік Цэнтра сучасных мастацтваў Наталля Шаранговіч. — Нацыянальны цэнтр павінен працаваць па прынцыпе маскоўскага Дзяржаўнага цэнтра сучасных мастацтваў. У ім будуць выставачныя залы, працягнецца музейная дзейнасць, будуць праводзіцца рознага кшталту мерапрыемствы. Сучаснае мастацтва шматфункцыянальнае: інсталяцыі, перформансы, эксперыментальныя тэатры, кіно, музыка. Спадзяюся, у выніку атрымаецца структура, што будзе акумуляваць вакол сябе людзей, якія займаюцца ўсімі кірункамі актуальнага мастацтва.

Нацыянальны цэнтр будзе дзейнічаць на пляцоўках тых устаноў, што ўвойдуць у яго склад. Пакуль Музей і ЦСМ працягнуць працаваць у былым фармаце, а паралельна будзе праводзіцца вялікі комплекс фінансавых, бухгалтарскіх, юрыдычных мерапрыемстваў, распрацоўвацца Статут, удакладняцца структура. Праз два месяцы Нацыянальны цэнтр павінен паўнавартасна запрацаваць.

— Вельмі важна, каб сучаснае мастацтва не толькі паказвалася, але і фіксавалася — заставалася ў музейных фондах, — дадала Наталля Васільеўна. — Статус "нацыянальны" дазволіць Цэнтру сучасных мастацтваў не толькі праводзіць буйныя міжнародныя праекты, але і папаўняць сваю калекцыю самымі цікавымі работамі. К

Гала-канцэрт рэспубліканскай грамадска-культурнай акцыі "Мы, беларусы — мірныя людзі" пройдзе **28 жніўня** ў Баранавічах.

Не на словах...

Год моладзі: ад фестываляў да нястачы спецыялістаў

Цікава, што ідэю зладзіць названы праект падала летась малады спецыяліст, выпускнік Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта культуры і мастацтваў, а цяпер мастацкі кіраўнік Залескага Дома культуры Крысціна Харошка. Справа ў тым, што аддзелам ідэалагічнай работы, культуры і па справах моладзі Кобрынскага райвыканкама ў мінулым годзе праводзіўся вучэбны семінар, на які завіталі больш за трыццаць кіраўнікоў Дамоў культуры Любліншчыны. І асаблівую цікавасць у гасцей выклікаў праект Крысціны Харошка, які сёлета ўвасобіўся ў жыццё... Падрабязна пра гэты маладзёжны марафон мы распавядзем у наступных нумарах.

Невясёлая статыстыка

Між тым, у размове з Надзеяй Жук я не мог не запытацца пра кадравую сітуацыю ў раёне. Як высветлілася, у сферы культуры замацоўваюцца прыкладна 50 працэнтаў з прыезджых маладых спецыялістаў. Больш за тое, сёлета, нягледзячы на 15 заявак, у раён прыехала толькі двое выпускнікоў, гатовых працаваць у сферы культуры. Як бачна, аднымі фестывалямі моладзь на Кобрыншчыну — ды, упэўнены, не толькі сюды — не зацягнеш.

Між тым, летась у раён па размеркаванні прыязджала 6, а ў 2013 годзе — ажно 13 маладых спецыялістаў, якія сёння працуюць па спецыяльнасці… Статыстыка сёлетняя, трэба прызнаць, негатыўная… І вынікае яна з усё тых жа праблем: нястачы жылля для маладых спецыялістаў і малых заробкаў у сферы культуры.

Больш за ўсё ў раёне, як ні дзіўна, не хапае хормайстраў і акампаніятараў, а таксама — наколькі ведаю, "вечная" праблема для любога раёна — харэографаў. Між тым, да прыкладу, у Гродзенскім дзяржаўным каледжы мастацтваў, дзе нядаўна, напрыканцы ліпеня, пабываў Міністр культуры Беларусі Барыс Святлоў, на гэтыя спецыяльнасці заўсёды імкнуцца абітурыенты. Па словах дырэктара каледжа Вадзіма Буткевіча, ва ўстанове адукацыі сферы культуры найбольшай папулярнасцю карыстаюцца такія спецыяльнасці як "Дызайн" і "Мастацтва эстрады (спевы)". Таксама ў гэтым годзе шмат ахвотных паступала на спецыяльнасць "Харэаграфічнае мастацтва (народны танец)".

Так што, зважаючы толькі на прыклад гэтага каледжа, можна сцвярджаць, што неабходныя для раёнаў спецыялісты ва ўстановах адукацыі сферы культуры будуць падрыхтаваны і выпушчаны. Але ці даедуць яны да Кобрына альбо, прыкладам, да Хоцімска ці Гарадка — пытанне з досыць няпэўным адказам.

Тое, што маладзёжныя фестывалі і імпрэзы сёння ладзяцца ў многіх кутках Беларусі, можна, натуральна, толькі вітаць... Але і гэтыя шматлікія фэсты, і культурныя мерапрыемствы з удзелам моладзі, як бачна, сітуацыю з кадрамі часам да лепшага не мяняюць: "хлеб" матэрыяльны пераважае над духоўным. Таму, як вынікае, разам з фэстамі, трэба вырашаць жыллёвае пытанне, — як гэта робяць і ў Браслаўскім, і ў некаторых іншых раёнах Беларусі, — падвышаць заробкі, у тым ліку, з дапамогай пазабюджэту, ды зацікаўліваць маладых спецыялістаў крэатыўнымі праектамі, як айчыннымі, так і міжнароднымі, у якіх яны змогуць паўдзельнічаць. Вось тады маладыя спецыялісты ў Год моладзі — і не толькі сёлета, але і праз год, і два, і пяць — адчуюць сябе сапраўды запатрабаванымі не на словах, а на справах. І тады словы Бэнджаміна Дызраэлі цалкам магчыма будуць успрымацца не са скепсісам, як цяпер…

К



Фотасюжэт нумара

Час свежага паветра

Фрагменты экспазіцыі "Беларусь за гады незалежнасці. Лепшае". Пачатак на старонцы 1. / Фота Тацяны МАТУСЕВІЧ

Страты



Фота Тацяны МАТУСЕВІЧ

Раптоўна не стала мастака Георгія СКРЫПНІЧЭНКІ. Толькі ў мінулую суботу выйшла вялікае інтэрв'ю з ім на старонках "К", дзе творца, сярод іншага, сказаў наступнае: "Лічу, што кожны проста павінен рабіць уласную справу. Пішы свае карціны на выдатным узроўні — і менавіта ў гэтым праявіцца твая актыўная грамадзянская пазіцыя. Галоўнае, каб яны ішлі знутры, ад сэрца".

І гэта ў выпадку Скрыпнічэнкі — не проста словы. Бывайце, Георгій Сяргеевіч…

"Культура"ўцы

Міністэрства культуры Рэспублікі Беларусь глыбока смуткуе ў сувязі са смерцю СКРЫПНІЧЭНКІ Георгія Сяргеевіча — выдатнага мастака Беларусі, члена грамадскага аб'яднання "Беларускі саюз мастакоў".

Георгій Сяргеевіч з'яўляўся адным з выбітных мастакоў, які ўсё сваё жыццё аддана служыў беларускай нацыянальнай культуры. Сваёй шматгадовай творчай дзейнасцю ён унёс значны асабісты ўклад у развіццё беларускага выяўленчага мастацтва.

Міністэрства культуры Рэспублікі Беларусь выказвае спачуванні яго родным і блізкім у сувязі з напаткаўшым іх горам.

Добрая памяць аб яскравым таленце, шчырасці Георгія Сяргеевіча назаўсёды застанецца ў сэрцах калег і сяброў.

Беларускі саюз мастакоў смуткуе ў сувязі са смерцю СКРЫПНІЧЭНКІ Георгія Сяргеевіча, члена грамадскага аб'яднання "Беларускі саюз мастакоў", вядомага мастака, які ўнёс вялікі ўклад у развіццё і прапаганду беларускага выяўленчага мастацтва. Рада ГА "БСМ" выказвае спачуванні родным і блізкім у сувязі з напаткаўшым іх вялікім горам.

Міністэрства культуры Рэспублікі Беларусь глыбока смуткуе з прычыны смерці АЗГУР Галіны Гаўрылаўны — славутай мастачкі Беларусі і выказвае спачуванні родным і блізкім мастачкі.

Светлая памяць аб Азгур Галіне Гаўрылаўне назаўсёды застанецца ў сэрцах калег і сяброў.

Беларускі саюз мастакоў смуткуе ў сувязі са смерцю старэйшага члена грамадскага аб'яднання "Беларускі саюз мастакоў" АЗГУР Галіны Гаўрылаўны, вядомай мастачкі, якая ўнесла вялікі ўклад у развіццё і прапаганду беларускага выяўленчага мастацтва. Рада ГА "БСМ" выказвае спачуванні родным і блізкім у сувязі з напаткаўшым іх вялікім горам.

Калектыў Нацыянальнага акадэмічнага Вялікага тэатра оперы і балета Рэспублікі Беларусь смуткуе з прычыны смерці найстарэйшай артысткі сімфанічнага аркестра Галіны Аляксандраўны ПІНІГІНАЙ і выказвае шчырыя спачуванні яе родным, блізкім і сябрам.

Фота kupalauski.by

Калі нумар быў ужо амаль падпісаны да друку, стала вядома, што памёр народны артыст Беларусі, акцёр Нацыянальнага акадэмічнага тэатра імя Янкі Купалы, вядомы кінаартыст Сяргей ЖУРАВЕЛЬ. Рэдакцыя газеты "Культура" выказвае шчырыя спачуванні родным, блізкім, калегам і сябрам Сяргея Барысавіча.

Увага! Аб'ява!*

Дворец Республики

объявляет конкурс на замещение вакантных должностей

в Заслуженный коллектив Республики Беларусь Президентский оркестр Республики Беларусь

артист эстрадно-симфонического оркестра:

• саксофон — 1 чел.; • валторна — 1 чел.;

• ударные инструменты — 1 чел. (на время отпуска по уходу за ребёнком);

• контрабас — 1 чел.; • альт — 1 чел. (на время отпуска по уходу за ребёнком);

• виолончель — 1 чел. (на время отпуска по уходу за ребёнком).

Срок подачи заявок и документов до 21 сентября 2015 года, по адресу: 220030, г. Минск, Октябрьская пл., 1-1.

К заявлению прилагать документы, предусмотренные Инструкцией о порядке проведения конкурса, утверждённой Министерством культуры Республики Беларусь от 22.01.2009 № 3;

Для резюме: факс — 229-90-50, e-mail: dirork@yandex.ru.

Дополнительная информация по телефонам: 229-90-50, 229-90-08, 229-90-04, 229-90-04.

Майстар-класы "Саюзная Дзяржава — маладым талентам XXI стагоддзя" пройдуць **15 — 20 жніўня** ў Маскве.

Дзяжурны па нумары

Канцэпцыя не складаецца…

Некалі ў фае нашага Вялікага тэатра натрапіла на столік з дыскамі. Перабіраючы звыклыя кампакты з класічнай музыкай, нечакана ўбачыла дыск "Казкі і байкі ад нашых знаёмых" у выкананні дэкламатара Беларусі Валерыя Саберава. Змест аказаўся проста шыкоўным! Англійскія дзіцячыя песні ў перакладзе Самуіла Маршака, творы Доктара С'юза, Таццяны Макаравай, Яна Бжэхвы, Генрыха Сапгіра, Юльяна Тувіма, Эдуарда Успенскага і іншых. Дыск ухапіла "на выраст" і не прагадала: літарально штодзень чую з дзіцячага пакоя чароўны голас Валерыя Фёдаравіча. Засмучае толькі, што за шэсць апошніх гадоў наша хатняя аўдыябібліятэка папаўняецца, у асноўным, расійскімі выданнямі. Дзе ж арыгінальныя айчынныя аўдыяспектаклі?

Настасся ПАНКРАТАВА

Маё пакаленне расло на казках, што гучалі з вінілавых дарожак. Нас вучылі правільна браць у рукі капрызлівы ў абыходзе дыск і як зрэнку вока берагчы іголкі для прайгравальніка. Нават запалкі па хаце мы шукалі не для іх прамога выкарыстання, а каб пачкам зрабіць больш цяжкім гуказдымальнік, які пачынаў скакаць на падрапанай ад частага праслухоўвання паверхні грампласцінкі. Зрэшты, і акцёраў я найперш ведала па галасах (тады дзіцячыя фільмы ў тэлепраграме чакалі тыднямі, а хатняя фанатэка заўсёды была пад рукой), а потым, пачуўшы знаёмы голас на экране, суадносіла яго з прозвішчам на канверце вініла.

Калі з'явіліся свае дзеці, вельмі захацелася далучыць іх да таго багацця аўдыёспектакляў. Але што сёння ўключаць? У Расіі пайшлі па шляху найменшага супраціўлення: пачалі з алічбоўкі класічных пласцінак. Зараз на кніжных развалах у Маскве і Санкт-Пецярбургу можна пабачыць знаёмыя вокладкі, што перайшлі з канвертаў на кампакт-дыскі.

У Беларусі чамусьці такой моды на аўдыяказкі так і не дачакаліся... У музычных крамах трапляюцца дыскі для дзяцей, але тыя кампакты часта ідуць без суправаджальнай інфармацыі: нельга даведацца пра тых, хто агучыў ролі, рэжысёраў, нарэшце — пра змест. Сярод такіх котак у мяху раз-пораз трапляюцца класічныя аўдыяспектаклі мінулага стагоддзя. Добра, што у Сеціве з'явіўся сайт з тымі запісамі, дзе алічбаваны і надпісы з канвертаў.

Дарэчы, у суседзяў не спыніліся на штампаванні дасягненняў былых гадоў і пачалі актыўна выпускаць новае. Акрамя казак, попытам карыстаюцца тэатралізаваныя аўдыяэнцыклапедыі. З'явілася нават цэлая серыя па мастацтве: дыскі знаёмяць з тэатрам, сімфанічным аркестрам, вядомымі паэтамі. А што у нас?

Новае пакаленне патрабуе сваіх герояў: дзе ж уласна беларускія аўдыяспектаклі? Напрамак даволі перспектыўны і запатрабаваны. Адказныя дарослыя шукаюць айчынны прадукт... і сутыкаюцца з масай "але". У нашай краіне перыядычна з'яўляюцца цікавыя аўдыяпраекты, толькі яны ўсе разрозненыя, не маюць адпаведнага рэкламнага прасоўвання, а ў выніку становяцца вядомымі невялікай частцы патэнцыйнай аўдыторыі.

Напрыклад, узімку пры падтрымцы аднаго з банкаў выйшла музычная філасофская казка для дзяцей і дарослых "Дрэва жаданняў". Агучваць цудоўны тэкст Ганны Трубачовай пра падарожжа Зялёнай Казы рэжысёр-пастаноўшчык Каця Пытлева запрасіла спрэс зорак. У аўдыяспектаклі былі задзейнічаны акцёры Ганна Хітрык, Міхаіл Зуй, Настасся Шпакоўская і музыканты Алег Хаменка, Віталік Артыст, Аляксандр Куллінковіч, Светлана Залеская-Бень. Арыгінальны саундтрэк запісаў айчыны гурт "Hata". На жаль, цудоўны дыск зроблены ў якасці сувенірнай прадукцыі і не прызначаны для камерцыйнага выкарыстоўвання. Шыкоўная казка, якая магла б стаць культурным дасягненнем году, засталася даступнай толькі вузкаму колу абраных...

Цягам васьмі гадоў доўжыцца аўтарскі праект Алега Хаменкі і групы "Палац", у рамках якога на дысках выходзілі беларускія народныя казкі. Аўдыязапісы сталі часткай спецпраекта ініцыятывы UNISEF у Беларусі. І зноў жа: як можна было даведацца, дзе тыя кампакты ёсць у наяўнасці? Зараз добрая ініцыятыва атрымлівае новы подых: ствараецца дадатак, з дапамогай якога казачны фальклор можна будзе праслухоўваць на смартфонах і планшэтах. Спадзяюся, з дапамогай сучасных інструментаў атрымаецца значна павялічыць колькасць спажыўцоў айчыннага аўдыя.

А пакуль вымушана канстатаваць: нават пры наяўнасці выдатнага культурнага прадукту, зацікаўленых дадзенай тэмай творцаў і неахопленай рынкавай нішы, айчынным вытворцам не выпадае усе гэтыя складнікі спалучыць у зладжаную канцэпцыю. Вось і даводзіцца новым пакаленням расці на якаснай, але не ўласнай культурнай прадукцыі...

К

Прадпрымальнасць, матывацыя і атракцыі

У той час, як тэмпература ў Мінску ды Гродна біла рэкорды, у Міры праходзіў "Mirum Music Fest", у Лепелі рыхтаваліся да фестывалю Цмока, а ў Моталі святкавалі "Мотальскія прысмакі". Менавіта святкавалі, бо віншаванні гучалі не толькі са сцэны: у натоўпе чулася, як жыхары віталі адно аднаго: "Са святам!" А вітальныя словы для маталянаў — не проста словы. Напрыклад, калі ў мястэчку нехта памёр, не прынята казаць "Добры дэнь!", бо які ж ён добры?

Алена ЛЯШКЕВІЧ,
Мінск — Моталь — Мінск

"Мотальскія прысмакі": праз год перапынку і амаль без прысмакаў

■ Адразу ўзнікла жаданне гэтак жа "пастроіць" усе астатнія харчовыя шэрагі, а яшчэ атрымаць у інфацэнтры, пазначаным, як у Еўропе, вялікай літарай "І", план фестывальных пляцовак. **Ды толькі ні літары "І", ні плану**…

Можа, справа ў спёцы

Страшнавата было, прызнацца, у такую спёку каштаваць знакамітыя мотальскія каўбасы. А нешматлікія аграсядзібы, што ладзілі дэгустацыі, частавалі пераважна мяснымі стравамі. Мясцовыя бабулі гэтым разам самі гулялі па фэсце разам з турыстамі, хатняй прадукцыі не прапаноўвалі. Можа, справа ў спёцы? А можа, у тым, што летась замест "Мотальскіх прысмакаў" сельвыканкам ладзіў летнік рамёстваў, і сёлета таксама на фэст прыехалі гандляваць пераважна рамеснікі. Кажуць, летась не ўсе наведвальнікі зразумелі, што трапілі не на "Мотальскія прысмакі". Наступнае ж свята плануецца ў 2017 годзе.

Былі намёты ад сырзавода вёскі Псышчава (непадалёк ад Моталя), ад Бярозаўскага сыркамбіната. На фэсце адзначыліся і бадай што ўсе мотальскія харчовыя прадпрыемствы: пякарня, рыбакапцільны цэх, каўбасныя фабрыкі з "фірменнымі" гатункамі — "Мотальская", "Яўрэйская", "Святочны гасцінец". На чатыры тысячы жыхароў у Моталі зарэгістравана шэсцьдзясят сем прадпрымальнікаў, таму фэст — нагода не толькі пагуляць, але і зарабіць.

■ Людзей на вуліцах — процьма. Прыезджых, на выгляд, менш за палову, большасць публікі — самі маталяне. Прыемна, што **шмат людзей сталага ўзросту**, не заўсёды іх сустрэнеш на масавых гуляннях, лічыцца, што гэта забава больш для моладзі.

А колькі незарэгістраваных прадпрымальнікаў, па складзе душы! Вось сядзіць на сонцапёку бабуля, гандлюе часныком. Пытаюся, чаго не ідзе ў цянёк. "Дык у цяньку ўсе месцы занятыя, унучка! А тут хоць прысесці можна". Гандлёвая палітыка гнуткая: часнык прадаецца і "воптам" — па 10 галовак, і "у розніцу". Кошт ад гэтага, праўда, не мяняецца. І калі камусьці падасца, што дзве тысячы пяцьсот рублёў за галоўку — гэта шмат, спяшаюся пераканаць: у Мінску — ад чатырох да сямі тысяч.

А чаго вартыя прадпрымальныя маталяне, што просяць па тысячы за тое, каб… сфатаграфаваць турыста на яго ж фотаапарат на фоне саламянай скульптуры мядзведзя! Вось дзе "грошы за агляд правалу", як казаў Астап Бэндэр.

Турыстам было лёгка і… складана

Файна было, што ўсе бортнікі сталі разам: турыстам лёгка было хутка ацаніць увесь аб'ём прапановы, абраць сабе па душы пэўны гатунак мёду. Адразу ўзнікла жаданне гэтак жа "пастроіць" усе астатнія харчовыя шэрагі, а яшчэ атрымаць у інфацэнтры, пазначаным, як у Еўропе, вялікай літарай "І", план фестывальных пляцовак. Ды толькі ні літары "І", ні плану… Зразумела, што часта склад удзельнікаў карэктуецца да апошняга дня. У той жа час кожны прадавец хоча трапіць у самае люднае месца. Можна было б такія кропкі "VIP" размяркоўваць загадзя, напрыклад, сярод гандляроў, што з'яўляюцца старажыламі фэсту. І заносіць у друкаваны план пляцоўкі. А тых, хто далучаецца ў апошні момант, ставіць па краях. Гэта замацавала б за імпрэзай сталых удзельнікаў.

Праграма "Мотальскіх прысмакаў" была змешчана ў раённай газеце і дзе-нідзе на дошках абвестак у мястэчку. Малавата, мабыць, было інфармацыі: людзі на вуліцах пыталіся адно ў аднаго, што калі будзе, тэлефанавалі родным, што выпісваюць "раёнку". А планы фестывальных пляцовак можна было б друкаваць з прыгожым дызайнам, каб людзі хацелі мець іх у якасці сувеніра. І прадаваць за невялікі кошт. Бо сувеніраў на фэсце відавочна бракавала: прадавалі магніты, мільгалі ў натоўпе пакеты з лагатыпам, але дзе іх набыць — так і не атрымалася высветліць. На сувенірных магнітах надпіс "Мотальскія прысмакі" прадубляваны на пяці мовах: па-украінску, па-польску, па-англійску, па-нямецку і на іўрыце. Гутарыла з калекцыянерам званочкаў. Скардзіўся ён, што не знайшоў вырабу для папаўнення збору ды казаў, што мотальскі фэст у гэтым плане, на жаль, не выключэнне з агульнабеларускай тэндэнцыі.

Нягледзячы на малую колькасць сувеніраў ды друкаванай прадукцыі "старажылы" фестывалю адзначаюць, што сёлета ўпершыню былі маштабна прадуманыя кропкі харчавання для самастойных турыстаў, не толькі ў складзе груп і дэлегацый.

Закінуць ідэю…

У час фэсту цешыўся ўвагай мотальскі Музей народнай творчасці. Сёлета ўстанова святкуе дваццацігоддзе, каля яе дзейнічала адна з фестывальных сцэн. На працягу ўсяго святочнага дзейства працаваў археалагічны музей, у дзесяць разоў маладзейшы за музей народнай творчасці: яго ўрачыста адчынілі два гады таму, на мінулых "Мотальскіх прысмаках". Незразумелы лёс хаты-музея Хаіма Вейцмана, першага прэзідэнта Ізраіля, што нарадзіўся ў Моталі. Да ўстановы не вядзе ніякіх указальнікаў, толькі трошкі інфармацыі на стэндзе ля Дома культуры. А якая атракцыя для яўрэйскіх дэлегацый!

З ідэй хацелася б "закінуць" інсцэніроўку традыцыйнага яўрэйскага вяселля. Такія тэатралізацыі робяць у польскім Любліне, украінскім Львове, сёлета тэндэнцыя дайшла і да беларускага Віцебска: 25 ліпеня адсвяткавалі стагоддзе вяселля Марка і Бэлы Шагалаў. А можа, нават сапраўднае вяселле? Калі для яўрэяў Моталь — месца памяці, няўжо не знайшлося б пары, ахвочай стварыць сям'ю на радзіме першага прэзідэнта сваёй краіны?

Улічваючы, што навыкі вырабу мотальскага караваю сёлета ўзялі пад ахову дзяржавы як элемент нематэрыяльнай культурнай спадчыны, можна было б "гуляць" на фэсце і беларускае вяселле. Знайсці сапраўдных маладых — жнівень, бадай што, самая "вясельная" пара. Тым больш у музеі народнай творчасці распрацаваная адмысловая праграма "Вяселле па-мотальску". Прапанаваць якой пары правесці для іх інтэрактыў на вуліцы, каб маглі бачыць усе госці "Мотальскіх прысмакаў". Тым больш на традыцыйным беларускім вяселлі "глядзець маладую" і праўда прыходзіла цэлая вёска. На вяселле ў Моталь турысты паехалі б з усёй Беларусі, калі б была адпаведная рэклама. Традыцыйнае беларускае вяселле, са спевамі ад аўтэнтычнага гурта "Мотальскія суседкі" і з дзяльбой каравая! Напрыклад, на вяселлі Шагалаў у Віцебску ад гледачоў не было татыстычны турыст выдаткоўвае на ежу. "Гастранамічная матывацыя" спрацоўвае падчас выбару маршруту для адпачынку: амаль дзесяць працэнтаў тырыстаў едзе ў Іспанію пераважна па ежу і віно. А калі казаць пра Грузію, то такіх гасцей краіны — больш за трацiну. Прасцей кажучы, турыст хоча есці, і той, хто яго накормiць, можа някепска зарабіць, асабліва на мясцовай, брэндавай, ежы. UNESCO штогод абвяшчае "горад гастранаміі", за званне якога гатовыя змагацца месцы, якія і так не абдзеленыя ўвагай турыстаў: польскі Кракаў, італьянская Парма, французскі Дзіжон…

У той жа час у спісах элементаў нематэрыяльнай спадчыны UNESCO не так і шмат навыкаў гатавання. У Канвенцыі 2003 года традыцыйная кухня не вылучаецца ў асобную катэгорыю. Святочныя стравы часта разглядаюцца як частка цырыманіяльнага комплексу, а на будзённае харчаванне не звяртаюць дастатковай увагі. Разам з тым "раскручанасць" рэгіянальных страў у Заходняй ды Паўночнай Еўропе дазваляе казаць пра пэўны "гастранамічны патрыятызм".

Людзей на вуліцах — процьма. Прыезджых, на выгляд, менш за палову, большасць публікі — самі маталяне. Прыемна, што шмат людзей сталага ўзросту, не заўсёды іх сустрэнеш на масавых гуляннях, лічыцца, што гэта забава больш для моладзі. Вырай для этнолага — лаві бабулю ў святочным строі, фатаграфуй, размаўляй проста на вуліцы. А лепш, канешне, зайсці ў госці. Пра пару наведаных мотальскіх хат ды скарбы іх гаспадынь больш падрабязна.

Заканчэнне артыкула і фота з Моталя — **на старонцы 12.**

Дзіцячыя калектывы з усіх рэгіёнаў Беларусі возьмуць удзел у фестывалі Саюзнай дзяржавы **"Творчасць юных".**

"Каляровы шлях" як галерэя

У культурным жыцці Оршы адбылася знакавая падзея. Напрыканцы ліпеня ў горадзе адкрылася першая прыватная мастацкая галерэя "Каляровы шлях". Яна размясцілася ў новым будынку па вуліцы Астроўскага, 11. Ініцыятарам яе стварэння стаў вядомы прадпрымальнік Мікалай Сінякоў.

ТЭКСТ

Віктар ЛЮТЫНСКІ,
выкладчык Аршанскага дзяржаўнага механіка-эканамічнага каледжа, краязнаўца

Атрымаўшы эканамічную адукацыю, ён плённа працаваў на розных адказных пасадах у сферы гандлю. З 1991-га з'яўляецца генеральным дырэктарам адной з буйных гандлёвых сетак раёна. Мікалай Сяргеевіч — не толькі паспяховы і ўплывовы прадпрымальнік (з'яўляецца членам асацыяцыі наймальнікаў і прадпрымальнікаў Віцебскай вобласці, членам савета па развіцці прадпрымальніцтва пры старшыні Віцебскага аблвыканкама). Чалавек актыўны і ініцыятыўны, ён заўсёды ў віры грамадскага жыцця — неаднаразова выбіраўся дэпутатам Аршанскага гарадскога Савета, а ў 2010 годзе быў уганараваны званнем "Чалавек года Віцебшчыны".

Але пра тое, што ён з'яўляецца шматгадовым апантаным калекцыянерам твораў беларускага мастацтва і антыкварыяту, твораў іканапісу, ведаюць далёка не ўсе. Я працаваў некалі ў Музеі гісторыі і культуры Оршы ды неаднаразова звяртаўся да Мікалая Сяргеевіча не толькі з просьбамі аб фінансавай дапамозе для набыцця прадметаў музейнага прызначэння (не памятаю, каб ён адмаўляў у гэтым), але і па парады ў сферы калекцыянавання. У снежні 2010-га, калі мы разам ехалі на IV Усебеларускі народны сход, у гутарцы ён паведаміў, што збіраецца набыць у цэнтры горада памяшканне для размяшчэння сваёй калекцыі твораў мастацтва і прадметаў даўніны. І вось амаль праз пяць гадоў яго задума здзейснілася.

У трох з густам афармленых залах экспануюцца творы вядомага віцебскага акварэліста Фелікса Гумена і жывапісныя пейзажы аршанскага мастака Уладзіміра Анішчанкі. У асобнай зале галерэі размешчана выстаўка "Беларусь праваслаўная". Тут прадстаўлена частка багацейшай калекцыі іканапісу і металапластыкі, сабранай уладальнікам галерэі за больш чым 30-гадовы перыяд. Дарэчы, у кожнай гандлёвай кропцы прадпрыемства Сінякова ёсць падараваны ім абраз Святога Мікалая ўгодніка — апекуна гандлю.

> Несумненна, новая культурна-асветніцкая ўстанова Оршы **прыцягне да сабе ўвагу** не толькі месцічаў, але і гасцей горада. Пакуль знаёміўся з экспазіцыяй і гутарыў з прыемнымі супрацоўніцамі новай галерэі, сюды зайшло некалькі добрых знаёмых — мясцовых мастакоў, настаўнікаў, краязнаўцаў. І ўсе выказалі шчырае захапленне ўбачаным.

Пры галерэі адкрыта, здаецца, першая ў гісторыі Оршы антыкварная крама, дзе можна набыць рэчы мінулых часоў — ад нумізматыкі да жывапісу.

Несумненна, новая культурна-асветніцкая ўстанова Оршы прыцягне да сабе ўвагу не толькі месцічаў, але і гасцей горада (размешчана якраз насупраць гасцініцы "Орша"). Пакуль знаёміўся з экспазіцыяй і гутарыў з прыемнымі супрацоўніцамі новай галерэі, сюды зайшло некалькі добрых знаёмых — мясцовых мастакоў, настаўнікаў, краязнаўцаў. І ўсе выказалі шчырае захапленне ўбачаным.

Трэба спадзявацца, што мастацкая галерэя "Каляровы шлях" паспрыяе ажыўленню і ўзбагачэнню культурнага жыцця горада. А цудоўны прыклад аршанскага прадпрымальніка, калекцыянера і мецэната сапраўды варты ўхвалення і пераймання. Мо стане ён нашым беларускім Трацяковым? Будзем марыць.

Што нашаптала лістота ў Райцы?

Калі быў надрукаваны матэрыял Яўгена Рагіна і Кастуся Антановіча "Базавая велічыня для новага адліку" ("К" № 26), мы з жонкай Вікторыяй якраз знаходзіліся ў Райцы.

ТЭКСТ

Алесь КВЯТКОЎСКІ,
мастак, педагог

Да гэтага часу мы з тыдзень мелі асалоду дыхаць чыстым паветрам, слухаць спевы птушак, гнёзды якіх — на векавых дрэвах. Праз дзень падтаплівалі "грубку" — ацяпленне сядзібы засталося як на пачатку XX стагоддзя. Зранку я касіў "літоўкай" гаспадарскія паўтара гектары. Было ў Райцы, як у раі, карацей кажучы.

Гаспадароў — Веру і Сашу — мы ведаем з 1990 года. Чаму так дакладна? Таму што з нашымі дзіцячымі студыямі выяўленчага і прыкладнога мастацтва паралельна рыхтаваліся і прымалі ўдзел у выстаўках, прысвечаных 500-годдзю Францыска Скарыны. Гэтыя выстаўкі праходзілі ў Полацку, Брэсце, Мінску… Вера і Саша сустрэліся на Далёкім Усходзе, дзе і ажаніліся. Яны заўсёды нагадваюць мне герояў аповесці Уладзіміра Караткевіча "Чазенія". Спадарыня Вера родам з Церахоўкі, што на Гомельшчыне, і Саша, у якім прачнуліся нейкія гены, кінулі Далёкі Усход ды, хаця не адразу, але знайшлі сябе як сапраўдныя майстры, як асобы менавіта на Беларусі… І часам здзіўляешся — чаму яны, а не "тутэйшыя", узяліся за тое, каб

> Вучням я кажу: фотаздымкі — гэта адбітак толькі таго імгненнага моманту. Фіксацыя… А маляванне з натуры праз жывапісны эцюд ці накід алоўкам дае ў час працы над імі глебу да роздуму і асэнсавання аб'екта… Непатрэбнае для вырашанай кампазіцыі адкідваецца як другаснае. Атрымліваецца мастацкі вобраз. **А ён у кожнага непаўторны…**

па магчымасці захаваць аўтэнтычнасць і адметнасць шляхецкага маёнтку. Тым больш за свае грошы.

Маёнтку ў Райцы пашчасціла: ва ўсе часы (войны, калектывізацыя) там знаходзілася нешта патрэбнае людзям — аптэка, амбулаторыя, нават радзільны дом. Гэтак жа Нясвіжскі замак захаваўся бадай толькі таму, што там знаходзіліся пэўныя дзяржустановы. У дзятлаўскім палацы Радзівілаў раней была бальніца. Сёння помнік архітэктуры паступова прыходзіць у заняпад. (Апошняя навіна: Дзятлаўскі палац выстаўлены на аўкцыён за 1,3 мільярды беларускіх рублёў…)

У дні адпачынку ў Райцы, пасля "працоўнай тэрапіі" ў выглядзе касьбы, мне трапіўся цудоўны альбом жывапісных твораў Станіслава Жукоўскага, які нарадзіўся ў мястэчку Рось, што на Гродзеншчыне, атрымаў мастацкую адукацыю ў Расіі, пакінуў вялікую спадчыну па ўсёй Еўропе. Для мяне гэта было адкрыццём, крануў той факт, што частку спадчыны мастака крытыкі абагульнілі тэрмінам "сядзібны жывапіс". Лічу, што з гэтай з'явай неабыякаваму чытачу "К" варта грунтоўна пазнаёміцца (пагартайце ўважліва альбом твораў Жукоўскага ці завітайце яшчэ раз у Мастацкі музей паглядзець на выявы сядзібных сюжэтаў пэндзля нашага земляка).

Вучням я кажу: фотаздымкі — гэта адбітак толькі таго імгненнага моманту. Фіксацыя… А маляванне з натуры праз жывапісны эцюд ці накід алоўкам дае ў час працы над імі глебу да роздуму і асэнсавання аб'екта — парк гэта, ці касцёл, а мо — краявід… Непатрэбнае для вырашанай кампазіцыі адкідваецца як другаснае. Атрымліваецца мастацкі вобраз. А ён у кожнага творцы асабісты, непаўторны…

Усе мастакі, якія вучыліся ў Мінску ў розных мастацкіх установах, прайшлі праз маляванне Лошыцкага парку, сядзібы, "дома вучоных", млына… І ва ўсіх мастакоў гэтыя мясціны толькі свае, арыгінальныя. Таму і не павінна, мяркую, "зарастаць народная сцяжына" да музея ў Райцы, балазе яе гаспадары бачаць сядзібу ў будучыні не толькі як цэнтр рэгіянальнай культуры. (Дарэчы, задумалі плэнер, звязаны з постацямі з асяроддзя Адама Міцкевіча.) Ці заахвоцяцца замежнікі, якія адпачываюць на Свіцязі, дакрануцца да сапраўднай беларускай культуры? А беларусы? Гаспадароў маёнткаў Райцы, людзей глыбока веруючых, я бачу каля свайго крыжа, які яны на сябе ўсклалі, і шчыра жадаю, каб Бог даў ім жыццёвыя сілы і ўпэўненасць у рэалізацыі сваёй мары.

…Ведаеце, калі адкінуць ідэалагічную мішуру, становіцца зразумелым, што прадстаўнікі шляхты ў большасці сваёй былі проста добрымі гаспадарамі, якія ўмелі зарабляць грошы і давалі магчымасць зрабіць гэта іншым. Яны былі апошнімі нашчадкамі некалі магутнай дзяржавы: Вялікага Княства Літоўскага і Рэчы Паспалітай. Добрай традыцыяй і адметнай рысай фальваркаў была гасціннасць… А тэхнічны прагрэс? А выхаванне моладзі, якую вучылі шанаваць сямейныя традыцыі?.. Простыя рэчы і адвечныя каштоўнасці.

У школе, у рэстаране, у абрадах…

Зараз у нашым ансамблі 7 чалавек: дзве скрыпкі, саксафон, басэтля, я на сінтэзатары граю і дзве салісткі, якія часам граюць на бубне. Яўрэйскае паходжанне толькі ў мяне, астатнія — аматары музыкі са спецыяльнай адукацыяй. Калісьці, яшчэ ў 1990-я, мяне сустрэла старшыня яўрэйскай суполкі Бабруйска і сказала прыкладна наступнае: "Яўген, ты музыкант? Дык стварай пры абшчыне ансамбль!" А яўрэйская абшчына, дарэчы, у Бабруйску сёння налічвае каля чатырох з паловай тысяч чалавек — другая па велічыні ў Беларусі пасля мінскай.

меркаванне

Яўген ГІРШЫН,
мастацкі кіраўнік ансамбля яўрэйскай музыкі "Тхея" з Бабруйска

Я скончыў культасветвучылішча ў Магілёве, потым завочна — Універсітэт культуры і мастацтваў. Працую ў бабруйскай Дзіцячай школе мастацтваў на музычным аддзяленні. Граем з вучнямі ў тым ліку і яўрэйскія мелодыі. Самі сабе прыдумалі прадмет, дзе ў дадатак да асноўнай праграмы вучым дзяцей пераймаць музыку без нот — на слых. Не ўсе спраўляюцца, але ў некаторых атрымліваецца.

Яўрэйскія мелодыі шукаю ў Інтэрнэце, дзе на гэтую тэму вельмі шмат інфармацыі. У этнаграфічныя экспедыцыі не езджу, таму нейкай беларускай спецыфікі ў музыцы ансамблю "Тхея" няма, хіба што ўсходнееўрапейская наогул. Назваць нас гуртом клезмерскай музыкі ў поўным сэнсе слова нельга. Клезмер — гэта той, хто выконвае музыку ўсходнееўрапейскіх яўрэяў-ашкеназі, засвоеную на слых. У нашым жа ансамблі — людзі з акадэмічнай адукацыяй. У рэпертуар уваходзяць і сусветна вядомыя мелодыі, без асаблівай лакальнай прывязкі. Імкнемся па меры сваіх фінансавых магчымасцей удзельнічаць у конкурсах, нядаўна былі на фестывалі клезмерскай музыкі ў Адэсе. Чулі пра польскія фестывалі, але туды пакуль не ездзілі. Ведаю, што клезмерская музыка вельмі папулярная ў ЗША…

Канешне, этнаграфічныя яўрэйскія мелодыі — гэта сапраўдны скарб. На жаль, я невялікі спецыяліст у гэтай галіне. Кантактаваць з патомнымі клезмерамі мне не даводзілася. Нават не ведаю, ці магчыма зараз адшукаць яўрэйскага музыканта, які б у свой час засвоіў рэпертуар на слых. Але ведаю, што яшчэ на пачатку 2000-х зацікаўленыя даследчыкі, пераважна непрафесійныя, аматары, запісвалі ў Беларусі найгрышы ад патомных музыкантаў. Дарэчы, насуперак стэрэатыпам, яўрэйскія музыканты гралі разам з хрысціянскімі, чаму ёсць гістарычныя сведчанні.

25 ліпеня нас запрасілі суправаджаць інсцэніроўку вяселля Шагалаў у Віцебску. Арганізоўвала ўсё віцебская абшчына: шукалі спонсараў, замаўлялі касцюмы. Цудоўную вясельную сукенку Бэлы зрабіла дызайнер Ірына Красоцкая. Цырымонія ж праходзіла ў дворыку Дома-музея Марка Шагала. Усё адбывалася на вуліцы, невыпадкова і мае гістарычныя карані: яўрэйскае вяселле, хупа, часта праводзілася на вольным паветры. Некаторыя нават лічаць гэта абавязковай умовай легітымнага яўрэйскага шлюбу. Часамі, калі цырымонію хацелі правесці ў памяшканні, над балдахінам рабілі адтуліну ў страсе, каб выканаць рэлігійнае прадпісанне.

> Канешне, этнаграфічныя яўрэйскія мелодыі — **гэта сапраўдны скарб**. На жаль, я невялікі спецыяліст у гэтай галіне. Кантактаваць з патомнымі клезмерамі мне не даводзілася. Але ведаю, што яшчэ на пачатку 2000-х зацікаўленыя даследчыкі, пераважна непрафесійныя, аматары, запісвалі ў Беларусі найгрышы ад патомных музыкантаў.

На сапраўдным яўрэйскім вяселлі нашаму ансамблю пашчасціла граць толькі аднойчы. Нягледзячы на шматлікасць бабруйскай абшчыны, традыцыйныя вяселлі ўжо амаль ніхто не ладзіць. А клезмерская музыка развівалася менавіта як музыка вясельная. Дык вось, адзін наш зямляк з'ехаў працаваць у Маскву, стаў паспяховым бізнэсмэнам. Калі вырашыў адгуляць вяселле, то прыехаў у родны Бабруйск, каб зладзіць традыцыйную цырымонію. Нас запрасілі з музычным суправаджэннем. Было вельмі прыгожа, для ўсёй абшчыны тое сталася вялікай падзеяй.

Збольшага наш ансамбль грае ў рэстаранах і на канцэртах яўрэйскай самадзейнасці. Запрашаюць нас па ўсёй Беларусі.

Занатавала Алена ЛЯШКЕВІЧ

Меркаванні калумністаў і экспертаў газеты не абавязкова адлюстроўваюць пункт гледжання рэдакцыі.

Выстаўка работ Генадзя Чыстага **"З зямлі падымаю яблык..."** адкрыецца 19 жніўня ў Літаратурным музеі Максіма Багдановіча.

Хто па што ў Шчучын едзе?

Як зрабіць шоу не на пустым месцы для гасцей і мясцовых жыхароў

Ці не кожны раённы цэнтр нашай краіны мае сваю арыгінальную архітэктурную і культуратворчую парадыгму. Шчучын не з'яўляецца выключэннем — невялікі ўтульны горад, куды хочацца прыехаць не толькі, каб пакаштаваць смачнага мясцовага сыру, але і пазнаёміцца з культурным жыццём. На што здольны ў гэтым плане горад мы даведаемся ў поўнай меры ўжо менш чым праз месяц, калі тут адбудзецца Дзень беларускага пісьменства. Пакуль жа гутарым пра дасягненні і клопаты сферы з намеснікам начальніка аддзела ідэалагічнай работы, культуры і па справах моладзі райвыканкама Аляксандрам АМШЭЕМ.

Кастусь АНТАНОВІЧ,
Мінск — Шчучын — Мінск

— Шчучын неўзабаве стане сталіцай Дня беларускага пісьменства. Ці варта гасцям чакаць нейкіх арыгінальных хадоў ад арганізатараў, або ўсё пройдзе па ўжо "накатаным" сцэнарыі?

— Каб разважаць пра пэўную традыцыйнасць, трэба параўнаць некалькі аналагічных святаў. Я дагэтуль пабываў толькі на адным свяце беларускага пісьменства — у мінулым годзе ў Заслаўі. Штосьці спадабалася, ну а штосьці не вельмі. А таму заўважаныя недахопы ў арганізацыі папярэдняга свята будзем імкнуцца не паўтараць. У прыватнасці, улічым той момант, што частка гледачоў прыедзе не столькі па літаратурнае слова, колькі па шашлык ды баўленне вольнага часу. Таму размяшчаць сцэнічныя пляцоўкі, дзе выступяць пісьменнікі побач з намётамі аб'ектаў грамадскага харчавання не плануем.

Перакананы, сёлета свята пройдзе на высокім узроўні. Так сцвярджаю, бо ўжо маем сцэнарый. Ён быў распрацаваны з удзелам Нацыянальнага арганізацыйнага камітэту, які ўзначальвае віцэ-прэм'ер Наталля Качанава. Так, галоўная сцэна размесціцца каля РДК, дзе пройдзе афіцыйная частка свята. Не менш цікавымі будуць і дадатковыя пляцоўкі, якія вырашылі зрабіць больш разнастайнымі. Да прыкладу, на цэнтральнай плошчы размесціцца выстаўка сродкаў масавай інфармацыі, маладзёжная пляцоўка з адпаведнай праграмай будзе дзейнічаць каля адрамантаванага кінатэатра. Каля адноўленага намаганнямі рэстаўратараў палаца Друцкіх-Любецкіх перад гасцямі свята разгорнуцца старонкі нашай гісторыі з удзелам рыцарскіх клубаў. На стадыёне зладзім спартыўнае свята з удзелам юных футбалістаў, якія пазмагаюцца ў фінале абласной спартакіяды. У скверы ля плошчы Свабоды будуць размешчаны дзіцячая пляцоўка і горад майстроў, дзе кожны зможа не толькі набыць вырабы рамеснікаў, але і ў час майстар-класаў паспрабаваць уласнымі рукамі зрабіць што-небудзь з гліны, скуры, дрэва ці жалеза. Гасцей свята пазнаёмяць з фестывальнымі праектамі Гродзеншчыны, а таксама з турыстычным патэнцыялам Прынямоння. Наша задача не толькі паказаць адметнасці свайго раёна, але і культурнае багацце вобласці. Дарэчы, на ўездзе ў Шчучын з боку трасы М6 побач з усталяваным на пастаменце самалётам МіГ-25 — сімвалам авіяцыйнай славы горада — мяркуем размясціць вялікі білборд з картай раёна і інфармацыяй пра найбольш цікавыя для наведвання аб'екты. Прызнаюся, не ўсё, што было запланавана першапачаткова, атрымаецца рэалізаваць. З-за пэўных арганізацыйных пытанняў, на жаль, не атрымаецца правесці плэнер скульптараў.

— Склалася традыцыя ў сталіцы Дня беларускага пісьменства адкрываць памятны знак. Чым здзівіць сёлета Шчучын?

— На гэты конт у нас было шмат разваг. Самы вядомы шчучынскі літаратар — Алаіза Пашкевіч, вядомая пад псеўданімам Цётка. А таму на будынку раённай бібліятэкі, які будзе капітальна адрамантаваны і адкрыты пад час святкавання, вырашылі размясціць мемарыяльную шыльду з барэльефам літаратаркі. Яшчэ адзін памятны знак ўсталюем ля Палаца творчасці дзяцей і моладзі. Сімвалічна, што ў Год моладзі юныя таленты адсвяткуюць наваселле ў сценах колішняга княскага палаца, чые дзверы гасцінна расчыняцца 6 верасня.

Аляксандр АМШЭЙ. / Фота аўтара

"Выводзіць мерапрыемствы Дня пісьменства за межы горада бачыцца не зусім апраўданым. З іншага боку, у свяце будуць задзейнічаны ўсе музычныя калектывы, народныя майстры з раёна і часткова з вобласці. **Наша задача не толькі паказаць свой раён, але і культурнае багацце вобласці**".

— Ці будуць у святкаванні задзейнічаны сілы раёна?

— Сельскія пляцоўкі вырашылі шырока не выкарыстоўваць, бо паўстала пытанне з транспартам. Выводзіць жа мерапрыемствы Дня пісьменства за межы горада бачыцца не зусім апраўданым. У якасці выключэння варта адзначыць традыцыйную экспедыцыю "Дарога да святыняў", якая завітае ў раён 5 верасня. Яе ўдзельнікі, акрамя Шчучына, наведаюць Астрыну (там у мясцовай школе — Музей Алаізы Пашкевіч). З іншага боку, у свяце будуць задзейнічаны ўсе музычныя калектывы, народныя майстры з раёна і часткова з вобласці. Словам, працы хопіць усім, бо фэст прадоўжыцца два дні. Такім чынам, перад намі паўстаў яшчэ адзін клопат — рассяленне гасцей свята. Але ад Шчучына не так далёка Масты, Ваўкавыск, Ліда і Гродна. Спадзяёмся, што на свята ў наш горад збярэцца не менш гасцей, чым летась у Заслаўе.

— І ўсё ж брэндаў, якія варта паказаць гасцям свята, на Шчучыншчыне багата. Варта згадаць хаця б рок-спевака Чэслава Нэмэна…

— Шчыра кажучы, цяжкавата для нас звязаць гэтага выдатнага музыканта з беларускай мовай і пісьменствам. Аднак пастараемся, па меры магчымасці, паказаць усе цікавосткі сферы культуры раёна: будзем прапаноўваць гасцям буклеты з інфармацыяй пра культурныя аб'екты. Думаецца, набярэцца нямала ахвочых выбрацца на пару гадзін у Старыя Васілішкі, Ражанку, Жалудок, Астрыну, Мураванку... Разлічваем, што такой магчымасцю скарыстаюцца нашы госці, якія прыедуць на ўласным аўтатранспарце. Да Дня пісьменства распрацавалі адмысловы турмаршрут.

— Ці зарабляе зараз раён на гісторыка-культурнай спадчыне? Недалёкі Зэльвенскі раён, да прыкладу, зарабляе дзякуючы наяўнасці старажытнай царквы ў Сынкавічах. Побач з ёй пабудавалі сувенірны павільён.

— Гэта магчыма зрабіць і ў нас. Але ж перш чым зарабляць, трэба ўкласці інвестыцыі. Калі казаць пра царкву ў шчучынскай Мураванцы — сувенірныя вырабы нашых майстроў можна купіць у самім храме. Што да разнастайнасці прадукцыі, арыентаванай на турыстаў, то пакуль чымсьці адметным пахваліцца не можам. Каб змяніць сітуацыю, плануем звяртацца да прыватнікаў з іншых раёнаў і браць на рэалізацыю іх прадукцыю. Ды і наш РЦР увесь час пашырае асартымент, вядзе пошук новых відаў сувенірнай прадукцыі.

— Ужо не адзін раён нашай краіны паспяхова выкарыстоўвае магчымасці трансгранічнага супрацоўніцтва. Ці працаваў Шчучын з грантамі Еўрасаюза?

— Маецца станоўчы досвед гарпасёлка Жалудок. Дзякуючы ўдзелу ў праектнай дзейнасці там створаны інфацэнтр па ўстойлівым развіцці, сельскім прадпрымальніцтве і аграэкатурызме, рэалізаваны шэраг цікавых ініцыятыў. Зараз рыхтуем дакументацыю на трансгранічны праект па развіцці музея Чэслава Нэмэна. Актыўна працуем з літоўскімі партнёрамі — нядаўна з выкарыстаннем гранта (а гэта каля 800 тысяч еўра) у райцэнтры падбудаваны сучасны спартыўны комплекс. Зараз ёсць зацікаўленасць у распрацоўцы праектаў у галіне культуры. А неўзабаве наша дэлегацыя плануе наведаць Варэну, каб вызначыцца з кірункам далейшай дзейнасці.

Калі казаць пра іншыя перспектывы міжнароднага супрацоўніцтва, то зараз рыхтуецца дакументацыя для надання цэрквам у вёсках Мураванка і Сынкавічы статусу гісторыка-культурнай каштоўнасці UNESCO. З гэтай нагоды маецца зацікаўленасць у бургамістра польскага Супрасля, дзе таксама ёсць помнік абарончага хрысціянскага дойлідства, наконт распрацоўкі трансгранічнага маршрута, які звяжа тры праваслаўныя святыні. Пакуль у планах за кошт грантаў распрацаваць і размясціць побач з аб'ектамі інфармацыйныя ўказальнікі і стэнды, а таксама запусціць паўнавартасны сайт.

— Якімі яшчэ клопатамі жыве раён?

— Да нашага жалю, з года ў год назіраецца змяншэнне колькасці моладзі ў раёне. Яскравы прыклад сітуацыі: дыскатэкі ў РДК. Яшчэ з дзясятак гадоў таму кожную суботу быў аншлаг. Апошнім жа часам у горадзе ўвогуле перасталі праводзіцца дыскатэкі. Нічога не дапамагае, нават запрошаныя дзі-джэі з Гродна. Але, калі казаць шчыра, прычына не толькі ў адсутнасці моладзі, але, найперш, у пытанні рэгламенту наведвання дыскатэк моладдзю да 18 гадоў. У выніку сярод насельніцтва расце папулярнасць кавярняў і бараў, якія множацца як грыбы пасля дажджу.

— Як тады бавяць вольны час падлеткі і моладзь?

— Казаць, што маладому пакаленню няма чым заняцца, нельга. У горадзе дзейнічае багата клубных фарміраванняў пры Раённым доме культуры на любы густ. Зараз з'явілася магчымасць стварэння маладзёжнага вакальна-інструментальнага калектыву — дапамог "Шчучынскі масласырзавод", за кошт якога былі набыты неабходныя музычныя інструменты. Дзейнічае цэнтр творчасці дзяцей і моладзі, школа мастацтваў, дзіцяча-юнацкая спартыўная школа, база юных тэхнікаў, цэнтр турызму і краязнаўства. Пры жаданні і цікавасці з боку дзяцей магчымасці развіваць свае творчыя здольнасці ў горадзе маюцца. Гэта, можна сказаць, той традыцыйны мінімум.

— А нетрадыцыйны?

— У найбліжэйшых планах — пераабсталяванне кінатэатра пад культурна-забаўляльны цэнтр, арыентаваны на моладзь. Першая чарга будаўнічых работ завершыцца да Дня пісьменства. Пад адным дахам размесцяцца спартыўна-забаўляльная дзіцячая пляцоўка, зала для правядзення інтэлектуальных гульняў, дзіцячае кафэ. Захаваецца і ўласна кіназала, якая апошнім часам рэдка прымала гледачоў. Памеры новай кіназалы зменшацца да 112 месцаў, але затое яна будзе абсталявана сучаснай сістэмай "3-D". Аднак, нават адкрыццё такога шматпрофільнага комплекса наўрад ці зможа кардынальна змяніць сітуацыю, тым больш што для завяршэння праекта спатрэбяцца значныя фінансы.

— Тады за кошт чаго рэгіянальная культура можа папаўняць свой пазабюджэт?

— Будзем шчырымі — цяжка ўявіць, што ў нейкай краіне свету рэгіянальная культура з'яўляецца самаакупнай, ужо не кажучы пра яе прыбытковасць. Вядома, задача зарабляць ставіцца перад усімі ўстановамі культуры раёна. Але трэба ўлічваць прыбыткі, якія маюць жыхары Шчучыншчыны. Тым не менш, мы не сядзім склаўшы рукі. Яскравы прыклад — вялікая колькасць канцэртаў штогод як у Шчучыне,так і на пляцоўках сельскіх дамоў культуры. Не першы год працягваецца супрацоўніцтва з Гродзенскай абласной філармоніяй. Апроч таго, выканаўцы самастойна дамаўляюцца з нашымі ўстановамі культуры праз сваіх прадзюсараў. Але і тут хапае клопатаў: сёння запоўніць залу РДК вельмі цяжка. А таму радуе, што знайшлося паразуменне з прафсаюзнымі структурамі на прадпрыемствах і арганізацыях, якія дапамагаюць з набыццём білетаў на канцэрты.

— Ізноў пра аптымізацыю. Ці не абдзелена насельніцтва ў вёсках у плане культурных паслуг пасля скарачэння ўстаноў?

— Стараемся, каб жыхары раёна не адчувалі дыскамфорту ад аптымізацыі. Мы ідзём па шляху закрыцця клубных і бібліятэчных устаноў у маланаселеных вёсках з колькасцю насельніцтва менш за 100 чалавек. Утрымліваць там паўнавартасную ўстанову культуры на сённяшні дзень накладна. А таму пераходзім на абслугоўванне бібліобусам, які не радзей чым раз на месяц прыязджае ў вёску. Прынцып яго работы наступны: калі ў населеным пункце ёсць хаця б адзін чалавек, прагны да чытання, то мы абавязаны да яго прыехаць. Акрамя таго летам кожны тыдзень абіраюцца па два населеныя пункты, дзе праводзяцца свята вёскі…

— Але часам даводзіцца чуць папрокі, маўляў, святы вёсак вызначаюцца сваёй аднастайнасцю.

— Пры падрыхтоўцы мерапрыемства мы абапіраемся на гісторыю і традыцыі той вёскі, у якую прыязджаем. У некаторых вёсках яшчэ маюцца свае самабытныя народныя калектывы, выступленні якіх таксама ўключаюцца ў праграму свята, гэтаксама ў межах мерапрыемства мясцовыя майстры робяць паказы сваіх работ. Але пагаджуся, у арганізацыі такіх святаў насамрэч ёсць пэўны шаблон — выступленне мясцовых улад, самадзейных калектываў, віншаванні сяльчан. Рабіць шоу на пустым месцы цяжкавата. А таму вельмі добра, калі да святкавання далучаюцца прыватнікі. Прыгадваецца свята вёскі ў Бярозаўцы. Было цікава, бо да святкавання далучылася аграсядзіба-конны двор.

Яшчэ адзін цікавы прыклад дзяржаўна-прыватнага супрацоўніцтва — свята кветак, што традыцыйна штогод праводзіцца ў Жалудку. А зусім нядаўна там прайшоў і міжнародны конкурс-агляд розных парод сабак, які сабраў вельмі шмат аматараў хатніх жывёл. У Старых Васілішках традыцыйным стала правядзення свята музыкі Чэслава Немэна. Раз у два гады Шчучын прымае абласны фестываль эстрадных выканаўцаў і вядучых "І вечная вясна…". Ёсць задумка арганізаваць фестываль арганнай музыкі ў каталіцкіх храмах раёна, дзе захаваліся арганы. Словам, стараемся зрабіць культурнае жыццё нашага раёна цікавым і разнастайным.

К

Фотарэпартаж са Шчучына, які рыхтуецца да Дня беларускага пісьменства, "К" публікавала ў № 29. Можна яго пабачыць і на сайце газеты **www.kimpress.by**

19 жніўня Нацыянальны тэатр імя М.Горкага адкрые новы сезон спектаклем "Дванаццатая ноч" па п'есе У.Шэкспіра.

13 жніўня ў Нацыянальным прэс-цэнтры прайшла прэс- канферэнцыя "Аб захаванні гісторыка-культурнай спадчыны Рэспублікі Беларусь". На пытанні журналістаў рэспубліканскіх і замежных СМІ адказвалі намеснік Міністра культуры нашай краіны Аляксандр Яцко і начальнік упраўлення па ахове гісторыка-культурнай спадчыны Міністэрства культуры Рэспублікі Беларусь Ігар Чарняўскі.

Юрый ЧАРНЯКЕВІЧ

Царква XVIII стагоддзя ў вёсцы Малыя Мурыны.

Прадстаўнікі Міністэрства культуры распавялі пра тэндэнцыі ў сферы гісторыка-культурнай спадчыны

Будоўля пад кантролем

"Хваля" ў інтэрнэце

Адным з найбольш актуальных пытанняў, якое прагучала на прэс-канферэнцыі, стаўся запыт журналістаў пра лёс старадаўняй царквы XVIII стагоддзя ў вёсцы Малыя Мурыны Камянецкага раёна Брэсцкай вобласці. Нагадаю, што днямі ў Інтэрнэце былі апублікаваны фотаздымкі гэтай, нібыта "разбуранай", царквы. Да таго ж, як высветлілася, яна занесеная ў Дзяржаўны спіс як гісторыка-культурная каштоўнасць другой катэгорыі і таму, натуральна, ахоўваецца законам.

— Пытанне з царквой у Камянецкім раёне нам вядомае, — адзначыў Ігар Чарняўскі. — У інтэрнэце, у СМІ, на мой погляд, паднялася сёння сапраўдная "хваля" з гэтай нагоды, і многія гавораць, што, як быццам, царкву ў вёсцы Малыя Мурыны знішчылі. Але таму, хто пра гэта пачаў казаць, варта было б спачатку пазнаёміцца з праектнай дакументацыяй, якой прадугледжаны ўсе неабходныя мерапрыемствы па правядзенні работ на гэтым аб'екце гісторыка-культурнай спадчыны.

■ Пры правядзенні работ у Малых Мурынах сапраўды дапушчаны парушэнні. Справа ў тым, што адказнымі асобамі не быў атрыманы дазвол Міністэрства культуры. **Таму сёння падрыхтавана прадпісанне,** якое павінна быць выканана, а работы мусяць прывесці ў адпаведнасць з заканадаўствам.

Па словах Ігара Чарняўскага, рэстаўрацыйная праца з драўлянай архітэктурай адрозніваецца тым, што канструкцыі дазваляецца разбіраць, каб замяніць сапсаваныя дэталі на новыя. Таму ў гэтым плане ўсё адпавядае праектнай дакументацыі.

— Тэхнічны стан царквы далёка не лепшы, да таго ж яна была ў свой час перабудавана, — адзначыў Ігар Чарняўскі. — Хто бачыў гістарычныя здымкі і сучасныя фатаграфіі, той разумее, што гэта абсалютна розныя рэчы. Паводле праекта прадугледжана аднаўленне гістарычнага аблічча помніка спадчыны. Больш за тое, падчас папярэдняй перабудовы кроквы царквы былі зроблены не самым належным чынам, і таму цяпер іх трэба перарабляць. Так што сёння ў Камянецкім раёне адбылася адно толькі стадыя разборкі канструкцый царквы. Наступная стадыя — аднаўленне помніка спадчыны.

Але, як адзначыў начальнік упраўлення, пры правядзенні работ сапраўды дапушчаны парушэнні. Справа ў тым, што адказнымі асобамі не быў атрыманы дазвол Міністэрства культуры. Таму сёння падрыхтавана прадпісанне, якое павінна быць выканана, а работы мусяць прывесці ў адпаведнасць з заканадаўствам.

Ігар Чарняўскі таксама не выключыў, што ў сувязі з дадзеным парушэннем заканадаўства мясцовыя органы ўлады могуць прыняць рашэнне аб прыцягненні вінаватых да адміністрацыйнай адказнасці ў залежнасці ад ступені нанесенай шкоды. "Але я спадзяюся, што паступова сітуацыя ўвойдзе ў прававое рэчышча і царква будзе адноўлена згодна з праектнай дакументацыяй", — зазначыў начальнік упраўлення.

Ад Свержаня да Курапатаў

Журналістаў цікавілі і іншыя праблемы ў сферы аховы гісторыка-культурнай спадчыны. Напрыклад, згодна з інфармацыяй аднаго з калег, сёння жыхары вёскі Новы Свержань, што ў Стаўбцоўскім раёне Мінскай вобласці, хвалююцца наконт рэканструкцыі мясцовай былой уніяцкай царквы і жадаюць, каб рамонт быў у ёй праведзены ў адпаведнасці з гістарычнымі і архіўнымі данымі.

— Агучанае пытанне знаходзіцца пад пастаянным кантролем, — адзначыў начальнік упраўлення. — Замена наверша вежы мясцовай царквы ўзгоднена менавіта ў той форме, якая там павінна быць згодна з гістарычнымі звесткамі, а не ў той, якую там камусьці хацелася б бачыць. Да слова, гэтым пытаннем займаемся не толькі мы, але таксама і Стаўбцоўскі райвыканкам. Адзначу, што я вельмі пазітыўна ацэньваю той факт, што грамадзяне праявілі цікавасць да перабудовы царквы і ўзнялі гэтую праблему.

Таксама было зададзена пытанне і пра стварэнне ахоўнай зоны гісторыка-культурнай каштоўнасці на месцы гібелі ахвяр палітычных рэпрэсій 1930-1940-х гадоў ва ўрочышчы Курапаты. На думку Ігара Чарняўскага, існуючы праект цалкам здольны забяспечыць захаванасць гэтага месца.

— Сённяшні праект ахоўнай зоны рыхтаваўся на навуковай аснове і з дакладнымі замерамі, — адзначыў начальнік упраўлення. — Думаю, што ўсталяваная ахоўная зона і зона рэгуляванай забудовы ды аховы ландшафту дастатковыя для таго, каб абараніць і захаваць Курапаты ды тыя гістарычныя элементы, якія там былі.

Журналісты запыталіся і пра лёс Дзяржаўнай праграмы "Замкі Беларусі" на 2012-2018 гады. Як падкрэсліў Аляксандр Яцко, названая Дзяржпраграма з'яўляецца прыярытэтнай для нашай краіны. Але, на жаль, сёння існуюць пэўныя пытанні як наконт выканання, так і наконт фінансавання дадзенай праграмы.

— У сувязі з тым, што ў Беларусі плануецца ўвесці ў 2016 годзе некалькі іншыя падыходы да фарміравання дзяржаўных праграм, дык можа быць і так, што дадзеная праграма зведае некаторыя змены, — адзначыў Аляксандр Яцко. — Хаця на дадзеным этапе я гэта не стаў бы адназначна сцвярджаць. Падвядзём вынікі, збяром усе матэрыялы за мінулы перыяд і ў верасні, на калегіі Міністэрства культуры, прымем узгодненае рашэнне па гэтым пытанні".

К

Навальніца, якая пракацілася па Беларусі некалькі тыдняў таму, нарабіла шкоды і ў знакамітай сядзібе Рэйтанаў у Грушаўцы. Паваленыя дрэвы і вецце ўжо прыбралі валанцёры з розных куткоў краіны пры непасрэдным і самым актыўным удзеле старшыні Начаўскага сельвыканкама Вячаслава Новіка. Значную падтрымку аказалі і раённыя ўлады Ляхавіччыны. Прадастаўлены імі трактар для вывазу ламачча толькі за адзін дзень зрабіў дзесяць рэйсаў з прычэпам, поўным да бартоў. Але ці не самы згубны вынік стыхіі пакуль не ліквідаваны. Адна з сядзібных пабудоваў — старое драўлянае гумно — сёння, лічы, пазбаўлена даху.

Ілья СВІРЫН

Шыфер "б/у" для інжынернага цуду: ураган пакінуў без даху помнік драўлянага дойлідства

Тое самае пацярпелае гумно.

Унікальнае... гумно

На фоне іншых адметнасцей Грушаўкі тое гумно не асабліва прыцягвае да сябе ўвагу. Пагатоў, не кожны з наведвальнікаў да яго дабіраецца — яно месціцца на гаспадарчым двары, куды вядзе разбітая сельгастэхнікай дарога. Тым больш, з гэтай някідкай з выгляду пабудовай не звязана ніякіх захапляльных гісторый. Але навукоўцы лічаць яе сапраўдным цудам інжынернай думкі нашых продкаў і падрабязна апісваюць у сваіх даследаваннях.

— Гумно ў Грушаўцы вылучаецца сваімі вялікімі памерамі, але гэта, вядома, не самае галоўнае, — распавядае адзін з найбольш аўтарытэтных знаўцаў сядзібна-паркавага мастацтва нашай краіны, прафесар Беларускага дзяржаўнага педагагічнага ўніверсітэта імя Максіма Танка Анатоль Федарук. — Важна тое, што гэтыя памеры забяспечваюцца асаблівымі канструкцыямі. Прыкладам, кожны вонкавы слуп мае ля сваёй асновы нешта кшталту кантрафорса з бруса моцнага сячэння. Да таго ж, ніжнія часткі ўнутраных слупоў абапіраюцца на крыжападобную падкладку, дзякуючы чаму тыя слупы самі не судакранаюцца з зямлёй і, адпаведна, не гніюць. Гэта вынаходка спрашчае і правядзенне рамонту.

Пэўна, менавіта дзякуючы абачлівасці невядомых народных дойлідаў драўляны будынак паспяхова перасягнуў стогадовы век і дайшоў да нас у нядрэнным стане. Хаця яшчэ некалькі гадоў таму можна было заўважыць немалыя прарэхі ў сучасным шыферным даху. Гэта тым больш здзіўляла з той прычыны, што гумно выкарыстоўвалася мясцовай гаспадаркай амаль па першапачатковым прызначэнні.

■ Пэўна, дзякуючы абачлівасці невядомых народных дойлідаў драўляны будынак паспяхова перасягнуў стогадовы век і дайшоў да нас у нядрэнным стане. Хаця яшчэ некалькі гадоў таму можна было заўважыць немалыя прарэхі ў сучасным шыферным даху. І вось, **нядаўні ўраган давяршыў справу, і лядашчы дах абрынуўся.** Пра тое, што гэта азначае для драўлянага будынка, не варта нават і казаць.

І вось, нядаўні ўраган давяршыў справу, і лядашчы дах абрынуўся. Пра тое, што гэта азначае для драўлянага будынка, не варта і казаць.

— Літаральна год-два — і такі помнік архітэктуры можна лічыць страчаным, — з веданнем справы кажа Анатоль Федарук. — Драўляныя гумны ў нас мала дзе захаваліся, і ў пераважнай большасці выпадкаў іх лёс маглі змяніць пару лістоў шыфера, своечасова пакладзеныя на дах нечай руплівай рукой. Каштоўнасць будынка ў Грушаўцы вельмі вялікая, і трэба неадкладна прыняць меры па яго ратаванні.

На сённяшні дзень рабочы летнік у сядзібе ідзе поўным ходам. Але ў цэнтры ўвагі пакуль знакаміты флігель "Мураванка", дзе, як мяркуецца, прайшлі апошнія дні жыцця Тадэвуша Рэйтана. Па сканчэнні прац будынак з трохсотгадовай гісторыяй займее часовы дах, а яго дзвярныя і ваконныя праёмы па рашэнні мясцовых уладаў закладзены цэглай. А затым валанцёры мяркуюць узяцца за гумно.

— Перад тым як пачаць працы, мы хацелі б пачуць парады спецыялістаў, — кажа адзін з арганізатараў летніка Зміцер Юркевіч. — Далей — падабраць матэрыялы, прычым для часовых супрацьаварыйных мер пасуе нават "бэушны" шыфер. Няма сумневу, што да пачатку "мокрага сезону" хоць нейкі дах мы павінны зрабіць. Ратаваць гэта ўнікальнае гумно трэба, як кажуць, усім светам!

Валанцёры спадзяюцца на дапамогу мясцовых уладаў, а таксама і мясцовых гаспадарак — хаця б тымі ж матэрыяламі альбо не надта мудрагелістай тэхнікай. У адрозненне ад некаторых мясцовых жыхароў, "прышлыя" энтузіясты бачаць вялікую перспектыву гэтай "састарэлай" драўлянай пабудовы.

— Спадзяемся, сядзіба некалі стане сапраўднай перлінай беларускага турызму, і тады можна стварыць у тым гумне экспазіцыю сельскагаспадарчых прылад, ладзіць там майстар-класы для дзятвы, — марыць Зміцер Юркевіч. — Ды і для дарослых таксама, бо які гарадскі жыхар сёння ўмее абыходзіцца з плугам?

Пакуль такія мары выглядаюць адарванымі ад рэаліяў жыцця, але ж пэўны прагрэс у справе рэвіталізацыі котлішча Рэйтанаў — відавочны. Прыкладам, 22 жніўня на тле занядбанага палаца пройдзе ўжо трэці па ліку фэст. Пачнецца ён з раённага свята традыцыйнай культуры "З крыніц спрадвечных", а затым плаўна перацячэ ў "Дах-29" (назва, пагадзіцеся, у дадзеным выпадку асабліва злабадзённая). Як і амаль усе пачыны, датычныя сядзібы, імпрэза стала добрым прыкладам супрацоўніцтва паміж энтузіястамі ды мясцовымі ўладамі.

К

Бамонд: опера, балет

Сцэна з оперы "Кармэн". / Фота Міхаіла НЕСЦЕРАВА

“Кармэн”. Версія сёмая

У канцы сезона на сцэне Нацыянальнага акадэмічнага Вялікага тэатры оперы і балета Беларусі з’явілася новая пастаноўка “Кармэн” Жоржа Бізэ. Ці пераўзышла яна ранейшыя сем? І ў чым яе адметнасць?

Надзея БУНЦЭВІЧ

■ На гэты раз спыніліся на першым аўтарскім варыянце з размоўнымі дыялогамі. Нагадаю, калі два дзесяцігоддзі таму наш тэатр ужо звяртаўся да гэтай рэдакцыі, дык пастаноўка была прызначана найперш для замежных гастролей з запрошанымі заходнімі салістамі, для якіх размовы па-французску не былі перашкодай. **Цяпер тыя дыялогі дзе значна, а дзе крыху скарацілі...**

“Кармэн” як карма

Прэм’ера не магла не прыцягнуць увагу музычнай грамадскасці не толькі з-за папулярнасці твора. Гэта опера папраўдзе знакавая для развіцця нашага мастацтва і практычна не сыходзіла з рэпертуару: сучасныя гледачы, у залежнасці ад узросту, могуць прыгадаць ад адной да пяці мінулых беларускіх версій. Парадокс, але менавіта ёй адкрыўся ў 1933-м наш Вялікі тэатр. Заўважым, не беларускай операй, хаця на той час ужо прагучала ў радыёэфіры камічная аднаактоўка “Тарас на Парнасе” Мікалая Аладава, і не рускай класікай, хаця менавіта на яе ў першую чаргу арыентаваліся ўсе савецкія тэатры. Але неабходныя ўмоўнасці, каб опера стала больш беларускай і рэвалюцыйнай, тады былі вытрыманы: яна ішла ў перакладзе, “на мове” (“Бык ідзе, раззявіў зяпу ён”), а галоўная гераіня і яе паплечнікі-кантрабандысты трактаваліся як барацьбіты за свабоду. З далейшых увасабленняў самай нечаканай была рэжысура Вячаслава Цюпы ў 1990-м: усе героі знаходзіліся ў клетках, а забівала Кармэнсіту — быццам бы ціхая Мікаэла, падманутая нявеста Хазэ.

У свеце было нямала спроб зрабіць Кармэн адмоўным персанажам. Але пры любых варыянтах яна застаецца прывабнай — ці, пры падкрэсліванні ў ёй д’ябальскага пачатку, чартоўску прыцягальнай. І ўсё з-за музыкі, якая ўшчэнт разбіла змрочнасць навэлы Праспэра Мэрымэ.

Наша цяперашняя гераіня (дый сам спектакль) асацыююцца ў мяне з “Кармэн” Сальвадора Далі. Патлумачу, чаму ўзніклі такія паралелі.

Рэакцыя на рэдакцыю

Па-першае, з-за выбару рэдакцыі. На гэты раз спыніліся на першым аўтарскім варыянце з размоўнымі дыялогамі. Нагадаю, калі два дзесяцігоддзі таму наш тэатр ужо звяртаўся да гэтай рэдакцыі, дык пастаноўка была прызначана найперш для замежных гастролей з запрошанымі заходнімі салістамі, для якіх размовы па-французску не былі перашкодай. Цяпер тыя дыялогі дзе значна, а дзе крыху скарацілі, але яны не напоўнены энергетыкай, як гэта ўмеюць рабіць драматычныя артысты, і драматургічная тканіна засталася рванай.

Яшчэ больш ірвецца яна з-за ўвядзення ў спектакль устаўнога нумара — фламэнка, пастаўленага Аленай Аліпчанка (астатняя харэаграфія — Юліі Дзятко і Канстанціна Кузняцова). Гэта не было прадугледжана ні першай аўтарскай рэдакцыяй, ні другой — Эрнэста Гіро, які замяніў размоўныя дыялогі музычнымі рэчытатывамі і дабавіў крыху іншай музыкі Жоржа Бізэ. Можна, канешне, радавацца, што нашы артысты хору вывучылі і спраўна паўтараюць неабходныя рухі, што аркестр можа адпачыць, пакуль пануе стыхія рытму. Але ў тым і розніца, што ў Іспаніі фламэнка — у крыві і паветры, а ў нас — у кшталтаванні рэпетыцыямі, дзе яшчэ не дасягнута тая свабода выканання, што здараецца на дыскатэках (для іспанцаў і дагэтуль фламэнка — што вальс для венцаў: “абавязковы” побытавы танец, якому ў сем’ях навучаюць дзяцей, ледзь тыя ўсталі на ножкі). Дый “дзірка” ў партытуры атрымліваецца — драматургічна не абаснаваная: дзеля відовішча.

На цыганаў і вайскоўцаў разлічыся

Па-другое, паралелі з Далі ўзнікаюць з-за вобразу самой Кармэн, якой не стае чагосьці вельмі істотнага. Звычайна гэту гераіню немагчыма ні з кім пераблытаць. Яна настолькі рэзка вылучаецца сярод астатніх працаўніц цыгарэтнай фабрыкі, што адразу, ледзь толькі з’яўляецца на сцэне, не пакідае ніякіх сумневаў, чаму ўсе мужчыны глядзяць на яе, а не на іншых. Таму і адзенне ў яе часцей чырвонае, каб ажно рэзала вока. У новай пастаноўцы нічога гэтага няма. З’яўляецца яна ў чорным — на фоне астатніх у шэрым, і нічым асаблівым (найперш, шалёнай унутранай энергетыкай, экстравагантнасцю ці, наадварот, сэксапільнай вытанчанасцю) не прыцягвае. Можа, так адбываецца яшчэ і таму, што Аксана Волкава, наша сусветна прызнаная выканаўца гэтай партыі, у пастаноўцы пакуль не ўдзельнічала: у чарговы раз была на замежных гастролях, таму рэпетыцыі і прэм’ера прайшлі без яе. Рэжысёр Галіна Галкоўская ўвогуле прызналася на прэс-канферэнцыі, што нават не ведае, як паставіцца прымадонна да новай версіі.

Аксана Якушэвіч, якая спявала абодва прэм’ерныя спектаклі, і Крыскенція Стасенка, якую давялося пачуць на генеральным прагоне, стараюцца з усіх сіл: спяваюць, іграюць, танчаць — здараецца, усё адначасова. Але менавіта з-за той стараннасці ў пэўных месцах узнікае адчуванне ненатуральнасці. Можа, нязмушанасць выканання, адчуванне асалоды ад яго з’явяцца пазней?

Сярод плюсаў трэба адзначыць выкананне Эдуарда Мартынюка — адзінага пакуль у партыі Хазэ, Таццяны Гаўрылавай і асабліва Настассі Масквіной, якая акцэнтуе развіццё характару Мікаэлы (Алена Бундзелева, на жаль, малюе гэтую гераіню звычайнай “шэрай мышкай” — і знешне і вакальна), а таксама ўсіх трох цудоўных Тарэадораў: Уладзіміра Громава, Уладзіміра Пятрова, Станіслава Трыфанава. Незалежна ад розных складаў, вельмі добра гучыць найскладаны квінтэт кантрабандыстаў, хаця самі іх вобразы не такія каларытныя, як гэта часцяком бывае.

Дзе ў канцэпцыі канцы?

Па-трэцяе, ідэя спектакля. Безумоўна, пастаноўка мае сваю канцэпцыю, неаднаразова выкладзеную рэжысёрам на паперы і ў вусных прамовах: маўляў, гэта не жыццёвы шлях гераіні, а этапы шляху яе смерці, дзе вельмі важнай аказваецца тэма веры ў Бога. Вось толькі “не чытаецца” гэта ў самой пастаноўцы! Так, у час тэмы лёсу ва ўверцюры па сцэне праходзяць манашкі, Мікаэла ўпершыню з’яўляецца, выходзячы з касцёла. Але ж як развіваць гэту тэму далей, калі музыка для яе не была прызначана?

Нявызначанасць, супярэчлівасць жанравай асновы не прыводзіць да магчымай ідэі сінтэзу. Майстар тонкага псіхалагізму, Галіна Галкоўская не заўжды ўпэўнена пачувае сябе ў масавых сцэнах. Разгублены і артысты хору з мімансам, часам бессэнсоўна рухаючыся па сцэне, не ўкладаючы ў сваіх персанажаў чалавечыя лёсы і характары. І хаця хор, як заўжды, спявае добра (хормайстар Ніна Ламановіч), паводле “карцінкі” атрымліваецца звыклая масоўка, а дзе і статычнасць. Асабліва гэта тычыцца апошняй карціны, дзе хор, быццам у старажытнагрэчаскай трагедыі, застаецца знешнім сузіральнікам дзеі, ніяк не рэагуючы на канфлікт паміж былымі палюбоўнікамі.

Затое чытаецца іншая ідэя — усюдыіснасці паказанай гісторыі, ледзь не блукання па стагоддзях. У першы момант уражвае сцэнаграфія, вырашаная з улікам модных тэндэнцый сучаснага напрамку гіперрэалізму (мастак-пастаноўшчык — Ганна Контэк з Фінляндыі). Маленькая па памерах плошча, ад якой разыходзяцца вузенькія касыя вулкі. Двухпавярховыя дамы, касцёл. Сапраўдная Іспанія! Тыповая, абагульненая, без канкрэтнай прывязкі да рэальнай цыгарэтнай фабрыкі ў Севільі, у памяшканні якой цяпер знаходзіцца навучальная ўстанова. Раптам пачынаеш разумець, што ж вымушае “не верыць” усёй гэтай пазнавальнасці іспанскіх гарадскіх відарысаў, успрымаць іх не больш чым “лялечнымі” дэкарацыямі з эстэтыкай галівудскіх мультфільмаў. Усе збудаванні залішне прыгожанькія, быццам намаляваныя ці пасля грандыёзнага рамонту — новенькія, як з іголкі зняты. Іспанцы ж не надаюць асаблівай увагі знешняму антуражу, спрадвеку жывуць у старых будынках, для іх галоўнае — унутранае начынне жытла, утульнае, зручнае, функцыянальнае, без пылу ў вочы, як здараецца ў нас.

Нейкай адметнай канцэпцыі не адчуваецца пакуль уласна ў музычнай інтэрпрэтацыі. Усё гучыць, збольшага, зладжана, з добрым балансам галасоў і інструментаў. Але… не больш за гэта. Нават з мінімумам кантрастаў, якія так і просяцца на паверхню. А між тым, некалькі гадоў таму дырыжор Андрэй Галанаў казаў мне, што ўспрымае “Кармэн” не столькі операй, колькі прадвесніцай мюзікла. На гэта, маўляў, указвае нумарная структура з размоўнымі дыялогамі, амаль эстрадная “хітовасць” абсалютна ўсіх нумароў, сярод якіх папросту няма непапулярных. Адсутнасць жа невядомых у 1870-я джазавых павеваў з ліхвой кампенсуецца іспанскім каларытам, які ўтрымлівае не менш унутранага нерва, энергетыкі і нават “харызмы”. Чым не цікавая ідэя? Зноў-такі, рэалізаваная пакуль на словах, а не ў музычным выкананні, дзе, як адзначалася вышэй, не адбудавана адзіная драматургічная лінія, якую не змогуць парушыць ніякія сцэнічныя размовы. Асабіста ў мяне ёсць некаторыя сумневы і ў сапраўдным, а не ўяўным паразуменні між рэжысёрам і дырыжорам. Бо тая ж змена дэкарацый не паміж першай і другой дзеямі, а ў пачатку другой відавочна замінае музыцы скрыпам-грукатам.

У цэлым, пастаноўка ўспрымаецца як традыцыйная. Героі не кранаюць настолькі, каб ім суперажываць. І не ўзрушваюць нечаканасцю, якая вымусіла б пераасэнсоўваць вядомую гісторыю. Але спектакль, безумоўна, будзе карыстацца вялікім попытам гледачоў, а таксама шматлікіх запрошаных салістаў. Бо яго традыцыйнасць не будзе вымушаць ні тых ні гэтых асабліва задумвацца ні пра выкладзеныя ў оперы калізіі, ні пра супярэчлівасць характараў яе герояў. К

Мастыхін

“Разгарнуць гранат” у лімонны свет

Пачатак жніўня ўзрадаваў аматараў мастацтва адкрыццём адразу дзвюх выставак — “Неба” Аляксандра Сільвановіча з Гродна і “Свет. Прастора. Час” віцебскага мастака Аляксея Пшанко. Мастакі маюць магчымасць сваімі ўласнымі сродкамі завуаляваць ці наўпрост паказваць рэальнасць. Альбо ствараць свой свет — фантазійны ці, абапіраючыся на гісторыі і легенды, “рэканструяваны”. У любым выпадку твор будзе з’яўляцца своеасаблівым кодам з сімвалаў і вобразаў.


Аляксандр Сільвановіч. "Гульні з гранатам".

У сталічным Палацы мастацтва экспануюцца работы Аляксандра Сільвановіча, ідэйнай канцэпцыяй якіх з’яўляецца аддзяленне зямлі з яе паслядоўнасцю жыцця ад неба — той сферы, куды скіраваны нашы надзеі і мары. Праз устойлівыя, вытрыманыя стагоддзямі сімвалы, міфалагічныя і казачныя вобразы Аляксандр Сільвановіч перадае прысмак мінулага. Ён быццам бы аднаўляе міфы, гісторыі, легенды, знакі, усё тое, што людзі ведаюць на падсвядомым узроўні, і з дапамогай тэхнікі, асабістага яркага стылю надае гісторыі новае гучанне. Ягоныя работы — гэта сінтэз гісторыі, фальклору, жывапісу і скульптуры. Аляксандр Сільвановіч зачапіўся за самае ўстойлівае ў культуры, за тое, што захоўвае сваю непаўторнасць, за тое, што можа толькі пераходзіць у іншыя формы выказвання, але не растае ў іх.

Хочацца вылучыць тыя работы, якія ўразілі не столькі тэхнікай (а працуе мастак, у асноўным, у змяшанай тэхніцы, а таксама з дрэвам), колькі зместам і формай. Трэба яшчэ адзначыць, што ў творах гэтага члена Беларускага саюза мастакоў больш дызайнерскага, чым жывапіснага, прызначанага, на маю думку, для вялікіх сонечных памяшканняў. Работа “Лесвіца”, як падаецца, сімвалізуе жыццё першабытных людзей. Самае цікавае, што новы дзень на гэтай “лесвіцы жыцця” пачынаецца з рассвіту — аднаўлены дзень пераходзіць у новы стан. Хочацца верыць, што лесвіца паказвае праўду, і заўтра будзе лепей, чым сёння!

У творах мастака з Гродна шмат цеплыні і адкрытасці. Скажам, серыя “Гульні з гранатам” уразіла сваёй прастатой і нестандартнасцю. Аляксандр Сільвановіч адмыслова “разгарнуўшы” гранат, пераўтварыў яго ў матылька, крыж, гадзіннік і зорку.

Код жыцця і энергія колераў


Аляксей Пшанко. "Прастора і час".

Мастацкая ж галерэя “Беларт” прадставіла работы мастака з Лепеля Аляксея Пшанко — “Свет. Прастора. Час”. Кожная работа — лімонны, салатавы, апельсінавы свет, у якім казка і рэальнасць пераплятаюцца ў адно. Яркія, выразныя творы, крыху з іроніяй, паглынаюць гледача. На карцінах Аляксея Пшанко — і любімы горад з закаханымі па яго вуліцах, і вобразы, быццам узятыя з твораў Босха… Ёсць свая філасофія ў карціне “Прастора і час”, дзе прастора — матэрыяльнае, выяўленае ў кубах, а час — светлы, неадчувальны шлях. Гэта работа прымала ўдзел у мінскім мастацкім біенале ў 2014-м.

Творы Пшанко яднаюць яркія фарбы, а значыць, мастак хоча ўздзейнічаць на эмоцыі гледача. Але не ўсё так проста, як здаецца на першы погляд. Варта “аддзяліць” колеры ад сэнсу жывапісных работ, як разумееш, што закладзеныя вобразы і думкі мастак “прыкрывае” фарбамі… І як бы ярка яны не “гучалі”, ад іх усё роўна выходзіць неспакой і трывога, бо Аляксей Пшанко падымае “нерухомыя” тэмы.

Вольга РОПАТ,
студэнтка Інстытута журналістыкі БДУ

А&В: Аўдыя & Відэа

ТЭКСТ

Алег КЛІМАЎ, спецыяльны карэспандэнт "К"

Зміцер САСНОЎСКІ, гурт “Стары Ольса”

Ліпеньскія аўдыя/відэаработы айчынных выканаўцаў рэцэнзуюць лідар гурта “Стары Ольса” Зміцер САСНОЎСКІ (А.) і спецыяльны карэспандэнт газеты “Культура” Алег КЛІМАЎ (В.).

АЎДЫЯ

Гурт “Кашлаты Box”, сінгл “Цябе/Падарунак”

А.: Калісці даўно стаялі мы з Уладзем Наважылавым (гурт “Gods Tower”) і мірна размаўлялі на адной з вуліц Гомеля. Па-беларуску. Наводдаль мясцовыя хлопцы пілі і гучна лаяліся. Чарговыя мінакі звярталі ўвагу на нас беларускамоўных, а потым на іх, “хуліганамоўных”. Уладзь тады выказаў думку, якая не выходзіць у мяне з галавы ўжо гадоў дваццаць: “Для паўнаты жыцця нам вельмі патрэбны беларускамоўныя хуліганы! Давай пахуліганім!..”

Нібыта і ёсць рацыя ў тым, што панкі спяваюць па-беларуску, але ў музычным плане мяне зацікавіла хіба партыя дуды (беларускай валынкі). Астатняе выклікала бадай здзіўленне. Самі ўдзельнікі гурта называюць сваю музыку “амаральнай”, але — “пра сапраўднае каханне”. Гэта даўно заезджаная тэма пра панка, які шчыра закахаўся ў высокамаральную выдатніцу. Беларускамоўная каляровая варыяцыя пра Жыгана і “Дзевачку-пай”. “Інтымная споведзь”, як кажуць самі музыканты. А па-сапраўднаму музыку ўсе любяць якраз за тое, што яна дае найлепшы сродак выяўлення сябе непадобнага. Вось такія ў нас ёсць музыканты, якія хочуць па-свойму ствараць! Павар’яцеем на канцэртах!

В.: Прыпанкаваны рок для тынэйджараў. Для слэму самае тое. У якасці разыначкі — фрагментарныя гукі дуды, што рэзануюць з лідарорам. Наогул, вось такой абсалютна вызваленай музыкі ў нашай альтэрнатыве не занадта шмат, калі граецца па меры магчымасцей, спяваецца, як умееццa, як галасавыя звязкі дазваляюць. Але адсутнасць майстэрства, прафесіяналізму кампенсуецца драйвам, адрывам, азартам, свабодай. Цікава было б зірнуць на вялікае “жывое” выступленне каманды хаця б на гадзінку: наколькі яе хопіць, ці здолее ўтрымаць публіку, ці ёсць канцэртны рэпертуар, ці ёсць зачэпкі?

Гурт “Shuma”, альбом “Zhnivo”



А.: Я не здольны аб’ектыўна ацэньваць тое, што робіць Руся. Яе голас — гэта залежнасць... Гэта невытлумачальная мегасімпатыя! Я не аб’ектыўны яшчэ і таму, што люблю беларускі фальклор. Шмат гадоў зайздросціў многім краінам, якія дараслі да электроннага прачытання свайго фальклору. Зараз маем такое і мы! Бясконца радуе густоўная “ўрбанізаваная” падкладка пад народнымі спевамі. Руся — ліпка, вакол якой, нібы пчолкі, раяцца таленты. Вочы яе мне заўжды нагадвалі вочы старога прафесара — упэўненыя, удумлівыя, з нейкімі нахабнымі чорцікамі, яны нібыта носьбіты вялізарнай колькасці думак. Яны паказваюць, што ведаюць шмат, але ці варта прамаўляць. Яе спеў — адлюстраванне яе вачэй і свету. Не дзіва, што добрыя журналісты ў інфармацыі пра альбом “Zhnivo” змяшчаюць здымкі Русі, дзе выразна праглядаюцца вочы.

“Zhnivo” — моцнае і шчырае музычнае “чытво”. “Смычком па камені”! Непераадольная сімпатыя!

В.: І так можна адаптаваць народную музыку да рэалій сённяшняга песеннага мастацтва: з дапамогай укіду яе ў электроншчыну. Глабальных адкрыццяў калектыў не зрабіў, перавароту ў культурнай прасторы не зрабіў, а бярэ ён якасцю, прафесіяналізмам і, натуральна, густам. Як сказала аднаму са СМІ Руся — ідэолаг праекта і яго вядучы голас: “Наша задача — стаць класным папулярным гуртом”. Пытанняў да гэтай сентэнцыі ў мяне ўзнікла адразу два: што значыць папулярным і дзе стаць? Адказваць за ўдзельнікаў ансамбля пачну з пытання другога. Стаць на радзіме і ў постсавецкіх краінах? Не стане, бо гэта — не “7.40”, скажам. Удзел — нячастыя непапсовыя фэсты і нерэгулярная клубная дзейнасць. Папулярным — каб бясконца круцілі па ТБ і на радыё (у тых жа прасторавых межах)? Не будзе: зноў жа — не тая папулярнасць зыходнага матэрыялу. А таму адносную папулярнасць (у сілу канкрэтнай фальклорнай экзотыкі ды ў электроннай абгортцы) “Shuma” можа займець там, дзе ідэя такога аб’яднання і падалася вартай увагі, — “за бугром”.

Гурт “Pawa”, альбом “Zyta”

А.: У адрозненне ад гурта “Shuma”, які пераасэнсоўвае фальклор, гурт “Pawa”, на маю думку, застаецца фальклорным гуртом, дзе электронныя інструменты выконваюць хіба ролю дадатку і насычэння гуку, але ніяк не самастойнай творчай адзінкі. Вядома, гэты погляд музыкантаў варты павагі. Вось так яны бачаць сучаснае жыццё беларускіх народных спеваў.

Чамусьці не пакідае ўражанне, нібыта ў аранжыроўках праглядаецца навязлівае жаданне спадабацца слухачу. Варта, вядома, прымаць да ўвагі густы публікі, але такім чынам можна патрапіць у балота — у залежнасць ад чужых сімпатый. Усе гэтыя “хоп-хоп-хоп!”, “хэй-хэй-хэй!” цягнуць на прыпеўкі з гармонікам. Ды і электронныя падкладкі мала таго, што адносяцца да 1970-х, дык яны ў “Pawa” вандруюць з рэлізу ў рэліз. А вось карыстанне з гармоніі “Rammstein” (кампазіцыя “Zastukacieli, Zahrukacieli”) мне здалося зусім бяздумным.

Магчыма памыляюся: “Pawa” мне падабаецца, але ў альбоме “Zyta” мала смелых эксперыментаў. А менавіта правакацыі і “выхадкі” рухаюць музыкантаў наперад. Асабіста для мяне, гэта музыка не для праслухоўвання. Пад “Pawa” патрэбна танчыць, слухаць іх са сцэны, глядзець на іхныя артыстычныя паводзіны! Гэта і раблю з задавальненнем шмат гадоў. І ўсім раю!

В.: Гурт выдаў роднасны “Shuma” па жанры альбом (звярніце, дарэчы, увагу на назвы абедзвюх работ!) — восем кампазіцый, вытрыманых у фолктронік-стылістыцы. Капала каманда таксама глыбока, прадставіўшы ў рэлізе першаснову розных беларускіх рэгіёнаў у сучаснай апрацоўцы, выкарыстаўшы магчымасці электронікі і “жывых” інструментаў. Але ў адрозненне ад калектыву Русі, гэтая каманда мае больш шанцаў стаць папулярнай, па меншай меры, у нашай краіне, па меншай меры, тымі сваімі трэкамі, якія збольшага адпавядаюць радыйнаму масаваму фармату і вячэрняму фестывальнаму угару (ва ўсякім выпадку, рэчаў пяць можна смела нон-стопам уключаць у сэт-ліст любога этна-мерапрыемства (нават з цяжкай музыкай!) на адкрытым паветры, якое мае на ўвазе танцы). Што зусім не кажа аб іх прымітыўнасці, легкаважнасці… папсовасці: усё зроблена (спета, згуляна, саранжыравана, сабрана) дыхтоўна, удумліва, акуратна, проста цікава.

ВІДЭА

Гурт “Play4May”, кліп на песню “Запалі”

А.: Пафас. І ў музыцы, і ў тэкстах, і ў відэа, і ў сюжэце. Так усюды! Ненавіджу пафас і закаханасць “у сябе таленавітых”. Калі хлопцы разумеюць, што толькі вучацца і што гэта толькі першыя прыступкі росту, — можа быць. А калі яны шчыра прамаўляюць гучна: “альтэрнатыўная каманда”, “падтрымка свайго другога альбома” — я супраць. Якая альтэрнатыва?!. Альтэрнатыва чаму? Звычайны набор інструментаў, стандартныя аранжыроўкі, звычайны вакал, прасценькая мелодыя, пачатковыя артыстычныя здольнасці, сюжэт кліпа... Хлопцы, рок-музыка — гэта кацёл! Згодны ў ім варыцца, шалець і “грабаць” клюшнямі — скачыце! А калі хочаце адразу хадзіць паверсе і ўзбіваць пену — тупік.

“У кожнага героя існуе свой ілюзорны свет, дзе ён спрабуе разабрацца з думкамі, якія яго грызуць, каб нарэшце адпусціць іх і спаліць цяжкія ўспаміны назаўжды”, — з інтэрв’ю вакаліста “Play4May”. Гэта вельмі нагадала незабыўнага Курта Кабэйна! “Касіць” пад куміра, вядома, можна, але творча!

А наогул, радуе, што хлопцы не сядзяць перад кампом, ня ціснуць крэсла, а тузацца, носяцца, скідаюцца грашыма, наймаюць, здымаюць, ствараюць! У дарогу! Калі без пантоў і пафасу — я за вас!

В.: Героі кліпа — музыканты гэтага баранавіцкага калектыву, якія ў розных інтэр’ерах пра нешта думаюць, чагосьці чакаюць, кудысьці ідуць і на штосьці глядзяць. Мабыць, знаходзяцца ў чарговых пошуках уласных “я”, калі да здзяйснення ўчынку, вядома, лёсавызначальнага застаюцца лічаныя хвіліны. Але што будзе далей, калі яны зробяць крок у невядомае? І ці трэба яго рабіць, калі за дзвярыма — граблі, напрыклад? Зрэшты, партал той знаходзіцца ў чыстым полі, і няма чаго сумнявацца і прыдумляць сабе адгаворкі, калі рубеж гэты — ілюзорны, хоць і цалкам рэчыўны. І вось ужо дзверы гараць, масты спалены. Да наступнай мяжы. (Напрошваецца, каб на рэальных дзвярах, тых, што ў кліпе, камера буйна ўзяла лагатып іх вытворцы. Але спонсары ў вырабе роліка ўдзелу не прымалі.) Якаснае відэа, без асаблівай “завумі”, якраз прыдатнае для падтрымкі трэка. У самім жа ім прыкметны ўплыў “хрыпуноў” з канадскай брыгады “Nickelback”, якая праславілася выкананнем рэзкіх і меладычных песень.

Сёння ў **Брагінскім гістарчным музеі** пройдзе шэраг мерапрыемстваў, прысвечаных мінуўшчыне горда.

"Кроў" кепска Справа ў

Вакансіі, вакансіі, вакансіі: прынада для спецыялістаў

(Заканчэнне. Пачатак на старонцы 1.)

Галіна Балінская:

— Не пагаджуся з гэтым катэгарычна! Калі малады спецыяліст хоча мець прыстойны заробак, ён яго будзе мець. Можна і на дзве стаўкі працаваць. А ёсць яшчэ праца па дамове, выкананне нейкіх разавых заданняў… Аднак гэта напружаная і адказная дзейнасць. Але калі шчыры хлеб быў лёгкім?

Яўген Рагін:

— Ну і колькі пры такой напружанасці можна зарабіць у месяц?

Галіна Балінская:

— І пяць мільёнаў рублёў рэальна. Але гаворка пра тых, хто хоча працаваць, а не лайдачыць.

Яўген Рагін:

— Няўжо гэта паказальная ды сталая сітуацыя па вобласці, калі кіраўнікі сельгаспрадпрыемстваў не зважаюць на кватэрную нішчымніцу сельскіх работнікаў культуры?

Галіна Балінская:

— Калі была на размеркаванні выпускнікоў у Гродзенскім дзяржаўным каледжы мастацтваў, дык па-добраму пазайздросціла аддзелам з Гродзенскага і Навагрудскага раёнаў. Яны абяцалі сваім патэнцыйным маладым спецыялістам канкрэтнае жыллё.

Яўген Рагін:

— Насамрэч, даволі дзіўная па нашым часе справа. Варта пра гэта больш падрабязней даведацца. Як сітуацыя вырашаецца, скажам, на Навагрудчыне?

Марына Шабановіч:

— Няма тут ніякіх складанасцей. Па рашэнні мясцовых уладаў у нас існуе сталая дамоўленасць з прадпрыемствамі Навагрудка на тое, каб яны выдаткоўвалі нам месцы для работнікаў культуры ў сваіх інтэрнатах. Сёлета да нас паступілі чатыры маладыя спецыялісты, два з іх мелі патрэбу ў жыллі. Яны яго атрымалі. У гэтым годзе таксама ў Дзіцячую школу мастацтваў чакаем шэсць маладых спецыялістаў. Трое ўжо пацвердзілі сваё прыбыццё на першае месца працы. Кожны з іх атрымае пры патрэбе месца ў інтэрнаце. Можа хто не ведае, а ў нас ёсць асобны гарадскі інтэрнат для маладых спецыялістаў. Дык вось летась у ім атрымалі пакоі бібліятэкар, два спецыялісты РДК, настаўнік ДШМ… Хтосьці хоча, да прыкладу, здымаць кватэру. Калі ласка, у адпаведнасці з калектыўным дагаворам і пры наяўнасці адпаведных дакументаў ад домаўладальніка мы дапамагаем з частковай аплатай такога жытла.

Яўген Рагін:

— Такі ж ажур і на сяле?

Марына Шабановіч:

— Па раёне мы стаўку робім на мэтавікаў. Пасля навучання дзве такія выпускніцы вярнуліся ў Ладзенікі і Любчу. Абедзве — клубныя работніцы. Жыць захацелі ў бацькоў. Але і той, хто не мае такой магчымасці, могуць разлічваць на пакой у інтэрнатах СВК. На стварэнне такіх інтэрнатаў таксама ёсць дамоўленасць з сельгасвытворчымі кааператывамі.

Яўген Рагін:

— Усё ж пакой у інтэрнаце — не кватэра… Цудоўна ведаю, што мінулае не вернецца, але не магу не згадаць, як у Глыбокім гаспадарчая група аддзела культуры ў райцэнтры будавала для бібліятэкараў ды клубнікаў нават не дом, а дамы. Цяпер на гэта, напэўна, ніхто не адважыцца…

Сяргей Кончыц:

— Безумоўна, не адважыцца! Ідэалістаў, напэўна, ужо няма. А раней ніхто амаль не глядзеў, ці ёсць, скажам, належная ды ў поўным аб'ёме дакументацыя на тую ці іншую забудову. Тое ж тычыцца і зямельных участкаў, якія займалі тыя забудовы. Таму сёння, калі ў выніку аптымізацыі нам трэба прадаць праз аўкцыён, да прыкладу, старэнькі будынак сельскага клуба, узведзенага немаведама калі, узнікаюць вельмі сур'ёзныя праблемы… Вы ж цудоўна ведаеце, што перад тым як распачаць будаўніцтва жылога дома, неабходна правесці экспертызу, геадэзічныя вышукі, скласці праектна-каштарысную дакументацыю… І гэта выліваецца ў немалыя, мякка кажучы, выдаткі. А раённы бюджэт распісаны літаральна да капейкі. Так што іншым разам пэўныя святы імкнемся правесці ў раёне за кошт пазабюджэту… Словам, будаўніцтва жылля ў нас пакуль спынена.

Яўген Рагін:

— Спецыялісты аддзела паведамілі, па Веткаўшчыне — 11 вакансій работнікаў культуры. Пяць — па сельскіх і вельмі аддаленых філіялах ДШМ, два — па аддзеле (у тым ліку эканаміст у дэкрэтным адпачынку), астатнія — самыя розныя пасады і таксама па аддаленых вёсках (палова таксама ў дэкрэтах, значыць — вернуцца). Натуральна, маладых спецыялістаў туды не загнаць. Для раёна, пацярпелага ад чарнобыльскай бяды, — справа ці не натуральная.

Сяргей Кончыц:

— Нейкія стымулы тут, сапраўды, цяжка падабраць. Але як бы там ні было, кадравае пытанне вырашалі, вырашаем і будзем вырашаць.

Яўген Рагін:

— Цікава было б даведацца пра, так бы мовіць, тэхналогію выхавання маладога спецыяліста. Гэта, напэўна, будзе і алгарытм ягонага замацавання на першым месцы працы?

Наталля Сінюковіч:

— У пэўнай ступені так. Першая ўмова — прадастаўленне жылля: арэнднага — на льготных умовах, інтэрната. Другая звязана з псіхалогіяй, з выхаваўчымі, вельмі далікатнымі нюансамі. Трэба каб чалавек адчуў сябе ў калетыве камфортна, зразумеў, што ён — патрэбны. Кожнаму маладому неабходны дасведчаны куратар, бо ніводная ВНУ не дае навыкаў імгненнага творчага поспеху. А маладыя цяпер — гранічна амбіцыйныя. І гэта нас не павінна раздражняць нейкім чынам. Наадварот, амбіцыйнасць нядаўняга выпускніка пры правільным падыходзе да справы літаральна праз тры-чатыры месяцы пераўтвараецца ў канкрэтныя і вельмі цікавыя праекты. Пераконвалася ў гэтым неаднаразова… Трэцяя ўмова: да маральнага стымулявання абавязкова дадаць і стымул матэрыяльны. Маю на ўвазе прэміяванні, сумяшчэнні ставак… Толькі ў такім выпадку чалавек прырастае да справы, да калектыву, перакананы, што ў ліку іншых робіць выключна важную справу… Такія не з'язджаюць, такія цягнуць сваю ношку, не зважаючы ні на што…

Яўген Рагін:

— Цяжка не пагадзіцца. Толькі так, напэўна, з'яўляюцца сапраўдныя адмыслоўцы, на якіх і трымаецца наша нацыянальная культура… Тут да месца аказалася б меркаванне нядаўняга маладога спецыяліста, нямэтавіка, які застаўся на сваім першым рабочым месцы і пасля абавязковай адпрацоўкі…

Кацярына Гранік:

— Я культуролаг. Скончыла Універсітэт культуры і мастацтваў у 2010-м. Трапіла ў Дзяржынскі раён, спачатку кіраўніцтва аддзела хацела, каб я працавала ў Фанапалі мастацкім кіраўніком. Але, пасля сумоўя, вырашылі пакінуць мяне ў Дзяржынску. Так я і стала метадыстам. У першы дзень працы напаткаў мяне сапраўдны шок. Ва універсітэце мяне вучылі зусім іншаму. Але ж я — магістр-даследчык: хутка асвоілася. Вельмі дапамагла дырэктар метадычнага цэнтра Лідзія Драчынская. Паколькі я яшчэ пад час навучання працавала з інтэрнатаўскімі дзецьмі, была культарганізатарам, дык у сваёй метадычнай дзейнасці абрала працу з непаўнагадовымі і цяжкімі падлеткамі. Дапамагала наладжваць адпаведную работу гурткоў на раёне. Так нарадзіўся праект "Мая сям'я", у выніку якога мы ўзялі пад кантроль лёс дзяцей. Пераважная большасць іх цяпер займаецца ў самых розных клубных фарміраваннях. Ці не з першага месяца мне пачалі даплачваць. А праз год з невялікім я атрымала першыя прэмію і грамату…

Сяргей Кончыц: "Райбюджэт распісаны да капейкі. Так што будаўніцтва жылля ў нас **пакуль спынена**".

Галіна Балінская: "Да пачатку 1980-х адносяцца, бадай, **апошнія выпадкі,** калі работнікі культуры Ашмяншчыны займелі бясплатнае дзяржжыллё".

Кацярына Гранік: "Здымаем кватэру. **Атрымаць арэнднае жыллё** за 600 тысяч рублёў у месяц пакуль не ўдаецца. Але спадзеў не губляем".

Галіна Валозіна: "Ніхто ў нас на вуліцы не жыве. На сёння **нават пакой ў гарадскім інтэрнаце ёсць.** Натуральна, пуставаць не будзе…"

На людным месцы: аглядавая пляцоўка

Мір — Мінск /

Калі сябруюць музеі

8 жніўня Беларускі дзяржаўны музей гісторыі Вялікай Айчыннай вайны наведалі супрацоўнікі музея "Замкавы комплекс "Мір". Дэлегацыю ўзначаліла старшыня прафкама комплекса Таццяна Галавач.

Вольга Каласоўская,Таццяна Сілко, Вольга Варанко і іншыя распавялі мінскім калегам пра тое, што цяпер Замкавы комплекс з'яўляецца гісторыка-культурным помнікам, асветніцкай і адукацыйна-выхаваўчай установай. Тут створаны сучасны турыстычны цэнтр. Адначасова музей ажыццяўляе навукова-даследчую і выдавецкую дзейнасць, аказвае комплекс платных паслуг.

Госці з Гродзеншчыны падзяліліся вопытам работы па традыцыйным правядзенні на канцэртных пляцоўках Замкавага комплексу музычных і рыцарскіх фестываляў, святаў мастацтваў і расмесніцкай творчасці, лекцый, музейных заняткаў…

Супрацоўнікаў Музея гісторыі Вялікай Айчыннай вайны зацікавіла і работа па выкарыстанні найноўшых тэхнічных дасягненняў пры рэалізацыі маштабнага праекта "Музычныя вечары ў Мірскім замку".

У сваю чаргу нашы навуковыя работнікі Наталля Юрасёва (дарэчы, працавала яна раней у Замкавым комплесе "Мір"), Уладзімір Касцюковіч, наглядчыкі Аляксандра Саннікава, Антаніна Гашэўская распавялі пра сваю навукова-асветніцкую дзейнасць, пра выкарыстанне ў мэтах патрыятычнага выхавання магчымасцей Залы Перамогі, выставачных плошчаў, канферэнц-залы, а таксама ролю ў названым працэсе Драматычнага тэатра Беларускай арміі, Акадэмічнага ансамбля песні і танца Узброеных сіл Рэспублікі Беларусь, Студыі ваенных мастакоў, дзіцячых студый выяўленчага мастацтва, калектываў мастацкай самадзейнасці сталіцы.

Супрацоўнікі Замкавага комплексу "Мір" пазнаёміліся з экспазіцыяй Беларускага дзяржаўнага музея гісторыі Вялікай Айчыннай вайны, пакінулі ў кнізе наведвальнікаў удзячны запіс.

Мікалай ШАЎЧЭНКА,
памочнік дырэктара Беларускага дзяржаўнага музея гісторыі Вялікай Айчыннай вайны

Гродзеншчына /

Сэлфі з кнігай

У Гродзенскім раёне стартаваў Бібліякараван-2015 па тэме "Лета. Кніга. Моладзь". Праект разлічаны на абмен во-

Артысты столінскага аўтаклуба.

Падчас "Бібліякаравана" на Гродзеншчыне.

Сёння, пачынаючы а 12-й і да 18-й, на падворку Дома Ваньковічаў пройдзе фестываль **"Мядовы фальварак"**.

Онлайн-канферэнцыя "К": замацаванне кадраў

Інфаграфіка

Замацаванне маладога спецыяліста

жыллё + маральны і матэрыяльны стымулы = самарэалізацыя : праектная дзейнасць + усведамленне ўласнай неабходнасці на першым месцы працы

прыжываецца. кватэры?

Яўген Рагін:

— А як з кватэрным пытаннем?

Кацярына Гранік:

— Спачатку далі пакой у інтэрнаце. А калі пабралася шлюбам, пачалі здымаць прыватную кватэру. Зараз штомесячны кошт такога пражывання ў Дзяржынску дасягае эквіваленту дзвюх соцень долараў. Атрымаць арэнднае жыллё, што каштуе ў месяц 600 тысяч рублёў, пакуль не ўдаецца. Але спадзеў не губляем. Думаю, усё ў нас атрымаецца.

Яўген Рагін:

— Не ўзнікае жаданне з'ехаць?

Кацярына Гранік:

— Я родам з Вілейскага раёна, муж — таксама вясковы, і калі б не ягоны заробак... Мы рабілі і робім сябе самі. Я, да прыкладу, — чалавек творчы і хачу развівацца. У мяне гэта, як кажуць, няблага атрымліваецца. Дык ці варта шукаць лепшай долі? Так што працую ў Дзяржынскім раёне і вельмі люблю сваю працу.

Яўген Рагін:

— Аказваецца, у горадзе атрымаць арэндны прытулак няпроста. Але больш непакоіць жыллёвая сітуацыя на сяле.

Галіна Валозіна:

— Ніхто ў нас на вуліцы не жыве. На сёння нават пакой ў гарадскім інтэрнаце ёсць. Натуральна, пуставаць не будзе... Прыблізна такая ж сітуацыя і па вёсках. З дадатнага боку магу адзначыць, да прыкладу, аграгарадок "Ордаць", дзе нават домік пад інтэрнат адведзены. Жывуць там настаўніцы і наш работнік культуры. Мы яго мэбляй забяспечылі.

Яўген Рагін:

— Ну гэта значыць, што кіраўнік тамтэйшай сельскагаспадарчай арганізацыі ў перспектыву глядзіць і працуе на будучыню вёскі...

Галіна Валозіна:

— Можна і так сказаць. Ніколі не было праблем з жыллём для нашых работнікаў у аграгарадках "Гавяды-Агра", "Заходы".

Яўген Рагін:

— Практыка паказвае, што выйграе ўрэшце той кіраўнік, які стаўку робіць на мэтавае навучанне. Свае, дамарослыя, і з людзьмі кантакт наладжваюць хутка, і не маюць, як правіла, патрэбы ў жыцці.

Таццяна Кавалёк:

— Гэтак мы, у прынцыпе, і робім. У выніку і горад Белаазёрск кадрамі ўкамплектаваны, і па раёне асаблівых праблем няма. Хіба што хто ў дэкрэт выйшаў. Затрымліваюцца і тыя маладыя спецыялісты, якія нарадзіліся не ў Бярозаўскім раёне. Прычына тут простая: ставімся да іх як да родных... Паспрыяла і тое, што два гады таму ў Бярозе здалі сацыяльны пяціпавярховы дом на чатыры пад'езды: усе ахвотныя работнікі культуры атрымалі ў ім жыллё з аднапрацэнтным крэдытам. Але і такая тэндэнцыя ёсць: людзі імкнуцца будаваць уласныя дамы.

Яўген Рагін:

— За савецкім часам, памятаю, былі моднымі Клубы маладых спецыялістаў. І мода ішла ад карысці падобных фарміраванняў. Маладыя людзі з усяго раёна збіраліся і разам з кіраўніцтвам спрабавалі вырашаць свае праблемы, у тым ліку і кватэрныя...

Таццяна Кавалёк:

— У нас кожны кастрычнік збіраецца Маладзёжны форум. Прысутнічаюць на ім маладыя спецыялісты ад культуры, адукацыі, аховы здароўя, сельскай гаспадаркі, а таксама — кіраўніцтва раёна, юрысты, прадстаўнікі жылкамунгаса, банкаўскай сферы... Пры гэтым дзейнічае "свабодны мікрафон". І такі канструктыўны дыялог моладзі вельмі падабаецца.

Таццяна Кавалёк: "Два гады таму ў Бярозе здалі сацыяльны пяціпавярховы дом: **усе ахвотныя работнікі культуры** атрымалі ў ім жыллё з аднапрацэнтным крэдытам".

Людміла Дударава: "Вакансій няма. **Але матэрыяльна падтрымаць маладых,** якія здымаюць жыллё, арганізацыя не можа".

Наталля Сінюковіч: "Да маральнага стымулявання дадаць **і стымул матэрыяльны.** Толькі ў такім выпадку чалавек прырастае да справы".

Яўген Рагін:

— Кадравае пытанне, напэўна, крыху вырашыла і скарачэнне ўстаноў ды работнікаў, праведзенае ў выніку аптымізацыі?

Людміла Дударава:

— Гэта так. У Дубровенскім раёне вясковыя спецыялісты на сёння маюць спецыяльную адукацыю. Вакансій сёлета няма. Але матэрыяльна падтрымаць маладых, якія здымаюць жыллё, наша бюджэтная арганізацыя, на жаль, не можа.

Яўген Рагін

— А ў горадзе маладыя спецыялісты ёсць?

Людміла Дударава:

— У бягучым годзе чакалі чатырох. Прыехалі і працуюць фалькларыст і дырэктар рабочай групы па стварэнні музея. А два астатнія — бібліятэкар і спецыяліст Дома рамёстваў — паступілі ў ВНУ.

Яўген Рагін

— Для тых, хто даехаў, жыллё ёсць?

Людміла Дударава:

— Пакоі ў інтэрнаце ліцэя. Жылы дом ў горадзе толькі закладваецца... Мяне ж іншая праблема хвалюе. У нас ёсць былыя мэтавікі родам з раёна. Гэтыя хлопцы і дзяўчаты, набыўшы адукацыю, змаглі сябе станоўча зарэкамендаваць. Мы забралі іх у райцэнтр. Адзін працуе кіраўніком Цэнтра народнай творчасці, іншыя — бібліятэкары. Дык вось, бацькі іхнія жывуць у вёсках раёна. Дзеці, натуральна, прапісаны ў бацькоў. А вось прапісацца ў райцэнтры ім нельга, бо ў бацькоў хапае квадратных метраў для пражывання. Не вельмі справядліва, пагадзіцеся, калі спецыяліст працуе ў райцэнтры, а жыць змушаны ў вёсцы. Думаю, казус гэты мы вырашым на мясцовым, райвыканкамаўскім, узроўні.

К

Ад рэдакцыі

Мы ў чарговы раз гутарылі сёння пра будучыню нацыянальнай культуры. Якімі б спрактыкаванымі не былі цяперашнія кадры, але маладая змена — больш разваротлівая і амбітная, больш камунікабельная і крэатыўная. Яна свабодна валодае інфармацыйнымі тэхналогіямі, уважліва сочыць за сучаснымі павевамі, ведае, як знайсці падыход да фундатара, як наладзіць праектную дзейнасць і павялічыць пазабюджэт. Так, маладыя (нават вясковага паходжання) кепска ведаюць праблемы сённяшняга сяла, бо доўгі час вучыліся ў горадзе. Іх, натуральна, трэба падтрымаць на першым часе, чула і далікатна, цярпліва і мэтанакіравана. Тады і спрацуе, як сёння прагучала, "псіхалагічны фактар". Хлопцы і дзяўчаты паверацъ, што без іх вёска сканае, а культура не будзе такой яркай і самабытнай...

Гадоў пяць таму малады таленавіты рэжысёр раённага народнага тэатра, што амаль адразу пасля прыезду ў райцэнтр пачаў здзіўляць яркімі прэм'ерамі, быў змушаны прасіць кватэру, калі ў яго нарадзіліся дзеці. Не атрымалася. Не атрымалася і ў наступным раёне. Рэжысёр, наколькі ведаю, адышоў ад справы, тэатрам не займаецца, але жыве ў Мінску. Шкада? Шкада!

На людным месцы: аглядавая пляцоўка

Падчас наведвання Музея гісторыі Вялікай Айчыннай вайны калегамі з Міра.

пытам, павышэнне кваліфікацыі, прафесійных зносін, укараненне нетрадыцыйных форм працы з дзецьмі і моладдзю.

Шлях пачаўся з наведвання Луцкаўлянскай сельскай бібліятэкі — інфармацыйна-экалагічнага цэнтра. Юныя чытачы сустрэлі гасцей флэшмобам "Чытаем кнігі аб прыродзе", запрасілі прыняць удзел у акцыі, падчас якой прапаноўвалася ўпрыгожыць "Цуда-дрэва" рознакаляровымі стужкамі, колер якіх пазначае тэматыку кніг і часопісаў аб прыродзе. Пад адкрытым небам працавала "Бібліячыталачка".

У Індурскай сельскай бібліятэцы ўсіх запрасілі ў фотатэатр "Усміхніцеся! Вы — у бібліятэцы", самыя актыўныя прынялі ўдзел у акцыі "Сэлфі з новай кнігай", у флэшмобе "Чытаць — гэта модна!". Бібліятэкар Адэльскай сельскай бібліятэкі арганізавала для сваіх калег і юных чытачоў краязнаўчую экскурсію, правяла агляд выданняў аб Адэльску. Акрамя таго, бібліятэкары раёна наведалі музей драўляных музычных інструментаў народнага майстра Мар'яна Скрамблевіча.

Караван наведаў бібліятэкі Гродзенскага раена, каб у фармаце свабоднай дыскусіі абмеркаваць актуальныя праблемы бібліятэчнай справы, абмяняцца вопытам.

Усе мерапрыемствы былі арганізаваны ў супрацоўніцтве з работнікамі мясцовых цэнтраў культуры. Завяршыўся праект дыскусіяй "Бібліятэка — тэрыторыя творчасці", падчас якой удзельнікі прыйшлі да высновы, што лета — не "мёртвы" сезон у працы з чытачамі, а час творчасці, фантазіі, актывізацыі ўсіх форм работы. Новыя веды і вопыт калег дапамогуць у далейшай творчай працы і стануць стымулам у рэалізацыі інавацыйных ідэй.

Ганна СІМАНЕНКА,
намеснік дырэктара Гродзенскага раеннага культурна-інфармацыйнага цэнтра

Століншчына / "Ярок" ды "Верасень"

На Століншчыне гэта ўжо традыцыя: як толькі пачынаецца жніво, аўтаклуб спяшаецца ў поле, на збожжатакі з канцэртна-інфармацыйнымі праграмамі і абрадам Зажынак.

Сёлета перад хлебаробамі раёна выступалі народны клуб аматараў песні "Ярок" Раённага арганізацыйна-метадычнага цэнтра і народны фальклорна-этнаграфічны калектыў "Верасень" Рэчыцкага ГДК. З канцэртнымі праграмамі яны пабывалі ў дзевяці гаспадарках. Часам у адной гаспадарцы прапаноўвалі некалькі міні-канцэртаў.

Разам з музычнымі падарункамі ўдзельнікі аматарскай творчасці ўручалі кіраўніцтву гаспадарак першы сноп як знак удзячнасці за вырашчаны ўраджай, даносілі да працаўнікоў лічбы аб засеяных збажыной гектарах, намалоце, ураджайнасці, выніках уборачнай кампаніі па раёне.

Галіна ГАШЧУК
Фота аўтара

Паважаныя чытачы!
Нам цікавае ваша меркаванне па тэмах нумара. **Пішыце** на адрас: 220013, г. Мінск, пр-т Незалежнасці, 77, альбо на электронную скрыню kultura@tut.by, **тэлефануйце** ў рэдакцыю па нумары 8-017-286-07-97, **абмяркоўвайце** на **facebook.com/kimpressby, vk.com/kimpressby, twitter.com/kimpressby, instagram.com/kimpressby**

У Жалудку на Шчучыншчыне 16 жніўня адбудзецца **Фестываль кветак** "На цябе, наша моладзь, надзея".

Тактыка культурнага развіцця

У старадаўнім Навагрудку немагчыма не спалучыць у рабоце публічных бібліятэк гісторыю і краязнаўства, сучаснасць і традыцыі, патрыятызм і культуру. Выставачная дзейнасць, літаратурныя імпрэзы, прэзентацыі і іншыя шматлікія мерапрыемствы адлюстроўваюць векавую славу нашага краю.

У чашы замка

Само месцазнаходжанне Навагрудскай раённай бібліятэкі падказвае тэматыку нашай дзейнасці. Будынку ўжо больш за стагоддзе, побач — былая гандлёвая плошча, а ў ста метрах — муры старажытнага замка, курган бесмяроцця Адама Міцкевіча.

Апошнія тры гады ладзіліся адкрытыя літаратурна-бібліятэчныя пляцоўкі — ствараўся станоўчы імідж кнігі і бібліятэкі. І гэтым летам мы скарысталі магчымасць распавесці турыстам, гасцям горада ды і самі навагрудчанам аб унікальнасці нашай мясцовасці. Тым самым падтрымалі ініцыятыву начальніка аддзела ідэалагічнай работы, культуры і па справах моладзі Марыны Шабановіч па арганізацыі чарговай інтэрактыўнай кропкі ў чашы Навагрудскага замка. Так нарадзілася бібліяпляцоўка "ЧытайГорад".

Наведвальнікаў гістарычнага месца прываблівае экспрэс-выстаўка "Кніжная планета". Тут дэманструюцца кнігі з ілюстрацыямі рэканструяванага Навагрудскага замка. Гэта рэпрадукцыі карцін Віктара Сташчанюка, Паўла Татарнікава, якія даюць магчымасць на месцы ўявіць, як выглядаў замак, колькі тут было вежаў, дзе месцілася замкавая царква. Аматарам інтэлектуальных гульняў мы прапануем паўдзельнічаць у гульні-віктарыне на розыгрыш бібліятэчных флаераў "Навагрудскімі сцежкамі". А па завяршэнні агульнай тэматычнай кампазіцыі кожны можа прыняць удзел у фотапраекце "Літаратурны персанаж": сфатаграфавацца з роставымі фігурамі князя і князёўны.

Летнія чытальныя залы працуюць на пляцоўках Навагрудка ўжо не першы год. Чытальні прадстаўляюць свае паслугі бясплатна і без абмежаванняў па ўзросце, таму наведаць іх можа кожны ахвотны. Тут прадстаўлены мастацкая і перыядычная літаратура для самых маленькіх, для дзяцей старэйшага ўзросту і для дарослага чытача. Ёсць і класічныя творы, і творы сучасных аўтараў.

На пачатку лета на возеры Свіцязь адкрыўся эколага-забаўляльны цэнтр "У гасцях у 12 месяцаў". Тут працуюць казачна-гульнёвая пляцоўка, гарадок майстроў-рамеснікаў. Да ўвагі наведальнікаў — выстаўка-продаж вырабаў народнай творчасці, майстар-класы, пачастунак гарбатай на зёлках... А бібліятэкары запрашаюць наведаць "Літаратурную пляцоўку", на якой артысты ў вобразах Адама Міцкевіча і Марысі дазваляюць дакрануцца да мінуўшчыны. Даспадобны наведальнікам і інтэрактыўная праграма "Свіцязянскі вянок".

Святлана ІВАШКЕВІЧ,
галоўны бібліятэкар аддзела бібліятэчнага маркетынгу Навагрудскай раённай бібліятэкі

Прадпрымальнасць, матывацыя і атракцыі

"Мотальскія прысмакі": праз год перапынку і амаль без прысмакаў

(Заканчэнне. Пачатак на старонцы 4.)

Зазіраючы ў хаты

У Вольгі Рацык захоўваецца тэкстыль трох пакаленняў жанчын яе сям'і: уласныя вырабы, ручнік, што застаўся ад маці, і тканыя творы дачкі. Даматканы тэкстыль у Моталі дасюль "у модзе": да вяселля не ўсе маладыя дзяўчаты ўмеюць сабе наткаць, тады замаўляюць у старэйшых ткалляў абрусы, ручнікі, каб павязаць сватам, "дарожкі", каб пакласці на паднос, з якім сустракаюць маладых, надзежнік пад каравай. Потым гэтыя вырабы захоўваюцца як сямейная рэліквія, у штодзённым жыцці іх не выкарыстоўваюць. Яшчэ ткуць адмысловыя ручнікі, каб пакрываць абразы ці ахвяраваць на царкву.

Калі муж Вольгі Рацык Іван гуляў на вяселлях сваякоў у суседніх вёсках, яму, як аднаму з родных маладога, разам з галоўным сватам, павязвалі праз плячо ручнік, што заставаўся падарункам і памяццю. Таму разам з мотальскімі вырабамі сустракаюцца тышкаўскія, колылскія — геаграфія сваяцкіх сувязяў шырокая.

Што ўражвае: яшчэ на пачатку XXI стагоддзя некаторыя дзяўчаты ткалі сабе для вяселля самі. Не кідалі і выйшаўшы замуж: Ганна, дачка Вольгі Рацык, ткала да 2006 года. Патроху ткаў і брат Ганны Фёдар: "На гатовым верстаце і жаба можа плескаці" — смяецца Вольга Рацык, маючы на ўвазе, што галоўнае — уменне заправіць кросны, а выткаць ужо лягчэй. І зараз шмат у якіх мотальскіх хатах знойдзеш кросны — не сабраныя, дык на гарышчы, але з усімі дэталямі — стаў ды працуй.

Цікава прасачыць эвалюцыю мотальскага тэкстылю: ад старажытнага чырвона-чорнага, з вузенькімі арнаментальнымі палоскамі, да рознакаляровага, з часцейшым і шырэйшым арнаментам, "сніўкамі" — прадольнымі каляровымі палоскамі на белым палатне. Такія "новыя" баваўняныя ручнікі пачынаюць рабіць пасля Другой сусветнай вайны і яны цалкам выціскаюць "старыя" ільняныя прыкладна ў 1970-х. На тканінах з'яўляюцца кветкі, клубніцы, вінаград. Паступова ў браны арнамент уводзяцца элементы, выкананыя тэхнікай закладнога ткацтва. Старыя прыёмы аздаблення канцоў вузельчыкавым пляценнем саступаюць карункам, вязаным шыдэлкам. А у 1980-х пачынаюць "шыдэлкаваць" вырабы ўжо цалкам, па перыметры.

Падчас "Мотальскіх прысмакаў". / Фота Алены ЯХІМОЎСКАЙ

■ Шмат дзе ў глыбінцы можна сустрэць ткалляў, якія трымаюцца рамяства. Такіх жанчын запрашаюць у дамы рамёстваў, на святы народнай творчасці. **Добра, калі з'явяцца пераемнікі сярод работнікаў культуры.** Тады паўстаюць такія асяродкі ткацтва, як Неглюбка, Маларыта. Але сучаснай моды на традыцыйны тэкстыль не сустрэнеш бадай нідзе ў Беларусі, акрамя Моталя.

Шмат дзе ў беларускай глыбінцы можна сустрэць асобных ткалляў, якія трымаюцца рамяства, ставяць кросны. Ці адзін у полі воін? Такіх жанчын запрашаюць у дамы рамёстваў, возяць на святы народнай творчасці. Добра, калі з'явяцца пераемнікі сярод работнікаў культуры. Тады паўстаюць такія асяродкі ткацтва, як Неглюбка, Маларыта. Але сучаснай моды на традыцыйны тэкстыль сярод "звычайных" людзей, не звязаных прафесійна са сферай культуры, акрамя Моталя не сустрэнеш бадай нідзе ў Беларусі. Добра, калі я памыляюся!

У суседкі Вольгі Рацык Ганны Міховіч таксама фатаграфуем тэкстыль, запісваем ад дуэта жанчын каравайныя песні — больш за дзесяць. Колькі ж іх гучала падчас усяго вяселля!

Высвятляем лёс знакамітых мотальскіх кажухоў. Яшчэ пасля Другой сусветнай вайны насілі "жоўтыя", з вышыўкай, такія, як мы бачым у музеях і на фотаздымках Міхася Раманюка. Іх выраблялі ледзь не ў кожнай хаце. Потым у моду ўвайшлі чорныя кажухі без вышыўкі. Іх мотальцы шылі да 1980-х, не толькі на патрэбы ўласнай сям'і, часта і на замову. Амаль у кожнай гаспадыні захоўваецца адзін-два такіх. Кажуць, нехта ў Моталі дасюль займаецца пашывам верхняй вопраткі.

Менш вядомая дэталь гардэробу, якую ў Моталі выраблялі на продаж — хусткі з акрылавых нітак. Амаль любога колеру, яшчэ і сёння "асартымент" у куфрах маталянаў самы шырокі. Гэтыя вырабы глядзяцца ультрасучасна, не адразу іх адрозніш ад турэцкіх ды кітайскіх хустак, што прадаюцца ў мінскіх гандлёвых шэрагах. Заняцца б, раскруціць, як "вышымайкі". Вярнуліся ж ва ўжытак хусткі з кветкамі! Драпіруюць іх самым неверагодным чынам гламурныя модніцы. А яшчэ год пяць—сем таму хіба жанчыны сярэдніх гадоў накідалі на плечы, калі халодна.

Агулам, на фэсце паглядзець ёсць што, але рэкамендуем не цурацца размоў з мясцовымі жыхарамі, слухаць сакавітую мотальскую гаворку. І прыязджаць не толькі падчас фестывалю.

К

Бяспека жыцця

Як перанесці летнюю спёку

Нямногія ведаюць, што гарачыня збірае не менш ахвяр, чым стыхійныя бедствы. Такое надвор'е — стрэс для арганізма. Яна выклікае абязвожванне, абвастрае хранічныя захворванні, вядзе да цеплавога і сонечнага ўдару.

Але калі да гарачага перыяду правільна падрыхтавацца, лета можна перажыць без страт для здароўя. Трымайцеся ў ценю. Калі ёсць магчымасць, перачакайце пік спёкі (з 12 да 16 гадзін) дома. Калі такой магчымасці няма, старайцеся рухацца па зацененых месцах і абавязкова ў галаўным уборы. Скараціце час знаходжання пад прамымі промнямі да мінімуму. Памятайце: гарачыня негатыўна ўплывае на імунную сістэму і робіць арганізм слабым. Асабліва гэта тычыцца дзяцей, якія вельмі хутка пераграваюцца на сонейку.

Апранайцеся правільна. У спёку адзенне з сінтэтыкі лепш пакінуць у шафе. Яна замінае цеплаабмену і можа выклікаць пагаршэнне самаадчування. Выбірайце свабодную і лёгкую вопратку з натуральных матэрыялаў і светлых тонаў.

Калі сіноптыкі абяцаюць днём +30, а ваш офіс знаходзіцца ў цэнтры горада, можаце смела прыплюсаваць да гэтай тэмпературы яшчэ 4-5 градусаў. Правільна спаталяйце смагу. У гарачыню ў арганізме парушаецца водны баланс. Каб не дапусціць абязвожвання, трэба часцей піць звычайную ваду (можна дадаваць у яе сок лімона), але (гэта важна!) невялікімі порцыямі. Добра спаталяюць смагу натуральныя сокі, зялёны чай (ён рэгулюе цеплаабмен), травяныя напоі, морс, мінералка са шчолачным складам, квас, кефір. А вось ад салодкай газіроўкі, кавы, алкаголю ўрачы раяць адмовіцца. Не пераедайце. Арганізм лягчэй пераносіць гарачыню, калі адмовіцца ад тлустай і цяжкай ежы. Аддайце перавагу гародніне і садавіне, асабліва гуркам, памідорам, кавуну, яблыкам. Не забывайцеся на лёгкія і карысныя гароднінныя супы, асабліва на халаднік, бурачную поліўку. Каб пазбегнуць санлівасці, раніцай ужывайце бялковую ежу, увечары — вугляводную.

Асабліва асцярожнымі ў спякоту варта быць людзям, якія перанеслі інсульт, інфаркт, пакутуюць на артэрыяльную гіпертанію, стэнакардыю і ішымічнае захворванне, на хранічныя хваробы, а таксама — цяжарным, дзецям і людзям сталага веку. Зрэшты, меры перасцярогі не будуць лішнімі нікому. Нават здаровы чалавек пры перагрэве можа памерці ад цеплавога ўдару.

Каб летам не прастудзіцца, належыць асцярожна карыстацца кандыцыянерам. Ён не павінен вісець над ложкам, канапай ці рабочым сталом. Лепшае месца для кандыцыянера — сцяна насупраць за 2-3 метры ад чалавека. Аптымальная тэмпература ахалоджанага паветра — 18-20 градусаў.

Нельга рэзка даваць нырца ў вадаём. Перапад тэмператур здольны справакаваць спазм сасудаў сэрца. Менавіта ён часта становіцца прычынай трагедый на вадзе ў першыя цёплыя дні. Перад воднымі працэдурамі рэкамендуецца астыць у ценю.

Асабліва небяспечная гарачыня ў аўтамабілі. За паўгадзіны пад прамымі сонечнымі промнямі тэмпература паветра ў салоне можа перавысіць 55 градусаў. Не пакідаўце ў машыне дзяцей і хатніх жывёл.

Памяшканне лепш праветрываць не днём, калі тэмпература паветра на вуліцы вышэй, чым у доме, а ўначы. Адкрытае акно можна завесіць мокрай прасцінай.

Па дадзеных Цэнтра кліматычных даследванняў пры Дэлаварскім універсітэце, у ЗША штогод гіне ад спякоты прыкладна 1,5 тысячы гарадскіх жыхароў. У той жа час ад тарнада, землятрусаў, лясных пажараў — не больш за 200 чалавек.

Таццяна БЫЧАНОК,
спецыяліст групы прапаганды і навучання Савецкага РАНС Мінска

Навуковае выданне пра ролю **роду Іллінічаў** у Вялікім Княстве Літоўскім прэзентуюць у час Дня беларускага пісьменства.

(Заканчэнне. Пачатак у № 29.)

Гэтым разам мы завяршаем знаёмства з бостанскім Музычным каледжам Бэрклі ў ЗША, які лічыцца адной з вядучых вышэйшых музычных школ свету. Дапамагае нам сваімі маналогамі наш зямляк — першы з беларусаў навучэнец гэтай установы — Андрэй КАЦІКАЎ. Як і абяцалі, у другой часцы артыкула — пра тэму матывацыі пры навучанні музыцы.

Класы, "лабы", а галоўнае — аналіз

Спецыфіка навучання музыцы за акіянам



Вывучаць музыку "Бітлз" у ЗША прапануюць як праз вылічванне хітоў на ўзроўні партытур, так і занурваючыся ў атмасферу "бітлоў" праз іх улюбёныя... снэкі.

Сяргей ТРАФІЛАЎ

ЗША

Быць Джонам Калтрэйнам

— Атрыманы ў Музычным каледжы Бэрклі досвед па стварэнні хітоў (так, не песень наогул, а менавіта хітоў) і рэкламных ролікаў па пэўных законах крэатыву можа быць скарыстаны і ў беларускіх рэаліях. Тую ці іншую рэч можна зрабіць такой, што яна на месяцы застанецца ў галаве ў спажыўца пэўнай прадукцыі. Якарам (па-англійску такую зачэпку прафесіяналы называюць "хук") можа быць сугучча інструментаў, музычны фрагмент, рыфма. Падобныя веды для таго, хто працуе з гукам, — норма. Урэшце, аснова менавіта ў крэатыве, а не ва ўласна тэхналогіі.

У айчыннай музычнай прасторы такіх зачэпак не надта шмат. Таму і хітоў сапраўдных вобмаль. (Калі прыязджаю дадому пасля семестра, люблю ўключыць радыё і пасумаваць над пачутым айчынным матэрыялам: дагэтуль усё пабудавана на рок-стылістыцы, якую ўжо не аднойчы змянілі больш актуальныя плыні, канцэпцыі, жанры.) А ўсё ад таго, бадай, што творчыя людзі не спяшаюцца выходзіць з замкнутай "скрыні" стэрэатыпаў сваёй сферы дзейнасці. А зараз столькі нестандартных падыходаў у сучаснай музыцы дэманструюць не толькі амерыканцы, але і еўрапейцы, да прыкладу, аўстрыйцы. А той жа Джасцін Цімберлейк з ліку тых артыстаў, што знаходзіцца на вяршыні сусветнага шоу-бізнесу, наогул спяшаецца, спрабуючы апярэдзіць агульную плынь. Вось што варта пераймаць!

Прывяду ў якасці прыкладу аднаго з найвялікшых джазавых саксафаністаў Джона Калтрэйна. Ён аднойчы стаў граць замест стандартных гарманічных паслядоўнасцей такую музыку, што яшчэ гадоў пяць ніхто не мог зразумець, як Калтрэйн тое робіць: лепшыя музыканты свету, калі ён пачынаў граць сола, запіналіся поруч з ім. Ведаеце, я нават браў клас па гармоніі, каб разабрацца ў ягоным феномене выхаду з умоўнай "скрыні". Прафесар, які даваў тыя заняткі, паспрабаваў раскласці сакрэт саксафаніста па палічках. І сістэму, аказваецца, можна спасцігнуць: усе гралі мэйнстрым, а ў Калтрэйна раптам пайшоў жорсткі бі-боп з касмічнымі акордавымі прагрэсіямі. Прафесар паказаў нам, студэнтам, кнігу, дзе разглядаліся тонікі, гармоніі, мадальнасці ў самых розных канцэпцыях: каля 700 варыянтаў ігры таго самага акорда. Аказваецца, па падобных практыкаваннях і кшталтаваў сябе Джон Калтрэйн. Адсюль выснова: калі ты не ведаеш, куды рушыць, паспрабуй адну з гэтых канцэпцый. Па выніках класу канцэпцый сучаснай джазавай гармоніі патрабавалася сачыніць кампазіцыю ў рамках якой танальнасць зменіцца шэсць разоў. Я ніколі не мог падумаць, што такое здольны зрабіць! Але падыход у духу Калтрэйна дапамагаў. Так што найбольш важна ў навучанні атрымліваць веды ў сістэме і без прабелаў, каб усведамляць, у якім "файле" ў сваёй галаве ты знойдзеш патрэбныя звесткі.

Так праходзяць заняткі ў Бэрклі.

Цесная бурбалка для 20 працэнтаў

— Каля 20 працэнтаў выпускнікоў амерыканскіх музычных школ выбіраюць шлях далейшай музычнай адукацыі. У Бэрклі конкурс 12 чалавек на месца. І людзі там цудоўна разумеюць, што знаходзяцца ў адзінай, вельмі цеснай, прафесійнай бурбалцы: канкурэнцыя невераятная! Ты паедзеш пасля сканчэння Каледжа ў Нью-Ёрк? Давай! Але там 20 тысяч музыкантаў, якія ў любую хвіліну гатовы сарвацца на запіс ці на канцэрт, калі ім толькі патэлефануюць з прапановай. Таму даводзіцца амерыканцам найперш граць для свайго задавальнення, і тое мусіць спрацаваць. Навошта быць супервядомым, калі можна быць дастаткова вядомым і мець пэўную аўдыторыю? Трэба заставацца рэалістамі.

У каледжы я абраў клас, дзе выкладчык проста распавядаў пра магчымыя далейшыя шляхі ў прафесіі. Што рабіць, калі скончыш Бэрклі, куды падацца, каму патэлефанаваць, што паспрабаваць… І прыводзіліся прыклады паспяховых выпускнікоў каледжа. А ў якасці выніку класа патрабавалася стварыць уласны сайт-партфоліа (я зрабіў яго для згаданай раней рэкламнай кампаніі, што ўжо стала відавочнай перспектывай на той момант). Ну хіба ж не карысна? Вось гэта той курс псіхалагічнай прафесійнай матывацыі, які, мяркую, стаўся б запатрабаваным любым выпускніком ВНУ сферы культуры і ў Беларусі. Як не паддацца роспачы, калі твае чаканні і рэальнасць працы не супадаюць? Як спусціцца з вышыні сваіх амбіцый на зямлю (у Бэрклі — у тым ліку і са мной — гэта, не без дэпрэсій, адбываецца ў 6-7 семестрах навучання)? Пра ўсё тое семінар.

Тонкая справа матывацыі

— Калі ў Бостане ў пятніцу робіць прыпынак нейкі цікавы гурт, то ў клуб, дзе ён "прызямляецца", не праціснуцца. Бо студэнтам цікава паслухаць актуальную музыку, атрымаць гэты досвед у форме канцэрта, калі цікавіць і крэатыўная частка, і, уласна, тэхналогія выканання. Гэта самаматывацыя, якая падмацоўваецца заахвочваннем з боку студэнцкага цэнтра каледжа. Напрыклад, білет у кіно на дваіх для навучэнцаў удвая танней, чым два білеты паасобку. А на канцэрт Бостанскага сімфанічнага аркестра па адмысловай карце студэнта Бэрклі можна хоць штодзень трапляць задарма і ўзяць траіх сяброў. Тое ж тычыцца шэрагу іншых прадстаўленняў. Чаму? Бо ты студэнт музычнага каледжа і табе трэба слухць шмат рознай музыкі. А стартавы кошт білетаў на той жа Бостанскі сімфанічны — каля 50 долараў… Ведаеце, картка тая ў мяне замусолілася ад частаты выкарыстання.

Што да матывацыі, дык нават былым навучэнцам дазволена наведваць майстар-класы для ўласнаналення сваіх ведаў. Скажам, нядаўна запрасілі ў Бэрклі дзядзькаў, што рабілі… гук лазару для "Зорных воінаў". Дык пра тое ж проста цікава паслухаць! А конкурсы з істотнымі ўзнагародамі, калі за суткі табе трэба стварыць музыку для рэкламы! Вось праз падобныя важкія аргументы хачу нават пасля заканчэння каледжа максімальна ўвабраць (пакуль яшчэ буду знаходзіцца ў ЗША) прафесійны досвед. Культура ж — акурат тая рэч, якую можна "вымераць" тым, колькі ты ведаеш. Напрыклад, я даволі хутка развітаўся з дзяўчынай, якая не ведала, хто такія "бітлы".

Дарэчы, пра гэты славуты квартэт! Я запісваўся на клас, у рамках якога разбіраліся партытуры гурта, тое, як выбудаваны іх гармоніі і чаму яны спрацоўваюць. Паводле статыстыкі зусім не скажаш, што "бітлы" проста ваялі хіты: зазірніце ў ноты і пераканайцеся ў адваротным! Але я пра тое, як адбыліся апошнія заняткі, што прыпалі на той час, калі справаздача па "Бітлз" у выглядзе музычнай працы з выкарыстаннем тэхналогій 1960-х была здадзена, а курс яшчэ не скончыўся. Прафесар, вялікая фанатка "бітлоў", прыносіць сапраўды рэдкія фільмы, інтэрв'ю і здымкі каманды, многія з якіх яна сама набывала за шалёныя грошы. А яшчэ выкладчыца прыезда з Лондана нам улюбёныя снэкі "Бітлз", якімі яны хрумсцелі ў час запісу альбомаў! Ну гэта проста суперматывацыя! Хіба ж не?

К

Чытанне з... меха гісторый

Папулярызацыя чытання — асноўны кірунак дзейнасці любой бібліятэкі. І работа з дзецьмі тут мае выключную важнасць. З той простай прычыны, што кніга развівае фантазію, вучыць разважаць над новай інфармацыяй, думаць самастойна, аналізаваць, рабіць высновы.

ВЯЛІКАБРЫТАНІЯ

Я на ўласным досведзе, як бібліятэкар і як мама, пераканалася, што звычайна навучыць чытаць лягчэй, чым сфарміраваць чытача, абудзіць інтарэс да літаратуры. Таму супрацоўнікі нашай бібліятэкі заўжды знаходзяцца ў пошуку цікавых ідэй па далучэнні дзяцей да чытання.

У дні вясновых вакацый у нашай чытальнай зале стартаваў незвычайны праект. За аснову мы ўзялі ідэю сусветна вядомага брытанскага нацыянальнага літаратурнага праекта "Сторысек", адзначанага еўрапейскімі ўзнагародамі. Ён быў распрацаваны ў Вялікабрытаніі ў 1994 годзе Нэйлам Грыфітсам, доктарам філалогіі, аўтарам кніг па метадалогіі навучання дзяцей у дашкольным і школьным узросце. Спадар Грыфітс лічыць, што спачатку трэба вырашыць пытанне "як дадамагчы дзіцяці стаць чытачом?", а потым — "як навучыць яго чытаць?".

У перакладзе з англійскай мовы "сторысек" азначае мех гісторый. Гэта комплекс узаемазвязаных і ўзаемадапаўняльных матэрыялаў, скіраваных на ўсебаковае развіццё дзяцей ва ўзросце ад трох да адзінаццаці гадоў. Галоўны кампанент "Меха…" — мастацкая кніга, з чыёй дапамогай (як і кампанентаў, што ёй спадарожнічаюць (мяккія цацкі, навукова-папулярная кніга, дыск, моўная гульня)), выхоўваецца любоў да чытання, развіваюцца літаратурныя, сацыяльныя і камунікатыўныя навыкі.

Адкуль я даведалася пра "Сторысек"? Дзякуючы курсам павышэння кваліфікацыі ў Інстытуце культуры Беларусі, на якіх пачула ад педагогаў пра інавацыйныя формы працы. Прыехала дамоў і прапанавала калегам паспрабаваць укараніць гэта ў сваю дзейнасць. Цягам апошняга часу бачу, што недарэмна мы ўзяліся за цікавы праект. У сваёй практыцы імкнёмся да ажыццяўлення мэт "Сторысека": разнаўзроўневы і рознабаковы падыход да кнігі, атрыманне задавальнення ад самой кнігі і ад сумеснага чытання ўголас. Прытрымліваемся таксама задач "Сторысека": папулярызацыя добрых кніг, папаўненне і пашырэнне слоўнікавага запасу юных чытачоў, развіццё ў іх навыкаў асэнсаванага чытання, абмеркаванні мастацкага твора, развіццё сацыяльных навыкаў, упэўненасці у сабе і кругагляду, стымуляванне інтарэсу да кнігі.

Што ж гэта за "Мех гісторый" такі? Што ў ім? Гэта сапраўдны палатняны мех, дзе знаходзіцца добрая мастацкая ілюстраваная дзіцячая кніга. Цацкі і дадатковы рэквізіт "ажыўляюць" кнігу, развіваюць слоўнікавы запас, разуменне прачытанага, дапамагаюць разабрацца ў вобразах галоўных літаратурных герояў. А цацкі — гэта і ёсць гэтыя героі. Рэквізітам жа могуць стаць побытавыя прадметы, розны рыштунак, пра які распавядае пэўнае выданне.

Спачатку дзеці знаёмяцца з самім кірункам "Сторысек", праглядаюць відэаролік пра кнігу, потым уважліва слухаюць бібліятэкара, які яе чытае. Затым пачынаецца абмеркаванне пачутага, назвы выдання, яго вокладкі. Дзеці пад кіраўніцтвам бібліятэкара выказваюць свае меркаванні. Бібліятэкар дэманструе кнігі і часопісы, з якіх можна папоўніць свае веды пра матэрыял.

Ад сябе я дадала ў праект інсцэніроўку, дзе хлопчыкі і дзяўчынкі павінны абыграць які-небудзь эпізод з кнігі. І, як правіла, заўжды стае ахвотных паўдзельнічаць у міні-спектаклі. Дзеці атрымліваюць вялікае задавальненне ад пачутага і ўбачанага. А мне вельмі прыемна, калі пасля мерапрыемства яны бяруць кнігі з "Меха гісторый" дахаты.

Наталля ЛАЎРОВІЧ,
бібліятэкар Гарадской дзіцячай бібліятэкі-філіяла № 8 г. Мазыра

5 верасня мястэчка Ракаў, што на Валожыншчыне, адзначыць сваё **550-годдзе** вялікай культурнай праграмай.

Жыў-быў дойлід...

“Ісці як вада — чалавеку не да твару”



Анатоль Кудзіненка падчас адной з італьянскіх вандровак.

Сустракаюцца ў жыцці людзі, пра якіх назаўсёды застаюцца светлыя згадкі, таму што жылі яны шчыра і адкрыта, з дабром і разуменнем ставіліся да ўсіх, хто быў побач, сумленна і з душой рабілі любімую справу, даючы магчымасць вырастаць свайму таленту і тым самым паказваючы добры прыклад вучням. Такім адметным чалавекам быў вядомы беларускі дойлід, педагог, акадэмік Беларускай акадэміі архітэктуры, прафесар Брэсцкага дзяржаўнага тэхнічнага універсітэта, член Саюза архітэктараў Беларусі, аўтар шматлікіх артыкулаў і шэрагу дапаможнікаў і падручнікаў па забудове і планіроўцы селішчаў Анатоль Кудзіненка.

У 1970 годзе я прыйшла на працу ў архітэктурна-планіровачны аддзел Брэсцкага філіяла інстытута “Белдзяржпраект”, у якім на той час налічвалася паўсотні архітэктараў, інжынераў і тэхнікаў па праектаванні забудовы горада, інжынерных камунікацый, добраўпарадкаванні і азеляненні. Усе спецыялісты размяшчаліся ў двух прасторных пакоях за кульманамі і сталамі, на якіх мацаваліся вялізныя, як прасціны, чарцяжы. Аддзел узначальваў таленавіты архітэктар Анатоль Кудзіненка. Было яму на той час 30 гадоў. Разумны, усмешлівы, дасціпны, думаю, што ён шмат каму падабаўся з ягоных равесніц. Прынамсі, мая каляжанка Галіна Палякова, пазіраючы ўслед яму, часам загадкава жмурылася і з захапленнем прамаўляла:

“Кудзіяр-р-р!..”

Згадваю памяшканне аддзела, дзе засяроджаны Віктар Селівонец чараваў каля макета мікрараёна з паперы і кардону. Група архітэктараў на чале з Канстанцінам Кожычам праектавала будучыя кварталы. Інжынер Віктар Мазураў з падначаленымі займаўся дарогамі, праездамі і тратуарамі. Азеляняльнікі Таццяна Чаканоўская і Вольга Рагуліна круцілі цыркулямі кружочкі, якія некалі павінны былі стаць дрэвамі. Паўнаваты і акуратны чарцёжнік Мікалай Чаранкоў, якому ледзь пераваліла за 60 (па тых маіх уяўленнях — вельмі стары), быў кранальна ўважлівы да жонкі. Усе пацяшаліся з таго, як ён кожны раз перад абедам тэлефанаваў ёй і папярэджваў: “Ніначка, я іду!..”

Прамінула ледзь не паўсотні гадоў, шмат каго з маіх былых калег ужо няма на свеце, а яны застаюцца жыць у маёй памяці, і той час згадваецца мне шчаслівым і радасным, як нязводнае і незабыўнае свята, мо таму, што я тады была юная, а яшчэ таму, што людзі былі ўважлівыя і душэўныя. Безумоўна, атмасфера зычлівасці і разумення сыходзіла ад начальніка аддзела, ад Анатоля Дзмітрыевіча. Быў ён не проста таленавіты, а добры і спагадлівы, хоць вельмі заняты (па вечарах займаўся і выкладчыцкай дзейнасцю), умеў па-добраму пажартаваць, не цураўся выпіць фужэр віна, калі ўсім аддзелам адзначалі чыйсьці дзень нараджэння. Ужо тады ў характары Анатоля Дзмітрыевіча заўважаліся задаткі педагога. Памятаю, як аднаму маладому архітэктару ў прафесійнай спрэчцы ён сказаў: “Ты ідзеш, як вада, па шляху найменшага супраціўлення. Чалавеку гэта не да твару…” На ўсё жыццё запомніўся выраз “шлях найменшага супраціўлення”, які азначаў ляноту і нядбайства.

У адну снежную зіму я паехала наведаць бацькоў у Белаазёрск. Дарогу перамяло, два дні не хадзілі рэйсавыя аўтобусы, немагчыма было выехаць у Брэст. Патэлефанавала Анатолю Дзмітрыевічу і распавяла пра гэтыя варункі. Ён дазволіў мне затрымацца без усякіх заяў, а тым больш без спагнанняў.

У той час архітэктурна-планіровачны аддзел займаўся праектаваннем Усходняга жылога раёна ў Брэсце, дзе акрамя жылых дамоў, меркавалася пабудаваць грамадскі цэнтр на скрыжаванні вуліцы Маскоўскай і Партызанскага праспекта, які складаўся з Дома культуры прафсаюзаў і адміністрацыйнага будынка Маскоўскага раёна. Упершыню ў горадзе былі запраектаваны некалькі 16-павярховых будынкаў вежавага тыпу. У 1971 годзе пачалася канчатковая карэкціроўка дэталёвай планіроўкі Усходняга жылога раёна пад кіраўніцтвам Кудзіненкі. Цяпер гэты раён забудаваны і лічыцца прэстыжным. Анатоль Дзмітрыевіч жа таксама браў удзел у стварэнні праектаў забудовы Камянца, Драгічына, генплана Калінкавіч, мікрараёна ў Пінску, турбазы на Белым возеры у Брэсцкай вобласці, спарткомплексу ў Баранавічах і Кобрыне...

Акварэль пэндзля Анатоля Кудзіненкі з гарадскім краявідам Італіі.

Праект забудовы ўздоўж набярэжнай у Брэсце .

Зінаіда ДУДЗЮК,
пісьменніца

ТЭКСТ

Нядаўна мне прыснілася, што я падпісвала новы праект у былога начальніка. Ён паставіў на хаду кароткі подпіс:

“Кудзя”,

бо, як заўсёды, некуды спяшаўся. Так з любоўю за вочы звычайна і называлі яго супрацоўнікі: “наш Кудзя”. Пасля, калі, абдумваючы той сон, вырашыла напісаць гэты артыкул, аказалася: мне мала што вядома. Знайшла звесткі ў Інтэрнэце. Анатоль Кудзіненка нарадзіўся 23 студзеня 1940 года на Гомельшчыне. У 1963 годзе скончыў Беларускі політэхнічны інстытут, паступіў у аспірантуру, абараніўся ў 1972 годзе, працаваў у праектным бюро ў Гомелі, з 1965 года — у Інстытуце будаўніцтва і архітэктуры Дзяржбуда БССР, у 1967-м быў запрошаны ў брэсцкі філіял інстытута “Белдзяржпраект”. У 1973 годзе ўзначаліў кафедру архітэктурнага праектавання і малюнка Брэсцкага інжынерна-будаўнічага інстытута, а пасля быў там жа прафесарам. Памёр 14 снежня 2010 года.

Былы выкладчык Беларускага політэхнічнага інстытута Уладзімір Кулін ведаў Кудзіненку з гадоў вучобы як здольнага і актыўнага студэнта, які быў сярод першых не толькі ў спасціжэнні навукі, але і ў гульні ў футбол. Ва ўспамінах, прымеркаваных да гадавіны памяці вучня, ён пісаў: “Я часта маляваў з яго віхрастыя сяброўскія шаржы, а таксама акварэльныя партрэты і нарэшце сабраўся напісаць алеем. У пятніцу, год таму, я папрасіў Анатоля Дзмітрыевіча прыйсці да мяне ў суботу або ў нядзелю. А ён не прыйшоў. Я не мог падумаць, што яго ўжо няма на свеце, што ён раптоўна памёр… Пасля пісаў ягоны партрэт на адзіноце з незвычайнай тугою. Вобраз Анатоля Дзмітрыевіча я стварыў з сумнай усмешкай: быццам ён развітваецца з намі. Увогуле, жыў-быў дойлід, мастак і педагог, светлая яму памяць…”

У інтэрв’ю, узятым студэнткай Вольгай Нікітчык да 65-годдзя Анатоля Кудзіненкі, на пытанне пра прафесійную кар’еру ён расказаў: “У прынцыпе, і не хацеў быць архітэктарам, а марыў стаць мастаком, таму што добра маляваў. Збіраўся паступаць у мастацкі інстытут, але ў мяне былі строгія бацькі. Яны казалі, што мастакі — гэта багема. Параілі паступаць на архітэктуру — я і пайшоў. Паехаў у Мінск з драўляным чамаданчыкам і паступіў. Скончыў Беларускі політэхнічны інстытут. Вучыўся ў вядомага прафесара Аляксандра Пятровіча Войнава [...] ”.

Пра студэнцкія гады згадваў з захапленнем: “Ездзілі на цаліну збіраць ураджай. Мы там цэлае лета былі, усе тры месяцы. І грошай тады зарабілі кучу. Надоўга хапіла. Вучыцца было цікава. У час канікулаў аб’ездзілі увесь Савецкі Саюз. [...] Адзінае, чаго ў нас не было, — гэта замежжа. У Ленінградзе была абмерачная практыка, у Маскве — пераддыпломная. Мы былі больш самастойныя, чым цяперашнія студэнты. Дарэчы, цяпер думаюць больш пра грошы. А мы раней думалі пра будучую прафесію, былі вялікія фантазёры, захопленыя рамантыкі, а цяпер пераважаюць прагматыкі.”

Пазней, калі Анатоль Дзмітрыевіч сам працаваў выкладчыкам, таксама вазіў групы студэнтаў на практыку. У адзін з такіх гуртоў трапіў мой сын. Я адпусціла яго ў Польшчу без ваганняў з упэўненасцю, што ўсё будзе добра. Студэнты любілі свайго прафесара. Ці шмат каму з выкладчыкаў вучні прысвячаюць вершы? Яму прысвячалі…

Кудзіненка працягваў займацца праектаваннем, ведаю, што браў удзел слынны архітэктар у стварэнні праектаў храмавых пабудоў на Брэстчыне, жылых будынкаў у Шклове і Барані.

У 1986 годзе я была прынятая ў Саюз пісьменнікаў і ўпершыню прыехала на з’езд у Мінск. Увечары пасля пасяджэння нечакана на галоўным праспекце сталіцы сустрэла Анатоля Кудзіненку. Ён пацікавіўся, чаму я тут? Я растлумачыла, але ён ніяк не мог зразумець, якое дачыненне я маю да пісьменніцкай арганізацыі. Я ніколі не афішавала сваё захапленне паэзіяй, таму ніхто з калег не ведаў пра гэты мой, можна сказаць, падпольны занятак. Анатоль Дзмітрыевіч паскардзіўся, што згубіў кашалёк, і папрасіў пазычыць грошай на дарогу. Чалавек ён быў творчы і захоплены, таму не дзіўна, што ў побытавым плане іншы раз — няўважлівы.

На працягу ўсяго жыцця

Кудзіненка

захаваў захапленне жывапісам і цягу да вандровак. Калі адкрылася магчымасць пабыць за мяжой, турыстам наведаў Францыю, Германію, Італію і іншыя краіны. З усіх паездак прывозіў мноства здымкаў і малюнкаў. З артыкула былой супрацоўніцы Брэсцкага тэхнічнага ўніверсітэта Таццяны Шульгі даведалася пра адну з выставак яго акварэльных малюнкаў на кафедры архітэктурнага праектавання: “На акварэльных малюнках бестурботна гуляюць майскія промні ў венецыянскіх вулачках-каналах; хаваюцца ад чэрвеньскай спякоты ў цяньку дрэў беленькія украінскія мазанкі; шматколерны заход сонца адсвечваецца на гуллівых хвалях Сожа. Прыцягваюць яскравасцю парыжскія замалёўкі Манмартра…” Далей у артыкуле паведамлялася, што Анатоль Дзмітрыевіч згадаў кур’ёзны выпадак, які здарыўся з ім у Парыжы: “Там, аказваецца, мастакі купляюць месцы для пленэраў. І, калі я размясціўся на плошчы Манмартра, каб замаляваць пейзаж, які мне спадабаўся, мастакі пачалі мяне праганяць. Але пасля, калі даведаліся, што я з Беларусі, дазволілі маляваць без платы і ўсё прыгаворвалі: “Русіко, русіко…”

Анатоль Кудзіненка раздорваў свае малюнкі сябрам і калегам. Адзін з ягоных супрацоўнікаў сфатаграфаваў усе акварэлі Кудзіненкі, якія захоўваліся ў прыватных калекцыях, цяпер іх можна ўбачыць у Інтэрнэце.

Ведаю, што ў Анатоля Дзмітрыевіча — двое дзяцей: старэйшая дачка і сын, які нарадзіўся ў пачатку 1970-х гадоў. Прамінула шмат гадоў. Я змяніла прафесію. Працавала ў брэсцкай абласной газеце “Народная трыбуна” , і раптам аднойчы мяне знайшоў там Кудзіненка з сынам Андрэем, знешне трохі падобным да бацькі — з такімі ж непаслухмянымі валасамі. Прыйшлі яны параіцца наконт будучай прафесіі маладога чалавека, які скончыў вышэйшую навучальную тэхнічную установу у Кіеве, але набытая прафесія яго не задавальняла. Ён захапляўся паэзіяй, а яшчэ яму хацелася б здымаць кіно. Я папярэдзіла, што паэзія не дае прыбыткаў, акрамя радасці для душы. Паэту абавязкова мець працу, каб забяспечыць сябе сродкамі для існавання. Бацька і сын выслухалі мяне і пайшлі. Мусіць, пасля зрабілі правільны выбар, бо цяпер мы ведаем таленавітага кінарэжысёра Андрэя Кудзіненку.

■■■

Сёлета, каб Анатоль Дзмітрыевіч быў жывы, адзначыў бы юбілей — 75-годдзе з дня нараджэння… Але добрыя справы не паміраюць разам з людзьмі, а застаюцца жыць у памяці сучаснікаў, у выніках дзейнасці вучняў, а іх у Анатоля Кудзіненкі было шмат, яны вылучаліся ўласным меркаваннем, асаблівай хадой думак у падыходзе да праблемы, прывітымі настаўнікам. Яго выхаванцамі былі такія вядомыя архітэктары, як Віктар Арсеньеў (Санкт-Пецярбург), Аляксандр Асадаў (Масква), Барыс Лядзенка (галоўны архітэктар Смаленска), у Брэсце паспяхова і творча працуюць Аляксей Андраюк, Валер Кяскевіч, Алег Ляшук, Валянцін Гапіенка, Міхаіл Гайдуковіч... На факультэце ён стварыў усе ўмовы для свабоды мыслення, бо быў перакананы: незалежнасць — аснова светапогляду творцы, у тым ліку і архітэктара.

Хочацца замацаваць памяць пра гэтага таленавітага і светлага чалавека, які пакінуў пасля сябе гарады, забудаваныя па ягоных праектах. Пажадана, каб у Брэсце з’явілася вуліца з ягоным імем. Яго калегі і студэнты, думаю, з гонарам хадзілі б па вуліцы Анатоля Дзмітрыевіча і ўсведамлялі, што настаўнік вядзе іх у будучыню.

Выстаўка жывапісу **"Impression / Уражанне"** адкрыецца 21 жніўня ў Музеі Беларускага Палесся ў Пінску.

Праект "Дыярыушы", прымеркаваны да 70-годдзя Беларускай дзяржаўнай акадэміі мастацтваў, засведчыў вельмі важную для нашай нацыянальнай культуры акалічнасць: сёння новае пакаленне прафесіяналаў сферы рыхтуюць тыя, хто атрымаў прафесійную адукацыю ў Беларусі. А праз гэта забяспечваюцца пераемнасць традыцый і паступовасць развіцця. Гэта, калі хочаце, чыннік культурнай самадастатковасці нацыі. Хтосьці можа спытаць, а што тут асаблівага? Гэта ж натуральна, так і павінна быць! Пажадана, каб так было, але здараецца названае не заўжды і не паўсюль. Доўгі час з аб'ектыўных прычын "па вялікую навуку" беларускім мастакам даводзілася ехаць у Маскву і Ленінград. А да станаўлення, напрыклад, дэкаратыўна-прыкладнога мастацтва ў Беларускім тэатральна-мастацкім (так тады называлася Акадэмія) спрычыніліся адмыслоўцы са Львова. Я ўжо не кажу пра падрыхтоўку спецыялістаў экранных мастацтваў, чыя alma mater была адна на ўвесь Савецкі Саюз і знаходзілася ў ягонай сталіцы. Сёння ж, бадай, усе значныя асобы ва ўсіх галінах беларускага мастацтва — выхаванцы нашай Акадэміі. Гэта выдатнае дасягненне. А "Дыярыушы" (куратары — студэнты-мастацтвазнаўцы кафедры гісторыі і тэорыі мастацтваў БДАМ) — успаміны тых, хто вучыўся ў БДАМ / БДТМІ. Гэта прыватныя лёсы ў кантэксце вялікай з'явы. Да гэтых успамінаў, сабраных студэнтамі-мастацтвазнаўцамі Акадэміі, навучэнцы творчых спецыяльнасцей адмыслова стварылі свае работы. І цягам некалькіх нумароў "К" пазнаёміць з яскравымі фрагментамі "Дыярыушаў".

Кацярына Крыштопік. "Час і памяць".

З "Дыярыушаў" Акадэміі...

Дар'я Раманенка. Дытых "Мара ў позірку".

У апошнім інтэрв'ю Эльвіры Герасімовіч — пра першы выпуск Тэатральнага інстытута і паняцце адданасці

Эльвіра ГЕРАСІМОВІЧ
тэатразнаўца,
выпускніца Беларускага тэатральнага інстытута 1949 года па спецыяльнасці "акцёр драматычнага тэатра";
рэктар Беларускага дзяржаўнага тэатральна-мастацкага інстытута ў 1968 — 1984 гадах;
прафесар-кансультант кафедры гісторыі і тэорыі мастацтваў, кандыдат мастацтвазнаўства, прафесар, заслужаны дзеяч мастацтваў Беларусі.
Эльвіры Пятроўны не стала 22 ліпеня 2015 года. Перад вамі яе апошняе інтэрв'ю.

— Эльвіра Пятроўна, з якім пахам у вас асацыюецца Акадэмія?

— Акадэмія і пах — гэта цікавае пытанне. Значыць так: калі ў галоўным корпусе направа пойдзеш, то змяшаны пах касметыкі — факультэт тэатральны (там студэнткі, яны амаль усе карыстаюцца парфумай). А калі налева пойдзеш, то пах фарбаў — ні з кім не зблытаеш: мастакі.

— А з якім колерам?

— Направа — нешта актыўнае, але не вельмі яркае, а налева — мяккія тоны.

— Эльвіра Пятроўна, Вы кажаце "злева" ды "справа". Гэта былі калідоры?

— Так, два крыла. Справа — Тэатральны факультэт, а злева — Мастацкі. Таму мне адразу ўспамінаюцца гукі: справа — шум, а злева — цішыня.

— Якая геаметрычная фігура прыходзіць на розум першай пры згадванні Акадэміі?

— Трохкутнік. Бадай, і тэатралы, і мастакі — трохкутнікі. Чаму? Таму што шмат кутоў загадак і ў першых, і ў другіх. Не знойдзеш падыходу — паколішся.

— Ці паўплывала навучанне ў Акадэміі на ваша жыццё па-за яе сценамі?

— Безумоўна. Па-першае, я атрымала ўлюбёную спецыяльнасць. Сталася так, што тэатральная педагогіка зацямніла ўсе астатнія бакі тэатральнага мастацтва. Маё далейшае жыццё было аддадзена ў першую чаргу тэатральнай педагогіцы, а потым ужо — даследаванням ды навуцы. Я была рэктарам 16 гадоў, але ніколі не пакідала педагагічную працу. Майстэрства акцёра не пакідала ніколі.

— Якая найярчэйшая падзея звязана з Акадэміяй?

— Дзень Перамогі. Тым больш ён супаў з годам паступлення ў інстытут. Для мяне гэта было нечакана: я была студэнткай педагагічнага інстытута французскага аддзялення.

— А чым займаліся б, каб не вучыліся у Акадэміі?

— Медыцынай. Гэта я адразу магу сказаць.

— Што вы найбольш любіце ў сваёй працы?

— Студэнтаў. І тэатр. Тэатр, як магчымасць перанесці на сцэну думкі і вобразы самых любімых маіх пісьменнікаў і драматургаў. Антон Чэхаў, Іван Тургенеў, асобныя п'есы Максіма Горкага... Шмат беларускай літаратуры я старалася пакласці на сцэнарную мову, і творы агучвалі на радыё, на тэлебачанні.

— Ці складана было вучыцца адразу пасля Вялікай Айчыннай вайны?

— Не. Хлеб быў, бульба была, бо яе саджалі ўсюды, дзе можна было пасадзіць. Зялёная цыбуля была, калі не мелі сваёй — знаходзілі. Гэта галоўная ежа. Сланечнікавы алей быў. Акрамя таго, мы чамусьці сістэматычна атрымлівалі ад прафсаюзаў талоны на галёшы. Тое, што тады ўсе хадзілі ў галёшах, — гэта вядома, але мы даволі часта атрымлівалі такія талоны. Потым прадавалі іх на таўкучцы. За грошы нешта куплялі. Мы часта елі разам, усім курсам.

— Ці з'яднаны склаўся калектыў?

— Курс у нас быў вельмі дружны. Заўсёды адзін пра аднаго ўсё ведалі, імкнуліся падтрымаць... І потым: цяжка было б вучыцца, каб мы не аказаліся дружнымі. Бо амаль цэлы дзень праводзілі ў інстытуце, а наша дзейнасць вельмі залежная ад партнёра. Дзяліць нам асабліва не было чаго. Вядома, спрачаліся, часам нават сварыліся і не размаўлялі нейкі час. А потым усё пачыналася з пачатку... Вельмі любілі ўсялякія розыгрышы, разыгрывалі нават мінакоў. На вуліцы Янкі Купалы быў драўляны мост, і аднойчы Ілля Львовіч Курган і адна наша студэнтка нібыта пасварыліся, а мы ўгаворвалі, каб яна не скакала з моста ў раку. Разявак назбіралася! Такія рэчы рабілі... У парку Горкага стаяў домік, дзе жыла цётка адной са студэнтак. У цёткі гэтай былі градкі з цыбуляй. Мы аднойчы нешта адзначалі і пайшлі нарваць зеляніны на закуску. І ўсё абарвалі. А ля Опернага тэатра цяпер сквер з вялізнымі дрэвамі... Пасля вайны пасаджаныя. Там і нашы дрэвы ёсць: мы таксама саджалі.

— А што яшчэ запомнілася са студэнцкага жыцця?

— Запомніліся, вядома, дыпломныя спектаклі. Па-першае, нам далі пляцоўку Тэатра імя Янкі Купалы! Былі сапраўдныя афішы, прадаваліся білеты, кветкі потым дарылі... Частку букетаў, праўда, нашыя ж сябры і прыносілі. Ну, а што бывала на спектаклях! На адным — я ніжнюю спадніцу страціла, на іншым — Віця Карпілаў, іграючы сакратара гаркама партыі, рассунуў заднік і выглянуў у залу: думаў, што яшчэ антракт. Мы яму завязалі хустачку, каб не тырчаў віхор ад парыка. Гэта ж сакратар гаркама! І раптам... народ ужо быў у зале. Яшчэ ездзілі на лесанарыхтоўкі, вандравалі з гастролямі. Асабліва, пакуль нас не ўзялі на працу пасля заканчэння інстытута. У гэты летні прамежак нам далі толькі грузавую машыну — вось на ёй мы і ездзілі па ўсёй Беларусі, іграли свае спектаклі.

— Ці заўсёды публіка рэагавала станоўча?

— Ой, публіка — заўсёды! Людзі настолькі згаладаліся па мастацтву, былі задаволены — гэта ж 1949-ы! Усяго чатыры гады прайшло з Дня Перамогі. Які настрой быў у галодных, няшчасных і ў той жа час самых шчаслівых людзей... Узгадваю восень і зіму 1945-га года ў Мінску... Падзей было вельмі шмат: добра памятаю налёты, святломаскіроўку. Не-не, ды і прарвецца які-небудзь... Гэта было яшчэ, калі я вучылася ў педынстытуце. Мы займаліся са спушчанымі шторамі... А потым ўсеагульная радасць: Перамога!

— Ці мелі вы ўлюбёны час дня ў гады навучання?

— Толькі не раніца! Раніцай я любіла паспаць, таму што клаліся мы вельмі позна. А любімы час — гэта дзень і вечар, калі мы ўсе аказваліся разам, калі займаліся. Але не тады, калі сядзелі на лекцыях і глядзелі лектару ў рот: гэтага не любілі, як і цяперашнія студэнты. Я пра акцёрскае майстэрства. І потым, у нас былі шыкоўныя "капуснікі"! У іх дні міліцэйскі нарад стаяў ля інстытута, таму што ўвесь горад жадаў прыйсці. У нас было вельмі цяжкае становішча з памяшканнем. Ды і цяпер цяжка… Праўда, не памятаю такога часу, калі з ім не было б праблем... Хіба што адразу пасля заканчэння рэканструкцыі цяперашняга галоўнага корпуса ў 1977 годзе, ды і то нядоўга: інстытут разрастаўся. А ў тыя далёкія гады, калі толькі адкрыўся Тэатральны інстытут у Мінску, мы займаліся ў будынку Тэатра оперы і балета. Унізе былі буфет і кухня. Калі была вольная зала, мы беглі ў яе, вольная кухня — беглі туды.

Ну і, вядома ж, выезды на бульбу ў верасні запомніліся. Гаспадаркі прымалі нас з задавальненнем, нават спрачаліся з-за таго, куды паедуць нашы. Бо і працавалі добра, і канцэрты давалі. Усё ўмелі!

— А як гэта — "усё ўмець" у вашай прафесіі?

— Трэба быць вельмі назіральным і вельмі па-добраму цікаўным. І любіць людзей. Гэта — самае галоўнае ды самае складанае. І ад іх усё пачэрпваць. Мы ж не нараджаемся геніямі, гэта ўсё размовы. Любіць людзей, уважліва ставіцца адзін да аднаго. І памятаць, што ў жыцці за ўсё трэба плаціць. Атрымаў добрае — зрабі добрае.

— Каб мелі выбар, чым не займаліся б у Акадэміі?

— Ёсць прадметы, якія можна было б аб'яднаць. Не буду называць якія. А вольныя гадзіны аддала б, каб студэнты чыталі, чыталі, чыталі. Засмучае ў іх, цяперашніх студэнтах, тое, што яны мала або зусім не чытаюць. Прачытаць у арыгінале тых жа Антона Чэхава, Івана Тургенева, Аляксея Пісемскага — гэта ж атрымаць каласальнае задавальненне.

— Ці можаце згадаць паняцце, якое, у цэлым, асацыюецца ў вас з Акадэміяй?

— Адданасць. Тут заўсёды працавалі і працуюць людзі, якія адданыя сваёй справе. Менавіта гэта дапамагае Акадэміі выжываць і не толькі існаваць, але і развівацца. Многія нашы выпускнікі розных гадоў выдатна працуюць сёння ў Акадэміі, нягледзячы на тое, што зарабляючы сваёй творчай працай, могуць выдатна пражыць без грошай, якія атрымліваюць у Акадэміі. Але калегі не кідаюць і працягваюць у педагогіцы справу сваіх настаўнікаў. Вось гэтай адданасцю пакаленняў сваёй "alma mater" і моцная наша Акадэмія.

Анастасія ВАСІЛЕВІЧ,
студэнтка І курса спецыяльнасці "Мастацтвазнаўства (тэатратразнаўства)" БДАМ

ф о т а ф а к т

"...Ваяж II"

У Рэспубліканскім тэатры беларускай драматургіі ідуць рэпетыцыі сцэнічных замалёвак "Тэатральны ваяж II". Пастаноўка створана пры падтрымцы Міжнароднага грамадскага аб'яднання "Театро" (Беларусь), французскай тэатральнай асацыяцыі "Demain le Printemps" (Францыя), РТБД і выкладчыкаў Беларускай дзяржаўнай акадэміі мастацтваў. 27 і 28 жніўня гледачы пабачаць вакальныя, пластычныя, акрабатычныя, танцавальныя і драматычныя нумары ў выкананні акцёраў з Еўропы.

МУЗЕІ

НАЦЫЯНАЛЬНЫ МАСТАЦКІ МУЗЕЙ РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ

г. Мінск, вул. Леніна, 20. Тэл.: 327 45 62.

Экспазіцыі:

■ "Мастацтва Беларусі XII — XVIII стст.".

■ "Мастацтва Беларусі XIX — пач. XXI стст.".

■ "Мастацтва Беларусі XX — пач. XXI стст.". (У рамках экспазіцыі адкрылася выстаўка **"Вялікая Айчынная вайна ў мастацтве"**, прысвечаная 70-годдзю Вялікай Перамогі, — да 2 лістапада.)

■ "Мастацтва Расіі XVIII — пач. XX стст.".

■ "Мастацтва краін Заходняй і Цэнтральнай Еўропы XVI — XX стст.".

■ Рээкспазіцыя залы беларускага мастацтва 1940 — 1980-х гадоў **"Вайна і Перамога ў творчасці мастакоў XX стагоддзя"** .

Выстаўкі:

■ Выстаўка твораў заслужанага дзеяча мастацтваў Беларусі, удзельніка Вялікай Айчыннай вайны Івана Сталярова**"Настаўнік і навучэнцы"** — да 10 жніўня.

■ Выстаўка **"Беларускі іканастас"** (творы іканапісу і драўлянай пластыкі кан. XVIII — пач. XIX стст. са збору Нацыянальнага мастацкага музея Рэспублікі Беларусь і Музея старажытнабеларускай культуры Цэнтра даследванняў беларускай культуры, мовы і літаратуры Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі) — да 27 верасня.

■ Выстаўка **"Муж, мужчына, воін"** (іканапіс кан. XVIII — пач. XIX стст. са збору Веткаўскага музея стараабрадніцтва і беларускіх традыцый ім. Ф.Р. Шклярава) — да 27 верасня.

■ Персанальная выстаўка Ашота Хачатрана **"Вандроўка па арт-прасторы Ашота Хачатрана"** (Санкт-Пецярбург) — да 7 верасня.

Арт-кафэ:

■ Персанальная выстаўка Наталлі Марчанка **"Мой кветкавы каляндар"** — да 24 жніўня.

Філіялы Нацыянальнага мастацкага музея Рэспублікі Беларусь

МУЗЕЙ "ДОМ ВАНЬКОВІЧАЎ. КУЛЬТУРА І МАСТАЦТВА І-й ПАЛОВЫ XIX ст."

г. Мінск, вул. Інтэрнацыянальная, 33а. Тэл.: 327 88 78.

Пастаянныя экспазіцыі:

■ "Інтэр'еры шляхецкай сядзібы".

■ "Жыццё і творчасць Валенція Ваньковіча".

■ "Сядзібны партрэт XVII — сяр. XIX стст.".

Выстаўка:

■ **"Прарок свайго часу. Адам Міцкевіч. Ілюстрацыі і медалі"** — да 25 снежня.

МУЗЕЙ БЕЛАРУСКАГА НАРОДНАГА МАСТАЦТВА Ў В. РАЎБІЧЫ

Спарткомплекс "Раўбічы", Мінскі раён. Тэл.: 507 44 69.

■ Пастаянная экспазіцыя.

■ Выстаўка **"Барока ў карнавой пластыцы"** — да 20 верасня.

НАЦЫЯНАЛЬНЫ ГІСТАРЫЧНЫ МУЗЕЙ РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ

г. Мінск, вул. К.Маркса, 12. Тэл.: 226 09 22.

Экспазіцыі:

■ "Старажытная Беларусь".

■ "Беларусь XVI — XVIII стст. у партрэтах і геральдыцы".

■ "Банк БелВЭБ: новае жыццё нацыянальных скарбаў".

■ "Мастацтва ў гарадской культуры. XIX — XX стст.".

Выстаўкі:

■ Выстаўка **"Тры аповеды пра вайну"** да 70-годдзя Вялікай Перамогі (франтавыя малюнкі Васіля Маркава з калекцыі Генадзя Кавецкага; фатаграфіі (1941 — 1945 гг.) Аляксандра Дзітлава з фондаў музея; праект "Дзяўчыны Перамогі") — да 6 верасня.

■ Сумесная выстаўка Нацыянальнага гістарычнага музея Рэспублікі Беларусь і Дзяржаўнага музея гісторыі Санкт-Пецярбурга **"70-годдзю Вялікай Перамогі прысвячаецца"** — да 6 верасня.

■ Выстаўка **"Ад крыналінаў і турнюраў да мадэрна. Гісторыя моды пачатку XX стагоддзя"** — да 6 верасня.

■ Выставачны праект **"Вялікая прэзентацыя музейных рэліквій: 79 прыступак углыб гісторыі"** — да 31 снежня.

■ Арт-праект фотамастака Ірэны Гудзіеўскай і агенцтва мадэляў "Студыя Тамара" — **"Зачараванне"** — з 13 жніўня.

Філіялы Нацыянальнага гістарычнага музея Рэспублікі Беларусь

ДОМ-МУЗЕЙ І З'ЕЗДА РСДРП

г. Мінск, пр-т Незалежнасці, 31а. Тэл.: 290 68 47.

Экспазіцыя:

■ "Мінск губернскі ў канцы XIX — на пачатку XX стст.".

■ "І З'езд РСДРП у асобах".

■ "Жандарскі вышук у царскай Расіі".

■ "Гісторыя Дома-музея І З'езда РСДРП".

Выстаўкі:

■ Выстаўка работ Е.І. Канстанцінавай **"Другое жыццё кветак"** — да 10 верасня.

■ Выстаўка гісторыка моды Вольгі Палітыка **"Вальс Салле"** — да 10 верасня.

МУЗЕЙ СУЧАСНАЙ БЕЛАРУСКАЙ ДЗЯРЖАЎНАСЦІ

г. Мінск, вул. К.Маркса, 38. Тэл.: 327 46 12.

■ Пастаянная экспазіцыя.

■ Выстаўка **"Мемарыялізацыя Вялікай Айчыннай вайны ў беларускім грамадстве: памяць учора і сёння"**.

МУЗЕЙ ПРЫРОДЫ І ЭКАЛОГІІ РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ

г. Мінск, вул. К.Маркса, 12. Тэл.: 237 46 94; 291 99 51.

Экспазіцыі:

■ "Геалогія і палеанталогія".

■ "Сезонныя змены".

■ "Вадаёмы і насельнікі прыбярэжных раслін".

■ "Хвойны тып лесу і насельнікі змяшанага лесу".

■ "Насельнікі ліставога і змяшанага лесу".

■ "Ахоўныя прыродныя ўчасткі, рэдкія віды жывёл".

Выстаўка:

■ Фотавыстаўка Ірэны Гаражанкінай **"Баравікі. Прыгажосць іх фамільная рыса"** — да 28 жніўня.

г. Мінск, вул. М.Багдановіча, 9а. Тэл.: 237 46 94.

■ Выстаўка **"Свет вялікіх папугаяў і пеўчых птушак"** — да 28 жніўня.

МУЗЕЙ ГІСТОРЫІ БЕЛАРУСКАГА КІНО

г. Мінск, вул. Свярдлова, 4. Тэл.: 327 10 75.

Экспазіцыя:

■ "Беларускі кінематограф як нацыянальная каштоўнасць".

Выстаўка:

■ **"Беларускі кінематограф 20-х — 30-х гг. XX стагоддзя ў кінаплакаце"** — да 30 жніўня.

Кінапраграмы:

■ Рэтраспектыва **"Выкшталцоная Гарбо"** — да 31 жніўня.

■ Рэтраспектыва **"Памяці Амара Шарыфа"** — да 29 жніўня.

■ Рэтраспектыва **"Беларуская мультпанарама. 40 год на экране. Частка 18"** — да 31 жніўня.

МУЗЕЙ ГІСТОРЫІ ТЭАТРАЛЬНАЙ І МУЗЫЧНАЙ КУЛЬТУРЫ

г. Мінск, Музычны зав., 5. Тэл.: 220 26 67.

Пастаянныя экспазіцыі:

■ "Вытокі тэатральнай і музычнай культуры на беларускіх землях".

■ "Музычная і тэатральная культура Беларусі ў X — XIX стст.".

■ "Беларуская музычная культура XX ст.".

■ "Тэатральная культура Беларусі XX ст.".

Выстаўка:

■ Выстаўка аднаго спектакля **"Балада пра белую вішню"** — да 1 верасня.

ГАСЦЁЎНЯ УЛАДЗІСЛАВА ГАЛУБКА

г. Мінск, вул. Старавіленская, 14. Тэл.: 286 74 03.

■ Пастаянная экспазіцыя.

Майстар-класы:

■ **Дэкупаж** для творчых дзяцей і падлеткаў ад 5 да 14 гадоў — кожную суботу аб 11-й.

Выстаўка:

■ Выстаўка **"Прыгожыя і знакамітыя (экалогія пачуццёвасці)"** (толькі для дарослых) — да 13 верасня.

БЕЛАРУСКІ ДЗЯРЖАЎНЫ МУЗЕЙ ГІСТОРЫІ ВЯЛІКАЙ АЙЧЫННАЙ ВАЙНЫ

г. Мінск, пр-т Пераможцаў, 8. Тэл: 327 11 66; 203 07 92.

■ Пастаянная экспазіцыя.

■ Выстаўка, прысвечаная юбілею Паветрана-дыстантных войскаў Узброеных сіл СССР і сіл спецаперацый Узброеных Сіл Рэспублікі Беларусь, **"85 год на абароне Айчыны"** — да 23 верасня.

НАЦЫЯНАЛЬНЫ ГІСТОРЫКА-КУЛЬТУРНЫ МУЗЕЙ-ЗАПАВЕДНІК "НЯСВІЖ"

г. Нясвіж, вул. Ленінская, 19. Тэл.: (8–01770) 2 06 60, 2 06 02; + 37529 551 80 51, +37529 190 31 49.

Палацавы ансамбль

■ Пастаянная экспазіцыя.

■ Выстаўка **"Марыя Дарота Радзівіл. Час культурнага адраджэння"** — да 20 верасня.

■ Выстаўка **"Сляды гісторыі"** — да 16 жніўня.

Слуцкая брама

■ Выстаўка **"Археалагічная спадчына Нясвіжа"** — да 30 верасня.

Ратуша

■ Пастаянная экспазіцыя.

ЗАМКАВЫ КОМПЛЕКС "МІР"

г.п. Мір, Карэліцкі раён, Гродзенская вобласць. Тэл.: (8–01596) 2 82 91, (8–01596) 2 82 70.

■ Пастаянная экспазіцыя.

■ Выстаўка **"Партрэты князёў Радзівілаў з калекцыі князя Канстанціна Гагенлоэ"**.

■ Выстаўка **"Баявыя нагалоўі (шлемы) засцерагальнага ўзбраення і харугвы беларускіх зямель XI — XVII стст. (Рэканструкцыя)"** — да 30 верасня.

■ Выстаўка ўзнагарод алімпійскага чэмпіёна Максіма Мірнага **"Мірныя трафеі"** — да 31 кастрычніка.

ДЗЯРЖАЎНЫ ЛІТАРАТУРНА-МЕМАРЫЯЛЬНЫ МУЗЕЙ ЯКУБА КОЛАСА

г. Мінск, вул. Акадэмічная, 5. Тэл.: 294 91 96.

Экспазіцыя:

■ **"Якуб Колас. Жыццё і творчасць"**.

■ Інтэрактыўная гульня **"Таямніцы дома Песняра"**.

■ Тэатралізаваныя экскурсіі па казках, апрацаваных Якубам Коласам для школьнікаў малодшага ўзросту.

■ Музейна-педагагічны праект **"Крочым у школу разам з Коласам"**.

Акцыі:

■ **"Самы лепшы дзень"** (Дзень нараджэння ў музеі).

■ Віншаванне ад музея, фотасесія **"У дзень вяселля — у музей!"** (па папярэдняй дамоўленасці).

■ Музейная творчая майстэрня (майстар-клас па вырабе цацак з салёнага цеста).

Выстаўка:

■ Выстаўка да 70-годдзя Вялікай Перамогі **"Дарогамі вайны"**.

■ Выстаўка да **100-годдзя** правядзення Міжнароднага кангрэса пісьменнікаў у абарону культуры.

ДЗЯРЖАЎНЫ ЛІТАРАТУРНЫ МУЗЕЙ ЯНКІ КУПАЛЫ

г. Мінск, вул. Янкі Купалы, 4. Тэл.: 327 78 66.

Экспазіцыя:

■ Пастаянная экспазіцыя **"Шляхі"** з праглядам роліка ў 3D-фармаце і інтэрактыўнай зонай для дзяцей **"Хлопчык і лётчык"**, галаграфічным тэатрам.

■ Інтэрактыўныя музейныя праграмы **"У пошуках папараць-кветкі"**, **"Вячоркі"** для ўсіх катэгорый наведвальнікаў.

Выстаўкі:

■ Выстаўка твораў Альберта Цэхановіча **"Далёка"** — да 31 жніўня.

МУЗЕЙ ГІСТОРЫІ ГОРАДА МІНСКА

г. Мінск, ул. Рэвалюцыйная, 10. Тэл.: 321 24 30.

Філіялы Музея гісторыі горада Мінска

МАСТАЦКАЯ ГАЛЕРЭЯ МІХАІЛА САВІЦКАГА

г. Мінск, пл. Свабоды, 15. Тэл.: 321 24 30.

Экспазіцыі:

■ **"Мінск губернскі. Шляхецкі побыт".**

■ **"Мастак. Грамадзянін. Герой".** Прысвечана Герою Беларусі, народнаму мастаку Беларусі, Ганароваму грамадзяніну г. Мінска Міхаілу Савіцкаму.

Выстаўкі:

■ Выстаўка Аліка Замосціна **"Пункт гледжання"** — да 30 жніўня.

■ Выстаўка твораў мастацкай разьбы па шкарлупіне яйка **"Па слядах Фабержэ"** майстра Аляксандра Рыжэўскага — да 28 жніўня.

■ Выстаўка жывапісу чэшскай мастачкі Івы Мразковай **"Нерэальны свет"** — да 30 жніўня.

МІНСКАЯ ГАРАДСКАЯ РАТУША

г. Мінск, пл. Свабоды, 2а. Тэл.: 321 24 30.

Экспазіцыя:

■ **"Мінск у гістарычнай прасторы. Картаграфічны кабінет".**

Выстаўка:

■ Выстаўка **"Gloria Patria"** — дакументы, карты, прадметы хрысціянскага культу з прыватнай калекцыі Ігара Сурмачэўскага — да 20 верасня.

ЭКСПАЗІЦЫЯ "КАРЭТНАЯ"

г. Мінск, вул. Кірылы і Мяфодзія, 18. Тэл.: 321 24 30.

Экспазіцыя:

■ "Сані • вазок; каляска • брычка; карэта • вупраж".

■ Віртуальная гульня **"Карэтны майстар"**.

МУЗЕЙ "ЛОШЫЦКАЯ СЯДЗІБА"

г. Мінск, праезд Чыжэўскіх, 8.

■ Пастаянная экспазіцыя.

ФЛІГЕЛЬ ЛОШЫЦКАГА СЯДЗІБНА-ПАРКАВАГА КОМПЛЕКСУ

г. Мінск, праезд Чыжэўскіх, 10. Тэл.: 285 18 86.

Экспазіцыі:

■ **"Кола часу"** — прадметы гарадской і сялянскай культуры кан. XIX — сяр. XX стст.

■ "Народныя іконы Беларусі 2-й пал. XIX ст.".

АРХЕАЛАГІЧНЫ МУЗЕЙ

г. Мінск, вул. Кірылы і Мяфодзія, 6. Тэл.: 321 24 30.

ГОМЕЛЬСКІ ПАЛАЦАВА-ПАРКАВЫ АНСАМБЛЬ

г. Гомель, пл. Леніна, 4. Тэл.: (8-0232) 74 19 11.

Цэнтральная частка палаца

Экспазіцыі:

■ **"Культавыя прадметы"** ("Дамавая царква", паўночны рызаліт палаца).

■ **"Чырвоная гасцёўня".**

■ **"Зала ўрачыстых прыёмаў"**.

■ "**Адкрытае захаванне археалагічнай калекцыі музея".**

■ **"Старажытная гісторыя Гомельшчыны"** (археалагічная экспазіцыя).

■ **"Свет прыроды"** (выстаўкі "Загадкавыя фантазіі мора" і "Жывёльны свет Гомельшчыны") (грот палаца).

Выстаўкі:

■ Персанальная выстаўка Зоі Луцэвіч **"Водар кахання..."** — да 6 верасня.

■ Выстаўка **"Срэбра са збору Нясвіжскага музея-запаведніка"** (рэчы сталовай аздобы кан. XIX — пач. XX стст.) — да 23 жніўня.

■ Выстаўка **"Лукамор'е"** (чароўны свет казак Аляксандра Пушкіна ў вобразах персанажаў, якія рухаюцца) — да 6 верасня.

■ Выстаўка **"Землестаянне. Эмілія 2012. Культурная спадчына пасля землятрусу"** (аўтарскія фатаздымкі і мультымедыя распавядаюць пра вынікі землятрусу ў рэгіёне Эмілья-Раманья ў Італіі) — да 16 жніўня.

■ Выстаўка матылькоў з прыватнага збору М.Рамазанава **"Лунаючыя кветкі"** — да 13 верасня.

■ Выстаўка **"Памяці мастака".** Жывапіс Аляксандра Гайлевіча — да 6 верасня.

Вежа палаца

Экспазіцыя:

■ **"Уладальнікі Гомельскага маёнтка Румянцавы і Паскевічы"**.

Выстаўкі:

■ **"Кнігі, якія ведаюць усё"** (энцыклапедычныя выданні XIX — XX стст. з аддзела рэдкай кнігі Гомельскай абласной бібліятэкі імя У.І. Леніна) — да 30 жніўня.

■ Мастацка-адукацыйны праект, прысвечаны творчасці гомельскіх мастакоў **"Край родны, назаўжды любімы"** з фондаў Гомельскага палацава-паркавага ансамбля — да 31 снежня.

Паўночнае крыло палаца

Экспазіцыя:

■ **"Свет звяроў Гомельшчыны"**.

Выстаўкі:

■ Куток жывых экзатычных рэптылій.

Зімовы сад

■ Свет субтрапічных раслін і жывёл.

ГОМЕЛЬСКІ АБЛАСНЫ МУЗЕЙ ВАЕННАЙ СЛАВЫ

г. Гомель, вул. Пушкіна, 5. Тэл.: (8-0232) 77 57 41.

■ Пастаянная ваенна-гістарычная экспазіцыя.

■ Пастаянная выстаўка тэхнікі на адкрытай пляцоўцы.

■ На тэрыторыі працуе пнеўматычны цір.

■ **"Музей крыміналістыкі"**.

■ Выстаўка, прысвечаная 70-годдзю заканчэння Другой Сусветнай Вайны, **"На Тихом океане свой закончили поход..."**.

ЛІДСКІ ГІСТОРЫКА-МАСТАЦКІ МУЗЕЙ

г. Ліда, вул. Перамогі, 37а. Тэл.: (8-0154) 53 50 64.

■ Экспазіцыя **"Прырода Лідчыны"**.

Выстаўкі:

■ **"Вядзём пачатак мы ад Гедыміна..."**.

■ **"Крылы над Лідай"** — выстаўка да 100-годдзя Лідскага аэрадрома.

■ Выстаўка **"Старонкі непа100ронняй вайны на Лідчыне"**.

■ Выстаўка **"Гукі цывілізацыі, якая заснула"**.

■ Выстаўка **"Вайны свяшчэнныя старонкі"**.

■ Выстаўка **"З мастацкім словам па жыцці"**.

■ Мемарыяльны пакой **Валянціна Таўлая**.

■ Выстаўка з прыватнага збору А.Фішбайна **"Рэчы побыту канца XIX — пачатку XX стст."**.

■ Музейна-вобразная зала **"Хрушчоўка 60-х"**.

■ Выстаўка **"Музей шакаладу "Nikolya"**.

ГАЛЕРЭІ

ПАЛАЦ МАСТАЦТВА

г. Мінск, вул. Казлова, 3. Тэл./факс: 290 60 10.

■ Юбілейная выстаўка Аляксандра Сільвановіча **"Неба"** — да 18 жніўня.

■ Юбілейная выстаўка Аляксея Пшанко **"Святло. Прастора. Час"** — да 18 жніўня.

"УНІВЕРСІТЭТ КУЛЬТУРЫ"

г. Мінск, пл. Кастрычніцкая, 1. Тэл.: 327 26 12.

■ **Выстаўка традыцыйнага кітайскага жывапісу** з калекцыі Ханьданьскага ўніверсітэта, правінцыі Хэбэй — да 28 жніўня.

УВАГА!
ТУТ МАГЛА Б БЫЦЬ ВАША АФІША!
Звяртайцеся:
+375 17 286 07 97,
+375 17 334 57 41 (факс);
kultura@tut.by